ХРЫСЦІНА ЛЯЛЬКО



ДАРОГА ПАД ГАРУ




Першая
кніга
празаіка

ХРЫСЦІНА
ЛЯЛЬКО



ДАРОГА ПАД ГАРУ

Апавяданні



Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1985

Бел 2
Л 97

Рэцэнзент Яўген Лецка

Кнігу адрэдагаваў на грамадскіх пачатках
Ян Скрыган

Л $\frac{4702120200—131}{М\ 302(05)—85}$ 45—85

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1985.

Няхай шырэе далячынь

Аднаго разу пасля работы выходзіў я з Саюза пісьменнікаў, і ў вестыбюлі, у самых дзвярах, незнаёмая жанчына запыніла мяне такою фразаю:

— А вунь Хрысціна Лялько стаіць.

Папраўдзе, убаку, каля ўсходаў наверх, стараючыся нікому не замінаць, стаяла чарнявая дзяўчына, з цёмнымі, распушчанымі па плячах валасамі. Я ўпершыню бачыў яе, але імя было знаёмае. Больш за год таму назад у газеце «Літаратура і мастацтва» я прачытаў апавяданне Хрысціны Лялько «Груган». Неўзабаве, выступаючы ў той жа газеце з літаратурнымі нататкамі, я зачапіў і «Гругана». Сказаў, што Хрысціне Лялько апавяданне не надта ўдалося ў асноўным па той прычыне, што матэрыял занадта далёкі ад яе дзяцінства — вайна, ёю не бачаны і не перажыты. Але ў ім ёсць нешта такое, да чаго адразу горнецца душа: надзіва натуральная, жывая, простая хатняя мова. Як вядома, у мастацкай літаратуры, дзе галоўным чыннікам успрыняцця з'яўляецца вобраз, веру ў напісанае дае толькі яна. Бо натуральнасць ніколі не дае фальшу. І я, памятаю, сказаў, што, нягледзячы на пэўную яшчэ кволасць пісьма, Хрысціне Лялько трэба пісаць. Абавязкова трэба пісаць, бо з такою моваю маўчаць проста грэшна.

Але яна змоўкла. Глуха. Надоўга. У каго мог, я нават пытаўся — хто яна, дзе робіць, чаму не піша? Прызнаюся, вельмі не хацелася ашукацца ў сваіх спадзяваннях.

І вось яна заявілася. Не ведаю, выпадкова ці знарок — і няйначай як дзеля смеласці ўзяўшы ў памагатыя сяброўку.

Яна сказала, што збіралася паказацца, але не было з чым. І цяпер яшчэ няма з чым, але яна піша. Памятае мой наказ, што маўчаць ёй нельга, і таму трохі пабойваецце — ці выйдзе што людскае з яе. Я сказаў ёй: калі ласка, такі і такі час — заходзьце.

Але яна зноў прапала надоўга. І таму рукапіс прынесла ўжо як бы неспадзявана. Пакінула і пайшла.

Я перш разгарнуў яго, зірнуў, колькі старонак. Шэсць машынапісных. Добра. Апошнім часам у мяне злажылася практыка, што самы, як кажуць, аптымальны памер апавядання павінен мець шэсць-восем старонак. На гэтакай плошчы можна расказаць якраз усё тое, што робіць апавяданне зручным, кампактным, блізкім. Схапіў вокам загаловак: «Лішні». Пачаў чытаць. І вось тут, прызнаюся, здзівіўся незвычайна. Апавяданне было напісана ўпэўнена і строга. Усё ў ім было да ладу, з мераю добрага густу і такту. Шчыльнаць і дакладнасць тэксту. І мова, тая, што мяне адразу падкупіла, натуральная, праўдзівая, толькі ўжо са знакам літаратурнай інтэлігентнасці. І тонкі рысунак вобраза, і свабодная псіхалагічная плынь дзеі. Я прачытаў апавяданне яшчэ і яшчэ раз, дзівячыся, які вялікі патэнцыял мастацкага закладзены ў гэтай аўтаркі. Не было жадання нічога ні папраўляць, ні падказваць. Адно, што, здавалася, патрабуе невялікага павароту, дык гэта назва.

У апавяданні ачалавечана доля сабакі, што адслужыў сваю верную службу. Яго гаспадар, хцівы, плюгавенькі Юзюк, намысліў пазбыцца дакукі. У двор ён прывёў паляўнічага, паміж іх ідзе гаворка, якую чуе і разумее сабака. На яго месца ўжо набыта маладое шчаня. Выпушчанае з будкі, вясёлае, вёрткае, бесклапотнае, яно прыскоквае да старога і пачынае дурэць з ім. У старога не выходзіць з галавы, што гэта яго апошнія хвіліны. Божачка як непамысна ў яго на душы! Як ён ненавідзіць і свайго гаспадара, і чужога чалавека са стрэльбаю, і гэтага шчанюка, якому павінен саступіць. І з апошняе

сілы ўпіваецца ён зубамі ў шчанюка і пачынае душыць.

Мне падумалася, што назва «Лішні» не зусім адпавядае сутнасці. Лішні — гэта вызначэнне лагічнае, чыста аўтарскае, яно аніяк не ідзе ад вобраза. Галоўная ж фігура тут — стары, заслужоны сабака, і апавяданне павінна звацца яго імем.

Яшчэ была адна даволі трапяткая далікатнасць. Перад апавяданнем стаяў эпіграф: «Не все ли равно, про кого говорить? Заслуживает того каждый из живших на земле». З Буніна. Нешта ў мне насцярожвалася проці гэтага эпіграфа. Нечым ён быў лішні, нешта вельмі сакраментальнае падкрэсліваў. Але я не асмеліўся пра гэта сказаць Хрысціне. Памятаў разумныя чужыя думкі, што ўсе мы напачатку трохі падобны на вучняў, што ніхто не вырастае на пустым месцы. А вучыцца мы павінны ўсё жыццё, калі ўжо не чужому, то свайму.

Я пазваніў у часопіс «Беларусь» Веры Вярбе — ці трэба ім добрае апавяданне. Яно там і было надрукавана.

Пасля таго нядоўга часу прайшло, як прынесла Хрысціна на прагляд «Касцоў». Тры чалавекі робяць адну работу, і як жа кожны з іх сам па сабе вырысоўваецца. Адзін — лірык, гэта ўжо відно, як яго душа абзываецца на любы шолах ветрыку, на птушынае гняздзечка ў траве, у якім траха не папалі пад касу птушаняты; другі натуры спакойнай, нават суровай, але колькі годнасці ў яго паставе, у памяркоўнасці да чужых чалавечых учынкаў; і трэці — весялун, сімпатычнік, але як жа скоранька гэтая сімпатычнасць перавернецца на звярыную драпежнасць, калі ён змеціць, што за кустамі, па рове качка вядзе качанят...

Потым прынесла «Лёгкі хлеб», гэтую балесную песню жаночага няспраўджанага кахання. Потым «Цыбу», якую ёй прыйшлося не раз перарабляць, каб вобраз гераіні ўзвысіць да сапраўднай патрыятычнай мужнасці. Нарэшце, «Светлую рунь», якую пісаць было, мабыць, таксама нялёгка, бо ў ёй стыкаюцца сацыяльныя, этычныя

і патрыятычныя пытанні самай трапяткой сучаснасці. Я ўспрымаю гэтае апавяданне як з'яву. Яно хоча, каб мы задумаліся над сваёй зямлёй, над краем, бацькаўшчынаю. Бо Радзіму трэба любіць не толькі па абавязку, а душою, навек...

Хрысціна выбірае тэмы пераважна глыбока чалавечыя. складаныя. Вобразы яе твораў заўсёды напоўнены нутраным, напружаным рухам, таму мы і бачым іх, і перажываем разам з імі.

Ёсць у кнізе, як звычайна бывае ў кожнага, нешта трохі й слабейшае, дык жа дарога толькі пачынаецца. А там, далей, усё будзе шырэйшая і шырэйшая далячынь.

Ян Скрыган

Груган

Аміля ляжала на печы. Сёння зранку выпаліла, бо браліся ўжо халады, і ёй гэту восень нешта дужа балела ў плячах, цягнула на цяпло. Першую восень так гультаіла, нат бульбы свае не капала, занемагла нешта. Дачка з зяцем на выхадныя прыехалі, зачалі сёння і цяпер яшчэ недзе за хатай кешкаюцца, хоць ужо і вечарэе.

А яна ўсё ляжыць. І ляжанне гэта ўжо збрыдла, здаецца, злезла б, пайшла б туды, да іх, маладых, без яе, здавалася, не ўправяцца, бульбу тую не здолеюць выкапаць. Але добра ведала, што сама не зможа там і некалькі разоў нагнуцца, а стаяць так сабе над імі — толькі замінаць. Ды што там гаварыць, можа, каб Гэля, дачка яе, адна была на полі, то і не ўлежала б яна, хоць і так бы пастаяла, хоць словам памагла б. Але зяць там, а яго Аміля старалася бачыць як меней. Не, не тое каб дрэнны ён быў, каб што проці яе, маці, казаў, а не ляжала да яго сэрца — хоць ты што. І свой жа хлопец, здаецца. Тутэйшы. На вачах вырас...

Бацьку яго, Зеню кульгавага, ведала добра. Амаль равеснікамі былі. Яна, праўда, на гады тры, мусіць, маладзейшая, але што там. Як на дзеўку, помніцца, стала выходзіць, да вайны шчэ, дык Зеня яе кавалерам быў. Хто ведае, каб не вайна, можа, і замуж за яго пайшла б... Аміля аж здрыганулася ад гэтай недарэчнай думкі, павярнулася на другі бок — штосьдужа мулка ляжаць было...

Як зачалася калатнеча — прапаў Зеня. Куды і што — не ведалі людзі. Казалі напачатку: «На фронт

пайшоў», а потым пачалі пагаворваць, што ў партызанах ён. У якіх партызанах — ніхто толкам не знаў. Бо шмат каго тады было ў лясах у Заходняй. Адны справу рабілі, а другія так, абы адседзецца, больш бяды чынілі сваім жа вяскоўцам. Туляліся па лясах, як ваўкі, і дзе можна было, там і шкодзілі.

З самага пачатку вайны бадзяліся. І калі ўжо фронт за Нёман адкаціўся, калі немцаў адсюль выбілі, асталіся яны, «партызаны» гэтыя. Усё панскую Польшчу вярнуць хацелі.

Як сёння помніцца ёй. Снег у тую зіму быў глыбокі надта і маразы такія, што птушкі на ляту карчанелі.

Аміля аж цяпер сцепанулася, нібы адчула дыханне зімы тае страшнае.

Аднойчы наехалі на вёску іхнюю, надвечар так, сонца на захад хілілася. Яна ўходжвалася якраз. З падворка ўбачыла, як вырваліся з лесу цугам: сані за санямі. Коні сытыя, аж блішчаць. Храпуць, у снег завальваюцца. І людзі па трое ўсё, па трое, у санях разваліўшыся. У кажухах белых, у шапках-вушанках, зухавата набок ссунутых, з зорачкамі чырвонымі. Ну, чыста байцы рускія. Яна тады неяк адразу і падумала, што рускія гэта, але прыгледзелася — твары зарослыя, страшныя, кулём у хату кінулася, каля акна стаілася. Яны пранесліся ў вёску далей. Ужо ўзрадавалася, што мінула яе ліха, пранесла нячысцікаў. Дзе табе! Тут жа пачула, як у некалькі галасоў на каня затпрукалі. На яе падворку спыніліся. Яна ад акна да печы махнулася, сцялася. Моцна грукаючы ботамі, заінелыя, у снезе, як лесавікі тыя, у хату ўтрох ваваліліся. Усе куты абгледзелі, на гару па драбіне злазілі, батарэйкамі пасвяцілі. Ёй тады адразу цюкнула: засады баяцца. Недалёчка, на кургане, у казарме, часць савецкая стаяла, салдаты сяды-тады ў вёску наведваліся. Яшчэ калі фронт тут праходзіў, часць гэта пры-

пынілася. Яна ж не ведае, якая ў іх патрэба была, але на кургане нейкі час стаялі. Пазней ужо, калі «партызан» гэтых вылавілі ўсіх, ясна стала, чаго яны прыпыняліся тут.

Абгледзелі так усе куты, аблазілі, абшнырылі. А яна ўсё, да печы прытуліўшыся, моўчкі стаяла, пазірала. Тады ўжо да яе, як змеціўшы толькі,— каб есці хутчэй варыла. А што там надта варыць было, адной бульбай амаль і перабівалася. Сказала, што няма чаго, акрамя бульбы, думала — можа, пашукаюць ды пойдуць. Але дзе ім разбірацъ было. Бульба дык бульба. Галодныя, што ваўкі зімою. Гарачага, бачыш, захацелася.

У печы яна запаліла, саганчык паставіла, бульбу пачала абіраць. А яны за сталом паселі, буталь трохлітровы гары мутнай выцягнуўшы. У яе з-за коміна на печы вянок часнаку дасталі, хлеба акрайчык з паліцы. Гэта піць ужо сабраліся. Ды раптам даўгавязаму аднаму ў мазгі стрэліла, што бульбы яна ім шкадуе, саганчык замалы ўзяла. Як скочыць да яе ды ботам па саганку тым. Толькі вада пырснула і бульбіны па зямлі пакаціліся, абабраныя ўжо...

Аміля ўздыхнула цяжка. От страху тады яна зацярпела. Ведама ж, дзяўчына маладая, адна, заступіцца няма каму словам нават, а яны што звяры якія.

Тыя, што за сталом сядзелі, заіржалі, як коні:

— Так ёй, так ёй, Стасюк!

А ён, гіцаль гэтакі, дружбакамі падбадзёраны, як зараве на яе, як разявіць зяпу сваю.

Яе аж цяпер ад успаміну таго калатнула.

— Ты што, сука, выцяртуха, картоплі шкадуеш людзям, якія кроў за цябе, гадаўку, льюць? Нябось, тых таварышаў з курга́на салам корміш! Усё галадранцы вашывыя паелі!

Сцялася яна тады. Памкнулася сюды-туды пасудзіну большую шукаць. І, нічога не знайшоўшы, у рос-

пачы, дрыжачымі, непаслухмянымі рукамі выцягнула з-пад лавы закураны, вялізны саган, у якім бульбу свінням парыла...

Успомніўшы саган той, Аміля цяпер сцішана засмяялася. Выручыў ён яе. Спадабалася ім, што стараецца яна, саган такі вялікі дастала, зноў заіржалі, як жарабцы-стаеннікі. Даўгавязы адступіў, да стала сеў. Піць пачалі.

Сядзела яна, бульбу абірала, слязьмі, што як боб у саган сыпаліся, бульбу тую саліла.

А яны пілі, між сабою ўсё па-польску закідáлі гаварыць, выхваляліся, якімі багатымі да Саветаў былі. Найбольш даўгавязы выпінаўся. З гаворкі яго зразумела, што рубчанскі ён. Хутар такі невялікі быў — Рубчаны, мо за кіламетраў дзесяць ад іх. Астатнія ж незнаёмыя былі, усе нетутэйшыя, відаць. Па сваіх вёсках яны не ездзілі, стараліся трапляць у чужыя — баяліся, мусіць, каб не пазналі.

Выхваляўся, выхваляўся той даўгавязы, а пасля раптам, як што ўспомніўшы, замоўк на паўслове, п'яна ашчэрыўся, спяваць пачаў, адстукваючы ў такт цяжкім, як літым, кулаком па стале.

Аміля павяла вачамі па лаве, супыніла позірк на покуце, і як убачыла ўсіх трох, п'яных, зарослых, з мутнымі вачамі, з агідай скаланулася, як атрасаючы з сябе той непрыемны ўспамін, але пазбавіцца не магла. Зараз жа, як дапаўняючы яго, уварваўся аднекуль нудны, сіплы, з падвывам голас.

Даўгавязы намагаўся спяваць. І то зацягваў, то выкрыкваў:

Ешчэ Польска не згінэла,
Покуль мы жыемы.
Ешчэ вудка не скіснэла,
Покуль мы піемы.

Зноў заіржалі ўсе, ляпаючы даўгавязага па выцягнутай, як дошка, спіне:

— Добра, Стасюк, малайчына! І Польска не згіне, і вудка не скісне, абы мы жылі. А мы будзем жыць, будзем, халера ясна.

— Чула ты ці не? — загучаў у вушах голас рубчанскага шляхцюка.— Думаеш, як вайна скончылася, дык і ўсё? На Саветы спадзяешся?

Аміля зноў выразна ўбачыла яго доўгі, як старая лыжка, учарнелы твар і мутныя, з чырванню ў кутках, вочы. «Каб вы самі пакіслі, бандыты»,— падумала тады, але змоўчала, нічога не сказала, толькі ніжэй схілілася над саганом. Невядома чым бы скончыўся дзень той, але стрэлы раптам пачуліся недзе на канцы вёскі. І тут жа, каля акон, уздымаючы клубы снегу, панесліся ў бок лесу сані. Ужо не цугам, як уязджалі ў вёску, а як патрапляла, стараючыся як мага хутчэй да лесу дапасці.

Яе пастаяльцы ледзь кажухі схапіць паспелі, з хаты выкаціліся, нават сівуху сваю недапітую забраць забыліся. Яна тады, як ветрам падхопленая, таксама на падворак выскачыла — паглядзець хацела, як ваякі гэтыя ўцякаюць. Ведама ж, маладое, неасцярожнае. І забіць жа маглі. Як на цяперашні розум, дык нізашто б і носа на вуліцу не высунула. Казалі потым: нехта на курган перадаў, што «партызаншчыкі» гэтыя ў вёску наехалі. Ну і пагналі іх салдаты. Ноч вылавіць перашкодзіла, у лес паспелі ўваліцца.

І гэтакія во «партызаны» былі, не супраць ночы ўспамінаць іх — глянула на чырвоныя водбліскі нізкага сонца Аміля.

У такіх «партызанах» быў і Зеня — далі яму за тую «партызаншчыну» дваццаць гадоў, не паглядзелі, што і нагі палову забрала яна. Адседзеў, праўда, пяць усяго. Выпусцілі. Калі вярнуўся сюды, Аміля ўжо год як замужам была. На вуліцы штодзень сустракаліся, але ён ніколі вачэй не падняў, хадзіў, увесь час уту-

ліўшы голаў у плечы, пад ногі сабе глядзеў, як на зямлі што шукаў і знайсці не мог...

Аміля заплюшчыла, сціснула вейкі, як бы не хочучы бачыць таго, аб чым думала. Немарасць нейкая найшла, другі дзень Зеня з галавы не выходзіць. Як зяця пабачыла, дык нешта ўсё пра бацьку яго думае.

І цяпер, як бы рассоўваючы цёмную бездань моцна заплюшчаных вачэй, высунулася чорным асмолкам Зенева чупрына, чмыхнуў-варухнуўся яго вялікі гарбаты нос на зморшчаным, выцягнутым, як пустая баразна, твары: «Ну, свацейка, маладосць спомнім, га?» — пачула хрыплавата-ліслівае, насцярожанае. П'яны дыхнуў у самы твар, нечакана рашуча пацягнуў за руку: быў упэўнены, што не адмовіць, пойдзе з ім у круг, дзе ўжо траслося, выту́пвала некалькі добра падпітых вясельных пар,— Аміля аддавала сваю Гэлю за Казіка Зеневага.

Яна б, можа, і ўстала, пайшла б тады з ім, згуляла б польку тую, бо як-ніяк усё ж раднёй яны сталі, хоць і проці яе, Амілінай, волі; можа, і ўстала б, ужо і наважылася ўстаць, але як глянула ў вочы яму, у маленькія шчылінкі, п'янавата-нахабныя, то як урасла ўсё роўна ў лаву. Хвіліну якую нерухома сядзела, а пасля рэзка адштурхнула Зеневу руку, адвярнула ў другі бок голаў, як не бачыла яго. Але хоць перад вачамі таўкліся вясельнікі, паспела заўважыць, як нядобра бліснулі жоўтымі агеньчыкамі Зеневы вочы, як, хістаючыся, ён пастаяў крыху над ёю, бы нешта абдумваў, але, так нічога і не сказаўшы, няцвёрда ступаючы, завальваючыся ўсім сваім камлюкаватым целам на правую нагу і падцягваючы левую, схаваўся на кухні...

Толькі тады яна павярнула галаву, абцягнула рукаў цёмнай квяцістай сукенкі, роспачна выдыхнула: «Бандыт чортаў, танцор кульгавы...» Як здаля, з-за гарачай заслоны туману ўгледзела вялікія, спалоха-

ныя вочы дачкі — Гэля запытальна глядзела на яе, адчула насцярожана-здзіўлены позірк зяця...

Аміля зноў, як і тады, пачула, як балюча сціснулася ў грудзях сэрца, колкі камяк стаў у горле, здушыў так, што не дыхнуць, пакаціліся па шчацэ пякучыя слязіны. Яна палахліва расплюшчыла вочы, шарганула рукою па твары, як баялася, што ўбачыць хто, асудзіць гэтыя яе слёзы. Але ў хаце было пуста і ціха, толькі недзе ў мыцельніку, за печчу, раз-пораз капала вада і часта-часта цікаў на палічцы гадзіннік. Аміля ўздыхнула, ямчэй прыціснулася плячамі да цёплай печы.

Не хацела яна, каб Гэля ішла за сына Зеневага, не хацела. Не тое што проці Казіка мела нешта, а з сям'ёй яго радніцца не хацела. Адчувала, не будзе ёй радасці ад сваяцтва такога, не будзе каму, як і дагэтуль не было, слова добрага толкам сказаць. Ведала, Зенева парада ёй не парада. А так ужо ж і адной агоркла. Усё рашаць, усё рабіць самой. З маленства самага. Калі ўжо бацьку вайна забрала, колькі ўжо гадкоў Адаська, чалавек яе, у зямлі ляжыць...

— Крр-ру, крр-ру,— пачулася раптам ля самага акна, недзе ўпоравень з Амілінай печчу. Старая схамянулася, павярнула галаў да акна, але, акрамя краёчка шэрага восеньскага неба і пакручанай галінкі старой дзічкі, нічога не пабачыла. Усё ж падымацца не стала, прыплюшчыла вочы і ўжо, здалося, пачала драмаць, як зноў пачула настойлівае і трывожнае:

— Крр-ру, крр-ру, крр-ру...

І як у адказ на гэты хрыпаты голас чорнай птушкі затахкала, залекацела чагосьці ў грудзях сэрца, нешта тужліва заныла ўсярэдзіне, невядома адкуль выплыла, запаланіла душу песня, даўным-даўно чутая, даўным-даўно забытая:

Чорны воран, што ты ўешся
Над маёю галавой.

Ты здабычы не даб'ешся,
Чорны воран, я не твой...

...Невядома адкуль узяўся і сеў якраз насупраць печы, на ўслончык невялічкага росту, з дзіцячым худым тварам, з кірпатым у рабацінні носам, салдацік.

— Васёк, а Васёк, спой, га! Што цібе стоіт? — нахіліўся над ім, тыкаючы ў рукі гітару, высокі, мо ў два разы вышэйшы за гэтага Васька, яго сябар.

Чакай жа, як та яго звалі? Сямён, здаецца, ці мо Сяргей? Во, твар помніць, а як зваць — хоць забі.

А трэці сядзеў проста на парожку, ружжо трымаў, усміхаўся, Ваську падміргваў, таксама спяваць прасіў.

Угаварылі-такі, узяў гітару. А гітара бацькава была. Яе, Амілінага, бацькі, Андрука. Песенніка і музыкі на ўсю ваколіцу. Толькі і засталася яна ад яго, памяць адна, гітара гэтая, у шафе стаіць, з чорным грыфам і з чорнаю стужкаю. Як атрымала пахавальную па бацьку, дык і прывязала стужку тую, чорную, да гітары...

Угаварылі тады Васька, узяў гітару. Крануў тонкімі хлапечымі пальцамі струны і заспяваў.

Ціхенька так напачатку, што слоў не зразумець. А пасля грамчэй усё, грамчэй. Голас глухаваты такі, прыемны. Здаецца, і не ён, не Васёк, пяе... А як глянула ў вочы яму — захлынулася, упала ў грудзях сэрца. Такія яны былі не Васьковы, так не месціліся на гэтым рабенькім кірпатым твары тыя тужлівыя і сініясінія вочы...

Здрыганулася, калі пачула, як раптам моцна за хатай нешта сказаў зяць, як голасна залілася шчаслівым смехам Гэля. Аміля неяк уся сціснулася раптам, здранцвела, услухоўваючыся ў гэты шчаслівы смех дачкі, у малады здаровы голас зяця.

Зноў балюча сціснулася сэрца па сваім, нязбытным. Падступіла, здушыла жалезнымі абручамі крыўда на недарэчны лёс, і ахапіла душу, невядома адкуль узя-

лася злосць, пякучая нянавісць да некага невядомага, але рэальна-страшнага, агіднага, да таго, хто перашкодзіў, адабраў, здавалася, такое блізкае і магчымае шчасце.

Паляжала яшчэ хвіліну якую, уся ў напружаным чаканні прыслухалася, але галасы за хатай сціхлі. Толькі раз-пораз было чуваць, як пазвоньвае матычка, натыкаючыся на камень...

Зноў прыйшоў аднекуль з далёкага небыцця Васёк, устаў перад вачамі, як жывы, набліжаючы тое, ужо немагчымае шчасце. Зноў загучала, спакваля ўваходзячы, напаўняючы ўсю істоту трывогай і смуткам, тая яго тужлівая песня...

Салдат пабілі ў той жа вечар. У спіну, усіх трох. Адразу як выйшлі ад яе, Амілі. Павярнуцца не паспелі: як ішлі, так і пападалі ніцма. Пабілі іх бандыты. Помсцілі, каму — невядома, за багацце сваё. Куфраў струхлелых, бітком набітых, межаў былых аніяк дараваць не маглі.

Гітару тую ў руках тады трымала, як стрэлы раптам пачула. Толькі салдацікі з хаты выйшлі, толькі Васёк песню дапеў, развіталіся. Першы раз затрымаць мо хацела, хоць на хвіліначку, не пусціць. І ён тужліва і доўга глядзеў на яе.

Стрэлы пачула — тры чаргі кароткія. Як хто сукі сухія ламаў. Гітару з рук выпусціла, а зварухнуцца не магла. Павярнула галаву, як захраплі каля акон коні і пранзліва крыкнуў груган на старой дзічцы. Нехта свіснуў па-разбойніцку, моцна ляпнуў у далоні і брыдка вылаяўся, хрыпла, прастуджана. Голас як знаёмы здаўся. Яна да акна, але нічога не ўбачыла — шыбы заінелі. У адной кофтачцы на двор выскачыла. За хатай, на сінім вечаровым снезе, тры чалавекі ляжалі. Завальваючыся ў снег, ледзь-ледзь перастаўляючы непаслухмяныя, цяжкія, што калоды, ногі, падышла і ўтрупела: салдацікі ляжалі. Той высокі, што

Васька ўсё заспяваць угаворваў — галаву завярнуўшы, як бы назад хацеў глянуць шырока адкрытым, ужо застылым вокам, а другі, што з ружжом на парожку сядзеў, так і не выпусціў ружжа таго, да шчакі прыціскаў. А Васёк, яе Васёк, зусім хлапчук, ляжаў, раскінуўшы рукі, і доўгія пальцы яго былі ў ледзяным сінім снезе.

Не памятае, колькі стаяла там, каля іх. Стаяла, аж пакуль нехта моцна не адпіхнуў яе, не накрычалі вайсковыя людзі, што беглі і беглі сюды па цаліку ад кургана. Яна тады неяк прайшла тых некалькі крокаў да хаты, прытулілася здубелай спінаю да цёплай печы. У вушах стаяў хрыплы, страшны голас, які здаўся ёй знаёмым, але ўсё круцілася-вірыла тая Васькова песня, блытала думкі, адбівала памяць. Трывожна-прарэзліва крычаў на дзічцы груган.

Уначы па яе прыйшлі, павялі на курган, дзе часць стаяла. Шмат тады каго пабралі з іх вёскі. Пыталі ўсё: «Хто салдат пабіў?» А яе дык найбольш. Маёр такі сівы. «Не адпусцім,— кажа,— дзевушка, еслі не скажаце». А каб жа яна ведала, каб жа бачыла! Паверылі... Адпусцілі...

Аміля павярнулася на другі бок, зноў заплюшчыла вочы, але, як ні намагалася, Васьковага твару больш так ясна не ўбачыла. Прайшоў па душы трывожна-настойлівы крык гругана, над самым вухам зусім ясна прагучаў хрыплы, страшны голас, аж нешта здрыганулася ўсярэдзіне. Аміля напружылася, здавалася, зараз штосьці ўсплыве ў памяці, і яна ўбачыць, убачыць таго, хто крыкнуў тады ля яе акна, але зноў загучала, ажыла ў душы Васькова песня пра чорнага ворана, блытаючы, збіваючы думкі...

Старой захацелася раптам глянуць на птушку. Яна была ўпэўнена, што сядзіць тая на старой дзічцы, як і тады, у той страшны вечар. Захацелася прагнаць яе, напасць гэту чорную,— лягчэй, здавалася, стане.

Аміля ўчапілася непаслухмянымі, халоднымі, дарма што ляжала на печы, пальцамі за краёк выслізганай цёплай цагліны, завярнулася спінай да хаты, доўга мацала нагою, пакуль наважылася паставіць яе на вузенькую лаўку ля печы, а пасля другою, ужо смялей, стала на падлогу, адарвала дрыжачыя рукі. Босая прашлэпала да акна. Адшчапіла кручок, піхнула акно і высунула голаў. На дарожцы, ля саду, убачыла, як, хістаючыся ў бакі, падцягваючы левую нагу, у ссунутай набок зімовай, парыжэлай ад часу, з адным апушчаным вухам шапцы, у расхрыстанай, зашмальцаванай, з ашмёткамі бруднай ваты фуфайцы, поўз Зеня.

«Іш, падла, налізаўся ўжо, родных спомніў. Зараз прылезе, слініць, наракаць будзе, на жызню сабачую жаліцца. Цьфу, каб ты выгараў, погань...»

Хацела ўжо зачыніць акно, пакуль не ўбачыў яе, як раптам нечакана прарэзліва крыкнуў на дзічцы груган.

Зеня спыніўся, закінуў голаў, выцягнуў доўгую, худую, як у старога гусака, учарнелую шыю, прыкрыў далонню вочы ад зыркіх, касых промняў нізкага сонца, што выбіваліся з-за яблынь, чырвонымі плямамі падалі на яго рукі, сляпілі, не давалі глядзець.

Зноў надрыўна крыкнуў груган, і, як не хочучы гэтага крыку, узняў рукі Зеня, моцна тройчы ляпнуў у далоні, п'яна і брыдка вылаяўся.

Распаленым цвіком увайшоў яго хрыплы голас у Аміліна сэрца, абдаў усё нутро нясцерпна пякучай гарачынёю.

Тысячу разоў мінаў ён яе хату, тысячу разоў гучаў у памяці і адыходзіў непазнаным гэты страшны голас. І вось нарэшце...

Касцы

Касілі ўтрох. Першы, пускаючы касу на ўсе рукі, шырока і грузка ставячы ногі, ішоў Павал. Ледзь паспяваючы за ім, задыхана-часта жыхаў круглы, таўставаты Вінцусь. І ўжо неяк зусім асобна, астаўшыся далёка ззаду, няспешна клаў роўны пракос Мамонаў Яська.

Мужчыны касілі супольна.

— Глядзі ты, не спяшыць Мамон, ледзь ківаецца, думае, нехта за яго выкасіць, а ён гатовае возьме,— засіпеў Вінцусь, як толькі Павал прыпыніўся мянціць касу. Павал паволі павярнуў галаву: увесь чырвоны, як абвараны, Вінцусь стаяў за спінай і злосна лыпаў малымі круглымі вочкамі. Павал паволі сагнуўся, грабануў з пракоса жменю травы, выцер касу. Дастаў з кішэні мянташку, тады адказаў:

— Вы, брат, абое рабое. Ён ледзьве цягнецца, а ты лапочаш тут во, без толку, траву псуеш.— І, падціснуўшы кассё пад паху, павёў колькі разоў мянташкаю, спрабуючы лязо, глянуў назад: метраў сто за імі, здавалася, не ішоў — плыў па лузе шчуплы, невысокі Яська.

Павал усміхнуўся, зноў глянуў на Вінцуся:

— Ты не сіпі, як гусак, а давай мянці во, а то глядзіш, Яська дагоніць — пяты абрэжа.— І павярнуўся да пракоса, лёгка, як гуляючы, пусціў касу паўкругам. Вінцусь, зніякавелы ад нечаканых Паўлавых слоў, стаяў нейкі час нерухома, а пасля апусціў касу, забыўшы памянціць яе, і, яшчэ больш злуючы, што не бярэ, пасунуўся следам.

Яська і праўда адстаў-такі ад мужчын, мала ўжо й бачыў іх з-за высокай, яму, маломy, па пахі, травы. Штосьці дзіўнае рабілася з ім у гэтую раніцу. Ён і сам добра не разумеў сябе, адно пасміхаўся разгублена, слухаючы, як трапеча, шчасліва заходзіцца ў грудзях сэрца ад усяго, што бачаць вакол вочы. Мокры па шыю, у высокай роснай траве, яшчэ больш шчуплы ад таго, што шыракаватая, вайсковага крою кашуля і галіфэ шчыльна абліпалі цела, без шапкі, з рэдкімі рудаватымі пасмамі мокрых валасоў, Яська раз-пораз спыняўся, даставаў з глыбокай кішэні мянташку і застываў так, трымаючы яе ў выцягнутай руцэ.

З-за маладога алешніку ўставала сонца. За ровам, за гэтым цыбатым алешнікам, чуў Яська, прачыналася выспа. Недзе ў самым глухім куточку яе, у ельніку, таемна застагнаў лясны голуб; мусіць, абуджаная ім, нездаволена рэзка затрашчала сарока, гулка пераклікнуліся між сабою дразды.

Востра запах валяр'яннік. Сонца разам з расою ўзнімала, цадзіла над лугам церпкі, аж кружыла галаву, водар. З высокай травы, з-пад самых Яськавых ног, шэрымі камячкамі пырхала, разляталася ў бакі дробнае птаства.

Асцярожна, як баючыся парушыць цнатлівае хараст/во наваколля, апускаў Яська касу. Пакорліва паддаваліся, падалі ружовыя, трапяткія маланкі, падатліва-мякка слаўся ў пракос духмяны, у зялёных, што маладыя гуркі, стручках аер, купчаста клалася густая, як сцягнуць касою, балаціна, пахла свежаю рыбаю, рачным глеем, водарасцямі.

Яська зноў нерашуча спыняўся, зноў стаяў нерухома, глядзеў, слухаў. У нейкі момант са здзіўленнем адчуў, як нараджаецца, вырастае ў душы нязгода з настойлівым цягам Паўлавай мянташкі, што адбівала касу ўжо на другім канцы лугу, з няўмела-паспешлівым, прагавіта-жадобным гукам Вінцусёвай, якая

пляскала недзе зусім блізка, за круглым лазовым кустом. З'явілася ў душы неадольнае жаданне спыніць іх, крыкнуць: «Чакайце, хлопцы. Пастойце. Гляньце, хараство якое!» Але тут жа ўявіў неўразумелы Паўлаў пагляд, рабы, насмешлівы Вінцусёў твар — не варухнуўся.

Нечакана прыйшло і працяло ўсю істоту вострае адчуванне імгненнасці гэтае прыгажосці. Ён неяк бездапаможна азірнуўся, бы хочучы знайсці абвяржэнне гэтаму адчуванню, убачыў доўгія роўныя стужкі пракосаў. Трава там была яшчэ свежая, але сонца ўзнімалася ўсё вышай, промнямі цягнулася да пракосаў, пачынала сушыць. Тут жа ўсцешна падумалася, што ўсё так і павінна быць: выспелыя травы гінуць, каб даць месца новым, так на Зямлі ад веку, такі непарушны закон існасці ўсяго жывога на свеце. І ўсё ж здзіўлена заўважыў, што, зусім не супакоеная гэтай развагай, пачынае аціхаць, блякнуць у ім тая, амаль дзіцячая радасць, якая так урачыста гучала ў душы цэлы ранак. Толькі зараз адчуў, як п'яніць, расслабляе цела першая стома, і, не хочучы паддавацца ёй, зноў рашуча апусціў касу...

Сонца хілілася на захад, калі мужчыны адбівалі пакос ад рова. Было ціха і душна. Прыпарвала. Плоймаю насіліся ў паветры камары, стогалоса звінелі, смоллю лезлі ў вочы, цялі ў спіну, блыталіся ў валасах. Не было ратунку. «Пэўне, на дождж,— падумалася Яську,— і расы во ні кроплі. Трэ не ўпусціць, дапільнаваць, як будзе садзіцца сонца. Яно і дождж не пашкодзіць. Хай бы прамыў траву. На сырую нічога...» Недзе на другім баку рова пачынаў дзерціся драч, па завонях заводзілі сваё вячэрняе кумканне жабы, за лугам, над поплавам, трывожна крычаў бакас, зманьваў, адводзіў кагось ад гнязда.

Зусім побач, траха не над вухам, лопнула, шаматнула крыламі птушка. Яська прыпыніўся. З-за рова

пераляцела дзікая качка, апусцілася на пакосе, каля лазовага куста, пасля хуценька прабегла колькі крокаў, схавалася за купінаю. Яська сачыў за ёю краем вока, баючыся павярнуць галаву. Які з час птушка пастаяла там, стаіўшыся, толькі раз-пораз вытыркала галоўку, цікавала за чалавекам.

Пасля, мабыць, упэўненая, што нічога не грозіць, сцярожка падала голас: «Крэ». Крыху счакаўшы, яшчэ і яшчэ. З куста, як пароль, пачулася такое ж сцярожка-ціхае: «Крэ-крэ». Качка яшчэ раз азірнулася і хуценька нырнула ў куст. Адтуль зараз жа данеслася радаснае, нецярпліва-маладое крэканне, якое марна старалася суняць асцярожна-разважлівае, самавітае.

«Вывадак»,— па-дзіцячы радасна падумаў Яська. І тут жа, бы тая качка, пудліва павёў галавою, азірнуўся: ці чуў яшчэ хто. Убачыў, як спыніўся, услухоўваючыся, Вінцусь, як перастаў касіць і запытальна глядзеў у бок куста Павал. Трывожнае прадчуванне прайшло па душы. Ён узняў касу, знарок звонка пачаў мянціць яе, а пасля, як ні ў чым не бывала, сагнуўся над пракосам. Пачуў, як зазвінела Паўлава каса, супакоіўся. Але тут жа здрыгануўся ад гучнага шлэпання. Ззаду, чапляючыся за купіны цяжкімі, літымі гумовікамі, бег Вінцусь.

— Вы што, паглухлі, не чуеце — качкі дзікія ў кусце,— закрычаў здаля, не дабегшы.

«Сам ты дзікі»,— роспачна падумаў Яська, але сказаў іншае, спакойна-абыякавае:

— Якія тут качкі! Малыя зусім. Паляваць няможна. Хай растуць.

Вінцусь з лёту спыніўся, няўцямна лыпаў круглымі, бліскучымі вочкамі, а пасля грэбліва махнуў рукою, не зважаючы на Яську, зароў да Паўла:

— Паўлюк, сюды давай. Смажаніна будзе.— І дзе толькі спрыт узяўся — загіцаў па купінах да лазняку.

Яська бачыў, як няспешна выцер касу Павал, як азірнуўся вакол сябе, шукаючы што пад руку, не знайшоў, торкнуў касу ў зямлю, пачэкаў да куста.

Дзіўную спустошанасць адчуў раптам у сабе Яська, адчуў, як становіцца чужою, абыякаваю да ўсяго, душа. Ён нейкі час стаяў нерухома, як не верачы, прыслухоўваўся да сябе, і страпянуўся толькі, калі нечакана пачуў ціхае крэканне. Ратуючыся ад бяды, старая качка вяла між куп'я качанят да рова. Яны смешна валюхаліся, хуценька беглі за ёю, выцягвалі ўперад доўгія, тонкія шыйкі. Ужо ладныя, сытыя ад багатага навакольнага корму, але яшчэ не апераныя, убраныя ў мяккі шэры пушок. Адчуваючы, як цяплее ўнутры, Яська сцішана засмяяўся: «Абхітравала ты іх, мілая. Давай, давай, хутчэй хавайся».

Вінцусь з Паўлам трыбушылі лазняк. Чуваць было, як трашчала ламачча, як бурчэў нездаволена Павал і бажыўся, апраўдваўся перад ім Вінцусь. Урэшце вываліўся адтуль, скочыў на купіну, бы каршун, абмацваў вачамі куп'ё, шукаў здабычу. Нічога не ўгледзеў, крыкнуў:

— Ну, што там, Ясь? Мо выйшлі яны, га? Няма ў кусце, як скрозь зямлю праваліліся.

— Дзе табе выйшлі! Не відно нідзе. Шукай далей. Пэўне, у лазняк зашыліся.— Як пацвярджаючы свае словы, Яська колькі крокаў ступіў туды, да лазняку, але Вінцусь яго ўжо не слухаў. Ён сам тут жа ўбачыў, як узбіраліся качаняты на бераг рова і там, за кустамі, плюхалі ў ваду. Бы сарваўшыся з навязі, Вінцусь рынуўся за імі. Сцігаў па куп'і, гіцаў так, што ўзляталі з-пад ног камякі гразі, скакалі вышэй галавы. Літыя гумовікі, здавалася, не паспявалі за тоўстымі сцёгнамі. Вінцусь зачапіўся за купіну, з маху хістануўся да зямлі, але ўтрымаўся. Коратка мацюкнуўся, пабег далей. Яська глядзеў, як падскоквае на купінах цяжкі Вінцусёў азадак, і адчуваў, што зноў вяртаецца ў душу тая

ранейшая спустошанасць і робіцца страшэнна непрыемным і гідкім гэты круглы, як мяшок, чалавек. Ён адвярнуўся і ўбачыў, што проста да яго, пасміхаючыся, размерана пачэкваючыся, крочыць Павал. Урэшце, параўняўся, як апраўдваючыся сказаў:

— Збеляніўся чалавек. Мяса запрагнуў. Пайшлі, паможам. Хай наесца.

Яська не варухнуўся. Ён бачыў, як колькі разоў, ідучы да рова, азірнуўся на яго Павал, на момант прыпыніўся, бы раздумваў, начэкваў, а потым усё ж пашыўся ў лазняк. Чуў, як ужо там, у лазняку, дзіка залямантаваў, быццам палявалі на яго самога, Вінцусь і як у адказ на гэты лямант у душы зноў калыхнулася і асела гідкасць. Але ён стаяў па-ранейшаму нерухомы, апершыся на касу, як не могучы варухнуцца, здранцвеўшы.

Паволі заходзіла сонца, сядала за хмару і, ужо нябачнае, кацілася ўніз, хавалася недзе за высокім гарбом далёкага поплаву. Яська сачыў за ім, утрапёна лавіў гукі, што далятаді з рова, чуў, як трашчыць там сухое ламачча, як плёхае, б'е крыламі па вадзе качка, ратуе дзяцей. Раз-пораз сюды, да яго, далятала, рэжучы цішыню адвячорка, яе адчайнае, адзінокае крэканне, і тады адчуваў: штосьці пякучае праходзіла па душы, штурхала да рова. А ён, як не мог выбіцца з утрапення, усё стаяў, апершыся на кассё, слухаў. Раптам, заглушаючы ўсе гукі, зноў заенчыў на рове Вінцусь: «Не шкадуй, Паўлюк, не шкадуй. Малацці. Каля цябе ж недзе. Пад ваду пайшлі. Да дна даставай...» Як толькі цяпер дайшоўшы да памяці, як толькі цяпер уразумеўшы штось для сябе неабходнае, Яська рэзка рвануў з твані касу, завярнуў яе за плечы і рынуўся туды, адкуль даносіўся крык і плёскат. «Я табе зараз дастану. Я цябе зараз накармлю». Лазняк чапляўся за касу, не даваў бегчы. Ён кінуў яе, ухапіў тоўсты альховы сук, пабег далей. Паляўнічыя былі недзе неда-

лёка, ён ясна чуў іх крыкі і шматгалосае качынае крэканне. Раптам нешта ў тым баку гулка плюхнула, адчайна заенчыў Вінцусь, зноў моцна захлюпала ў рове вада, бы варочаўся там хтось вялізны і няўклюдны, затым зрабілася так ціха, што чутно было, як звіняць камары. Але тут жа, рвучы гэту цішыню, над лугам панёсся рогат. Рагатаў Павал. Яська ўрэшце выцерабіўся з лазняку і ўжо мінаў алешнік, калі рогат нечакана аціх. Яська зрабіў яшчэ колькі порсткіх крокаў і траха не наляцеў на Паўла, які стаяў за густым калінавым кустам. Павал уздрыгнуў, рэзка павярнуўся. Ледзь пераводзячы дух, Яська коратка кінуў:

— Дзе?

Павал моўчкі павёў вачамі. За некалькі крокаў ад іх, шырока расставіўшы ногі, недарэчна растапырыўшы рукі, стаяў Вінцусь. З адзення сцякала ў шырокія халявы гумовікаў рыжая балотная вада, твар, густа залеплены тванню, быў чорны. Ён заўважыў Яську, варухнуўся насустрач, падняў такую ж, да локця, чорную руку. За ружовую лапку Вінцусь трымаў мёртвае качанё.

Тут жа ўскінуў яго на далоні, загаварыў хутка, апраўдваючыся:

— Самае здохлае папалася. Тыя ўцяклі. Ну, нічога. Мае будуць. У суботу швагра прывязу. У яго двухстволачка і ганчак ёсць. Прыхопім. Хітрыя. Без сабакі не возьмеш.

Яська моўчкі адвярнуўся. Праз лазняк, напрасткі пайшоў да пакосу.

Шарэла. Па лузе, над рэдкімі завонямі, цёпла курэў туман. Трывожна крэкала на рове, склікала распуджаных дзяцей старая качка. Спакойна, натомлена ляжаў скошаны луг, толькі ў самым куце сіратліва цямнеў пакінуты чуб травы.

Мужчыны вярталіся дамоў кожны па сабе.

Марцэля

Быў жнівень. Сонечны. Светлы. Даспявала, хіліла да зямлі цяжкі, наліты колас жыта. Жаўцелі ў садках раннія яблыкі, дробныя, з чарвівінкаю дачасна сыпаліся ў мяккую, маладую атаву, соладка пахлі. У лясах, па арэшніку, цакаталі вавёркі — ласаваліся шчодрымі ў той год арэхамі.

Набліжаўся спас.

Марцэля, падбіўшыся за доўгую дарогу, з цяжкімі, як павалодаць, чамаданамі, ледзьве перастаўляла ногі. Яна часта спынялася, ставіла чамаданы на зямлю, здзіўлена аглядалася. Толькі тыдзень прайшоў, як паехала яна адсюль, а здаецца, што мінула бог ведае колькі часу і ўсё тут адмянілася і ў зменнасці сваёй стала яшчэ больш вабным і мілым. Марцэля як наноў пазнавала ўсё, наноў вяртала ў сваю душу, ужо не могучы даць сабе веры, што яшчэ нядаўна гатова была пакінуць усё гэта назаўсёды...

Дахаты аставалася якой з паўвярсты, калі яна адчула, што не можа болей ісці, што мусіць зараз жа прысесці. За ўсю доўгую, у сем вёрст, дарогу ад станцыі ніхто ёй не трапіўся, каб падвезці ці памагчы. Напачатку, праўда, яна й не думала пра тую помач, сама ляцела, як на крылах, яшчэ й радавалася, што ніхто не бачыў, як выйшла з вагона, як адышла ад станцыі. Усцешна думалася, што так во, нікім не ўбачаная, прыйдзе да свае хаты, кіне ў кут гэтыя абрыдлыя за дарогу клункі, пераапранецца, і ўсё... І ўсё зноў будзе так, як было ўсе сорак гадоў яе жыцця сярод гэтага поля і лесу. Яно, жыццё тое, цяпер здавалася ёй нейкім

немагчымым, нязбытным раем пасля ўсяго перажытага.

Марцэля спынілася, паставіла ў цёплы, мяккі, як мука, пясок чамаданы, сама зняможана апусцілася побач, проста ў запыленую, аж сівую пры дарозе, траву, ужо не высцерагаючыся, што ўробіць святочную, бурачковага колеру, сукню, якую так любіла і якую за гэту доўгую дарогу, тручыся па вагонах, не пазнаць, знішчыла. Бачыла, што гарадскія маладзіцы пераапраналіся ў вагоне, нацягвалі на сябе што горшае, ехалі ў халатах, але сама гэтак не магла. У людзях хацелася выглядаць як найлепей. Цяпер жа адчула, што ёй усё роўна. Прагла аднаго: хутчэй зняць з сябе гэты свой убор, з ім, здавалася, спадзе з яе і тая роспач, якая тачыла душу ўсе дні яе пакутнага падарожжа, і гэта свінцовая стома, якая давяла яе да знямогі.

Была Марцэля ўжо ў гадах. Невысокая, спрытная, усё яшчэ вабная тым апошнім жаноцкім хараством, якое ўжо выспела, выстаялася і так во znячэўку затрымалася ў ёй, недаўгавечнае, апошняе, як і гэта жнівеньская нетрывалая пекната канцавога лета.

Раптоўны страх перад гэтаю недаўгавечнасцю свае красы, якога ніколі раней не знала і які так нечакана найшоў на Марцэлю ў гэту весну, штурхнуў, узняў яе з наседжанага, звычайнага месца ў няблізкі свет шукаць даўно згубленага незваротнага. Ды дзе ты знойдзеш яго. Асталося яно, відаць, разам з яе познім каханнем у тых маладых, высокіх травах яе трыццатага лета. А лета ж тое было, ах і лета ж! Вот так і асталося яно адно ў яе на ўсё жыццё. Здавалася, ніколі так, як у тое лета, не цвілі на лугах краскі. Яшчэ не пачыналі касіць, і яны ў самым росквіце, цяжкія, хіліліся ў росах, буялі, хвалямі кацілі пад ветрам і пахлі, пахлі. Гледзячы на іх, думалася, што яшчэ дзень-другі і не датрываюць, палягуць, панікнуць да зямлі... Трыццатае сваё лета ў гэтых травах згубіла Марцэля і жах-

нулася: якая старая. Неяк адразу, востра адчула сваю адзіноту і болей ужо не магла ад яе адкаснуцца.

Тыя кавалеры, што ўдаваліся да яе сватацца і якім яна кожны раз адмаўляла, неўпрыкмет пажаніліся, а сяброўкі-равесніцы даўно павыходзілі замуж, і Марцэля як толькі цяпер усё гэта заўважыла, як толькі цяпер азірнулася і аб усім нярадасна, з сумам падумала.

Была яна прыгожая той асаблівай прыгажосцю, якой не мінеш не падзівіўшыся і аднаго разу ўбачыўшы, яшчэ доўга будзеш памятаць.

«Над усю вёску»,— з ціхаю зайздрасцю казалі жанкі. Хлопцы, дый сталыя ўжо мужчыны не давалі спакою сваімі заляцаннямі. А Марцэля як не заўважала ўсяго гэтага — на самую настойлівую ўвагу адказвала вясёлымі жартамі і гордая, яшчэ больш вабная ў сваёй недасягальнасці варочалася з вечарынак адна, не дазваляючы нікому сябе праводзіць.

«Прынца чакае»,— са злосцю і крыўдаю казалі непрызнаныя кавалеры. А яна і праўда чакала. Упарта, даўно. Чакала кахання.

«І што ты, дзеўка, перабіраеш,— папракалі-вучылі Марцэлю старэйшыя кабеты.— Састарэеш во, тады ніхто й не гляне. Векавухаю астанешся. А адной цяжка жыць. Сама ведаеш, не дай бог чалавеку аднаму. Хай воўк і сабака адзін жыве...» Марцэля не пярэчыла, лёгка з тым пагаджалася, але замуж не спяшалася, жыла па-ранейшаму адна, у вялікай бацькавай хаце.

Хадзіла на гульбішча ўжо даўно з маладзейшымі дзяўчатамі, раўніва аглядаючы іх, такіх усхвалёваных, роспачна слухаючы сваю душу, усё больш і больш спакойную, утаймаваную.

Прыдзірліва акуратна і прыгожа ўкладвала свае цяжкія, русыя косы паверх маленькай, горда ўзнятай галавы і, можа, часцей, чым сама таго хацела, задзі-

рыста смяялася, жмурачы вялікія сінія вочы, хаваючы іх здрадлівую зажуранасць.

Уздымаліся, хадзілі пад лёгкім каптанікам тугія дзявочыя грудзі, пад яшчэ ўсё частымі, настойлівымі паглядамі хлопцаў не-не дый ружавелі шчокі, і яна, па-ранейшаму адчуваючы сваю прыгажосць, жаночую сілу і вабнасць, адначасна радуючыся таму і як бы саромеючыся, хілілася блізка да сяброўкі, танклявай маладзенькай Мані, і яны абедзве раптоўна зрываліся з месца, ішлі ў круг, і толькі ўжо там, у танцы, аб усім яна забывалася... Неспадзявана прыйшло да Марцэлі ў тое лета каханне. Сустрэлася на вузкай палявой сцяжыне — не абмінуць, не размінуцца. Дый дзе ты абмінеш, калі абмінаць не хочацца, калі, зрэшты, цікава — хто ж гэта ён і адкуль, раней нябачаны і нязнаны, з'явіўся раптам перад ёю на сцежцы ў іх ціхім, лясным закутку. Ды і яму таксама, відаць, цікава, бо во як доўга, не зводзячы шэрых вачэй, глядзіць на яе. Ага, усё ж схамянуўся першы: як да малой, а яны, дальбог жа, мусіць, аднагодкі, загаварыў:

— Дык чыя ж будзеш, такая сінявокая?

А яна раптам, страціўшы ўсю сваю дзёрзкасць, разгублена і, праўда, як малая дарасламу, адказала:

— Марашэвічава я. Марцэля.

— А я да Юрчыхі, да цёткі, прыехаў з Данецка. Учора вечарам яшчэ. Але з дарогі праспаў доўга. Пятром завуць,— працягнуў цвёрдую, дужую руку.

Яна няўмела падала сваю і, адчуўшы на момант кароткі ўпэўнены поціск, пачырванела, яшчэ больш разгубілася. І ўжо праз гэту разгубленасць, як праз гарачы туман, прыпомніла нядаўняе. Неяк адвячоркам, беручы з іх студні ваду, хвалілася ёй, Марцэлі, старая Юрчыха: «Гэта ж сястрын Пятрок, пляменнічак, ліст сягоння прыслаў. Паштарка во якраз у полудзень прынесла, то я ўжо, каб цябе лішні раз не турбаваць, Марцэлька, яе й прачытаць папрасіла. Піша Пятрок,

што прыехаць сюды, да мяне, выбіраецца. Ён жа ж не быў тут, на бацькаўшчыне, ніколі. Гэта ж як выязджала наша Адэлька з сваім Іванам у той Данецак на заробкі, Петраку й годзіка не было. Шчэ й не хадзіў нават. Так на руках, помню, і панеслі яго. А во, глядзі, цягне чалавека ў свой кут, дзе нарадзіўся».

Цяпер, стоячы з Пятром на сцежцы, Марцэля прыпомніла й тое, што яшчэ тады, каля студні, як прадчуваючы нешта, нечакана захвалявалася душа і ёй увесь час, пакуль слухала Юрчыху, карцела больш падрабязна распытаць у кабеты пра пляменніка. Але чамусьці тады, адразу, не адважылася, а потым яно неяк само сабою сышло з памяці, неўпрыкмет забылася — хапала пра што думаць... Адчуўшы цяпер зноў тое хваляванне, Марцэля яшчэ больш пачырванела і, каб схаваць гэту сваю разгубленасць, ціха сказала:

— Ну, я пайду ўжо. А вы... Вы прыходзьце вечарам у клуб. У нас весела, дзяўчат многа.

Пятро ўсміхнуўся:

— Калі цётка пусціць.

І, размінуўшыся з дзяўчынаю, агледзеўся яшчэ раз, кінуў наўздагон:

— Да вечара, значыць, Марцэля?

Яна таксама прыпынілася, шчасліва засмяялася, лёгка махнула загарэлаю рукою, амаль подбегам пусцілася па вузенькай сцежцы, што збягала з пагорка ў зялёную лашчыну.

І ўжо там, у лашчыне, ломячы ў букет крамовыя, пышныя, з горкім пахам будучых ягад, кветкі каліны, а потым ставячы іх у хаце, проста ў збане на стол, Марцэля чула, як нарастае ў душы і цалкам палоніць яе радаснае, трывожнае чаканне...

Дзіўнае было тое лета. Так во і асталося яно ў Марцэлі адно на ўсё жыццё. Нічога, акрамя аднаго толькі лета. З частымі навальнічнымі дажджамі, кароткімі

і нечаканымі, як яе пачуццё. З салодкім пахам зуброўкі на паплавах у цёплым мораку летніх вечароў.

Гэтак жа соладка, здавалася, пахлі дужыя Пятровы рукі, яго непаслухмяныя русыя валасы, яго ненатольна-хмельныя вусны...

Якое кароткае было яно, тое лета... Мільганула знічкаю на небасхіле яе жыцця, яе лёсу і сканала ў высокіх духмяных травах.

...Паехаў Пятро ад цёткі ў свой далёкі, такі незнаёмы, чужы Марцэлі, Данецк. Анічога не паабяцаўшы, нічога не сказаўшы на развітанне. Дый развітання таго не было. Проста не прыйшоў ён адзін вечар на Марцэліну вузкую лаўку пад хатаю. Не прыйшоў, і ўсё. І тады ўжо, ці не назаўтра, загаварылі ў вёсцы, што ў Данецку тым у яго сям'я, што скруцілася Марцэля з жанатым.

Ды яна як не чула тых размоў, не хацела ім верыць. Напачатку штодня чакала ад Пятра ліста, чакала, што напіша, што пазаве яе да сябе. І тады яна кіне ўсё тут, паедзе да яго хоць на край свету. Але Пятро не пісаў, не зваў. І тады Марцэля пачала чакаць лета — аднаго, другога. Так мінула іх ажно пятнаццаць.

У вёсцы пра Марцэлю гаварылі ўсяляк. Злыя языкі казалі, што страціла яна розум на тым сваім каханні. Некаторыя проста шкадавалі яе, прыгожую, нешчаслівую. А яна ўсё чакала. І прычакала. Праз столькі часу прыслаў Пятро сваёй цётцы, старой, гарбатай Юрчысе, ліст. З тым лістом і прыйшла Юрчыха да Марцэлі: «Пачытай, Марцэлька, што піша гэты валацуга». А «валацуга» пісаў няшмат, коратка. Пра тое, што астаўся адзін, што яго хворага пакінула жонка, што няма каму зараз нават вады падаць. А ў канцы, як між іншым, спамінаў пра Марцэлю, прасіў перадаць ёй паклон...

Божа, што пачалося ў душы яе пасля гэтага ліста. Месца сабе не знаходзіла, пакуль не рашыла — паедзе. Паедзе туды, да яго. А раз рашыла, то тут жа стала спешна збірацца. Прадала ўсю сваю гаспадарку, пакінула толькі хату: а раптам Пятро згодзіцца і яны прыедуць жыць сюды. І вернецца зноў тады іх тое, маладое, кароткае шчасце. Напэўна, згодзіцца. А што яму, хвораму, у тым горадзе, у чужых людзях.

Але які ён хворы і як ён, такі дужы, можа быць хворым, Марцэля аніяк не магла ўзяць да галавы. А таму і выбіралася яна не як да хворага. Марцэлю найбольш хвалявала, як яна выглядае, ці пазнае ў ёй, пастарэлай, Пятро тую, ранейшую Марцэлю, якую ўсё яшчэ памятаў.

Бегала на параду да Мані: рэзаць ёй косы ці не. Бо гарадскія, бачыла, усё найбольш з кароткімі, з рознымі там завіўкамі, ходзяць.

— Не, не адразай, Марцэлька,— падумаўшы параіла Маня.

— А, і праўда, Манечка. Не буду. Укладу іх гэтак во, паверх галавы. Як маладая насіла. Каб спомніў адразу, як толькі гляне.

Ну, вот так і паехала яна ў той Данецк. Божа, колькі ехала. Думала, канца-краю не будзе гэтай дарозе. Так далёка ніколі ў жыцці не выбіралася.

Мяняліся цягнікі на станцыях, мяняліся Марцэліны спадарожнікі. Толькі яна паспявала прывыкнуць да сваіх суседзяў у купэ, а ўжо трэба было разыходзіцца з імі і думаць, як гэта ехаць далей. Ізноў сядала ў вагон, ізноў тахкалі колы, і Марцэлі здавалася, што гэтаксама тахкае ў яе ў грудзях сэрца.

Чым меней часу аставалася да сустрэчы, тым болей яна пачынала хвалявацца. Ужо не магла спакойна сядзець, часта падымалася, хадзіла па вагоне, падоўгу адзінока стаяла каля акна ў вузкім калідорчыку насупраць свайго купэ. І ўсё ўяўляла сабе сустрэчу з Пят-

ром. Як прыйдзе да яго, як ён убачыць яе, як здзівіцца напачатку, а пасля ўзрадуецца. І ў гэтых мроях Пятро быў усё такім маладым, прыгожым і дужым, якім яна яго памятала. І вяртаўся аднекуль, кружыў Марцэлі галаву забыты, салодкі хмель іх кахання. Ёй здавалася, што яна ніколі гэтак не жадала вярнуць былое, ніколі так моцна не любіла і не шкадавала Пятра, як цяпер. Яна ўжо ведала, што скажа яму, як толькі яны сустрэнуцца. Усё скажа, нічога не ўтоіць: і як чакала яго ўсе гэтыя гады, як думала пра яго, і што крыўды на яго ніколі не трымала і не трымае, бо разумее ўсё. Бо што ж зробіш, калі ён ажаніўся раней, чым сустрэў яе, Марцэлю. Галоўнае, што ён не забыў яе, столькі гадоў памятаў...

Была пахмурная раніца ў нядзелю, калі Марцэля выйшла з цягніка ў Данецку.

Малады чарнявы таксіст, увесь час пазяхаючы, доўга вёз яе па яшчэ сонных вуліцах некуды далёка, ажно на край горада, кружыў сярод аднолькава шэрых высокіх дамоў, пакуль нарэшце не спыніўся насупраць аднаго з іх. Ні слова не кажучы, выскачыў з машыны, выставіў з багажніка яе чамаданы. Тады ўжо заварушылася і яна, дастала з сумачкі грошы.

Машына мякка вуркатнула, абдала Марцэлю напаследак сінім цёплым дымам і знікла з вачэй. Марцэля асталася адна. Яна падняла, адставіла з дарогі ўбок свае клункі, агледзелася.

Двор, кругом атулены высокімі дамамі, быў па-ранішняму пусты і ціхі. Абыякава сонна глядзелі на яе адусюль шчыльна завешаныя вокны. «Спяць яшчэ. А ўжо ж добра развіднела. У вёсцы недзе даўно паўставалі, кароў у поле выгналі»,— нечакана падумала яна і адчула, як сціснулася, зашчымела сэрца. Па душы лёгкім халадком прайшло сумненне: а ці так, ці

добра яна зрабіла, што прыехала? Ці чакае яе хто тут? Успомнілася, як недаверліва, скрушна хітала галавою старая Юрчыха, праводзячы яе да станцыі, як слязіліся яе выцвілыя вочы. Але тут жа, не даючы волі гэтым сумным прыпамінам, страсянулася і толькі цяпер заўважыла, што каля дома насупраць шоргае венікам пажылая худзенькая жанчына ў чорным халаце. Марцэля ўзрадавалася, што ёсць хоць адна жывая душа, з якою можна загаварыць, і, не раздумваючы, пайшла да жанчыны. Яшчэ здалёк прывіталася, падышла да самай. Жанчына, не перастаючы мясці, стрымана кіўнула галавою.

— Я гэта запытаць у вас,— Марцэля ніякавата кашлянула,— як тут Пятра Карнеева знайсці...

— Номер? — усё гэтак жа, не паднімаючы галавы, кінула жанчына. Марцэля не зразумела адразу, разгубілася, маўчала.

Жанчына перастала мясці, падняла галаву. У яе маленькіх чорных вочках успыхнула цікаўнасць. Яна моўчкі агледзела Марцэлю, тады толькі паўтарыла, растлумачыла:

— Номер кватэры вашага Карнеева...

Марцэлю прыемна кранула гэтае «вашага», і яна паспешна загаварыла, кажучы не толькі нумар кватэры, але і ўвесь адрас, гэтак, як завучыла яго перад дарогаю, каб кожны раз не заглядваць у паперку, якую трымала на самым дне сумачкі.

Жанчына нечакана ўсміхнулася, і ад гэтай усмешкі твар адразу змяніўся, пасвятлеў.

— Ідзём, дарагая. Я правяду цябе.

Адкінула ўбок маленькі, змецены да вострых ражноў, венік, шарганула аб халат рукамі.

— Ідзём, ідзём,— азірнулася, як бы падбадзёрыла Марцэлю.— Вот у гэтым пад'ездзе. Высока.

Глянула на вялікія Марцэліны чамаданы, параіла:

— Вы ліфтам, а то цяжка будзе.

Але Марцэля, як не чула, ступіла на лесвіцу і толькі тады павярнула галаву, адказала:

— Не, не. Я сама. Дзякуй вам...

Дзвярэй доўга не адчынялі. Праўда, яна спачатку спрабавала стукаць, а пасля ўжо здагадалася націснуць на чорную кнопачку ўверсе. Званок азваўся лёгкім меладычным гукам. Марцэля пастаяла, паслухала. Чула адно, як моцна тахкае ў грудзях сэрца. Нарэшце за дзвярыма нехта кашлянуў, паспешна зашоргалі крокі. Неяк інтуітыўна, як усё роўна ратуючыся ад іх набліжэння, Марцэля адступіла ад дзвярэй і, не ведаючы, куды дзецца і што рабіць, збянтэжана азірнулася. Але ў гэты самы момант суха шчоўкнуў замок, рыпнулі дзверы, і ў іх вузкай пройме яна ўбачыла сівога ссутуленага чалавека. Ён недавольна-строга глядзеў на яе праз тоўстыя шкельцы акуляраў, спрасоння хмурыўся. Нарэшце хрыпла, праз зубы, выцІснуў:

— Вам каго?

Яна маўчала. Пасля апомнілася, хуценька расшпіліла сумачку, у якой ляжала паперка з выратавальным адрасам: пэўна ж, нешта пераблытала, не туды папала. Але раптам штосьці знаёмае падалося Марцэлі ў гэтай набычанай, прыгнутай шыі, у вострым, моцна выпертым падбародку. Выслізнула, упала [redacted] рук раскрытая сумачка.

Мужчына напружана, пільна глядзеў на Марцэлю, і яна заўважыла, як мяняецца яго твар. У шэрых прымружаных вачах мільгнула разгубленасць, чалавек бездапаможна азірнуўся. Яна ступіла да яго, але ён, не адпускаючы ручкі дзвярэй, паспешна адступіў назад і ўжо адтуль, з паўзмроку прыхожай, як баронячыся, паўтарыў:

— Вам каго?

Яна нерашуча спынілася, не адказала. Моўчкі стаяла перад гэтаю вузкаю шчылінаю прыадчыненых дзвярэй і, не могучы адарваць позірку, глядзела, як дробна

лекаціць, сутаргава трымаецца за гладкую жалезную ручку худая жылістая рука.

Потым паволі павярнулася, адышла ад дзвярэй, сагнулася, падняла сумачку. Як усё яшчэ раздумваючы, пастаяла гэтак, а потым рашуча ступіла на сходкі. І калі ўжо спусцілася паверхам ніжэй, калі адпусціла душу даўкая спазма, пачула, як стукнулі, зачыніліся наверсе дзверы.

...Марцэля доўга-такі прасядзела на цёплай, прысыпанай пылам, траве. Ужо хілілася на захад сонца і ў цяньку адчуваўся здаровы, зусім не летні халадок. Блізка, амаль побач, была яе родная хата, і, неяк раптам адчуўшы гэта, Марцэля нецярпліва падхапілася, узялася за гладкія, слізкія ручкі чамаданаў...

Пах мурагу

Ужо трэці раз лічыла Ульяна грошы і ніяк не магла далічыцца: выходзіла ўсё не тое, што мелася быць. Ад хвалявання кабеце зрабілася нядобра. Яна адсунула грошы на сярэдзіну стала, зняможана апусцілася на ўслон. Адчула, як дробна лекацяць ногі і ўкрываюцца халодным потам парэпаныя далані рук. «Ну, вот табе. Маеш. Не дадаў Мазюк сотні. А што ж цяпер, га? Што ж цяпер?»

Гарачая млявасць, роспач і ўтрапенне звіліся ў такі цесны клубок, што на нейкі момант Ульяне здалося — канчаецца свет з гэтай страчанай сотняй і няма ўжо выйсця, а самае галоўнае — танчэе, танчэе і вось-вось лопне, парвецца тая нітачка надзеі, што як прамень пранізала, сагрэла яе нутро. І ўжо ратуючы яе, гэту надзею, яна зноў прысунулася да стала, падгарнула да сябе кучку скамечаных, пацёртых паперак, узялася лічыць. «Калі й цяпер не сыдзецца, то ж напэўна не дадаў. Сама ні рубельчыка не брала. Але ж як, як не дадаў, калі на вачах, пры ёй лічыў і яна настолькі пэўная была, што нат не пералічыла, калі пайшоў. Што ж гэта за насланнё, га?» І не верачы ўжо сабе, зноў пачала раскладваць, разгладжваць паперкі, выбіраючы большыя — дваццацьпяткі, складваць па сотні. І як урэшце палажыла апошнюю — дух адкаціўся. «Во здурнела баба, дык здурнела. Усё рубель у рубель. На чалавека такое падумала. Гэта ж трэба».

Стала так прыкра і сорамна, што Ульяна адчула, як зноў прылівае гарачыня і млявасць. «Што значыць рэдка пры такіх грошах быць даводзіцца»,—

мільганула, як апраўданне. Акуратна сабрала іх, злажыла ў чыстую насоўку, заціснула пляскатым вузлом, апусціла за пазуху: «Во як — Саколка мая ў насовачку ўмясцілася». І, успомніўшы перажытую прыкрасць, аж скаланулася:

«І хто толькі гэтыя грошы прыдумаў, каб яны па ўсім свеце зваліся». Хуценька паднялася, пачала апранацца. Ужо прымкнуўшы хату, апомнілася — трэ заадно свінчаці ўкінуць, спакайней будзе. Вярнулася, узяла вядро з цестам, выйшла на вуліцу. Яшчэ было шара, вёска спала. Толькі сям-там пракідаліся агеньчыкі. Прыгледзелася, пазнала бліжэйшы: у Крыцкіх, на ферме робяць. Асцярожна ступаючы, каб не паслізнуцца, патэпала да хлява.

З ночы трымаўся марозік, было не па-восеньску ціха і зорна. Падумала, што добра гэта, прымаразкі такія на хлюпоту: снег па сухому пойдзе. Успомнілася, як да пенсіі ўставала кожнае раніцы вось так, зацемна, і, не чакаючы світанку, бегала да хлява, уходжвалася, карміла жывёлу, тупала ў хаце ля печы — пякла блінцы, цэлую гару. Пульхных, духмяных — звечара расчыняла на сыроватцы, будзіла сыноў. І як адчула на якісь момант у сабе тую маладую сілу, ненатольную прагу жыцця, што, як стала помніць сябе, жыла ў ёй і прымушала рабіць, здаецца, неверагоднае — працаваць і ў калгасе і дома за траіх. Ніхто спрастацца не мог,— бабы, бывала, у баразне побач стаць баяліся: запарыць Ульяна...

Пачуўшы гаспадыню, у хляве сонна азваўся парсюк, і яна, адмыкаючы, загаварыла да яго па сваёй даўняй звычцы размаўляць з усім жывым, што было ў яе невялічкай цяпер гаспадарцы. І толькі, як расчыніліся цяжкія створкі дзвярэй, як дыхнула [illegible] хлява нязвыкла халодным і ад таго, здалося, пустым — нядобра стала на сэрцы. І як толькі што за сталом, калі ніяк не магла палічыць грошы, зрабілася цяпер гора-

ча, млосна. Апусціла на гной вядро з мяшанкаю, дзеля чагосьці мацнула за пазухай — адчула цвёрдае, хрусткае, бы ад гарачага, хуценька адхапіла руку. Справа, абвыклымі ў прыцемку вачыма, убачыла расхрыстаныя вароты пустой вялікай загарады. І ўрэшце канчаткова зразумела, паверыла: няма Саколкі. І тое, што прыснілася сёння, што падняло сярэдначы — працяг учарашняга, рэальнага. Адчула, як становіцца расхрыстана-пустой і халоднай душа, бы гэта вялікая загарада. Які з час стаяла, апусціўшы рукі, утрапёна ўглядвалася ў карэлыя ляскі, у цёмнае бярвенне сцен, слухала, як на хляве ў леташняй пацярусе шамотаюцьскігічуць мышы.

Страціўшы цярпенне, караскаўся пярэднімі нагамі, лез на вароты кармляк, ценька верашчаў. Ульяна спахапілася, апомнілася, чаго прыйшла сюды, падняла вядро, перагнуўшыся, углядвалася, шукала вачамі карыцік, прыгаворвала: «Есці хочаш, разбойнік, а міску сваю схаваў нябось. Пацярпі крышачку, ува што ж табе вылью?» Урэшце знайшла, прысунула плыценькі, з паабгрызанымі краямі чаўначок, адвёўшы рукой віславухага, выліла з вядра, які час пастаяла, слухаючы, як смачна той лэхае, пайшла.

На двары паступова віднела. Радзелі на пасвятлелым небе зоры. На ўсходзе займалася чырвань. У настылым веццi старога клёна ўздыхаў, прачынаўся вецер. Раз-другі холадна дыхнуў ёй у твар, як гуляючы адхапіў з-пад хусты сівую пасмачку валасоў, затрапаў па дробным, у зморшчынках, твары, заказытаў тонкія вусны. Не зважаючы на сваволька, засяроджаная на сваім, неадчэпным, шпарка выйшла з двара, пайшла па вуліцы.

Вёска прачыналася. То тут, то там жоўта ўспыхвалі-загараліся вокны, з каміноў роўнымі слупамі ўставалі дымкі, цягнулі ў неба. «На пагоду»,— падумала. У душы, невядома адкуль узялося, заварушылася раптам

няяснае, кволае адчуванне трывогі. Ульяна не хацела яго заўважаць, старалася думаць толькі аб тым, што рашылася зрабіць, дзеля чаго йшла. Але трывога расла, і Ульяне здалося, што ідзе яна ад гэтых ажыўшых вакон, ад гаркавага паху сівых дымоў і яшчэ нечага, няўлоўнага, да болю знаёмага. Старая прыпынілася, на поўныя грудзі ўдыхнула празрыстае, ранішняе паветра... Забіваючы ўсе пахі, заказытаў ноздры, паплыў, здавалася, у самае нутро саладжавы пах свежага мурагу. Ёй здалося, што плыве ён адусюль, сцякаецца, ціснецца да яе ў грудзі, калышацца там і яна вось-вось захлынецца ім, салодкім, вязкім. Адчула, як цесна становіцца ў грудзях сэрцу, як яно, не месцячыся, тугім, гарачым клубком падкацілася к горлу, трапечацца, не дае дыхаць. Нічога не бачачы, патыкаючыся, пайшла па храпістай, няроўнай дарозе.

* * *

Тое, што гэту восень ёй сена не будзе, Ульяна зразумела без слоў, як глянула толькі на цыбатага мітуслівага Шурку, што размяраў на працэнты апошні клінок Заброддзя. Не карыстаючыся меркаю, шырока вымахваючы доўгімі нагамі, бегаў туды-сюды, раз-пораз згінаўся, каб піхнуць у зямлю надпісаны, завостраны калочак.

На Ульяну не глянуў, не павітаўся, толькі яшчэ шпарчэй замахаў нагамі. Хоць па гэтай яго няўвазе і адчула, што ёй не намераў ні соткі, усё ж рашылася падысці, запытаць. І калі перастаў той урэшце матляцца па сенажаці і папраставаў на мяжу, да матацыкла, пайшла напярэймы. Дайшла першая, чакала. Падышоў засопшыся, счырванелы, гледзячы ўбок, коратка кінуў:

— Што скажаш, цётка?

— А ты не ведаеш, што скажу? — адказала таксама запытаннем.— Дзе намераў мне, Іванавіч, і коль-

кі, знаць хачу.— Дарма старалася заглянуць яму ў вочы, ён упарта адводзіў свае, хаваў іх, як намагаючыся штось выгледзець на тым клінку, што толькі-толькі размераў. Які з час маўчаў, урэшце глянуў на яе, сказаў цвёрда, як адрэзаў:

— Нідзе не намераў, цётка. Няма цябе ў спісах сёлета. Пенсіянерам даём толькі тым, хто буракі браў. З вясны цябе папярэджваў. Не паслухала. Не ўзяла.— І адвярнуўся, даючы зразумець, што размова скончана, нахіліўся над матацыклам, зашоргаў нагою, спрабуючы завесці.

Яна стаяла як аглушаная гэтымі яго довадамі і слухала, як паўстае ў душы крыўда, нязгода, як хочацца ёй спыніць яго, даказаць яму сваю праўду. Перасільваючы ўтрапенне, праганяючы даўкі камяк крыўды, загаварыла адрывіста, рэзка:

— Стой. Паслухай. Паслухай мяне цяпер. Да якой жа ж пары буракі табе браць буду, га? Каторы гадочак на пенсіі ўжо. Пакуль рукі не злажу, во гэтыя — глядзі,— адарвала ад матацыкла, тыркванула ў самы твар — худыя, спрацаваныя, учарнелыя. Ад нечаканасці Шурка адхіснуўся, чамусьці шэптам прамовіў:

— Здурнела баба. Дальбог. Я не... Я ні пры чом. У кантору ідзі. Да начальства. Што ж... Там рашаюць... Я...

Яна ўжо не слухала. Адвярнулася, пайшла паволі, напрасты, па някошаным, адно чуючы, як падступае, падкочвае к самаму горлу той пякучы і даўкі камяк і рэжа, засцілае вочы гарачыня. Як ладна ўжо адышлася, пачула — залапатаў, панёсся па мяжы матацыкл.

Здалося, цяпер зноў вярнулася да яе тое цяжкое, дасюль не даказанае, прыплыло з таго цёплага дня ранняй восені разам з салодкім пахам мурагу, вярнула ў душу горкую крыўду. Тут жа падумалася, што каб тады, восенню, намераў ёй Шурка хаця з пяць сотак сена, то астатняе яна абавязкова расстаралася б, па

жмені, а сабрала б на карову. Не, дык прыкупіла б які дзесятак пудоў. А так што ж. Рукі апусціліся, упершыню за жыццё адчула няпэўнасць у сабе, у сваіх сілах. Хадзіла як сама не свая. Душа ні да чаго на свеце не гарнулася. Пакуль акрыяла, людзі ўсё павысяноўвалі, і каб хацела, то ўжо жмені нават нідзе не ўкасіла б. Змірылася неяк тады з думкаю, што прадасць Саколку, што зробіш. Жывуць жа людзі і без каровы, і нічога... здэцца.

Ульяна схамянулася, убачыла, што стаіць ужо катора пара пасярод вуліцы, і толькі наважылася ісці далей, як змеціла, што сцежкаю з загумення нехта ідзе сюды. Прыгледзелася. Шырока ў бакі раскідваючы ногі і рукі, так, што, здавалася, дастае імі да платоў, глыбока на вочы насунуўшы шапку, моцна сутулячыся, проста на яе шыбаваў Мазюк. Ульяна адразу адчула, што ён нечым моцна разнерваваны, саступіла ўбок, стала чакаць.

Мазюк параўняўся ўжо з ёю, але не падняў нават галавы, як не бачыў. Тады яна зачапіла яго сама:

— Паўлючок, пастой...

Ён, як натыкнуўшыся на што, аж хістануўся наперад, прыпыніўся:

— Ну...

— Куды ты так размахаўся?

— Куды, куды,— ён укалоў яе злым позіркам невялікіх, глыбока пасаджаных вачэй, што ваўкавата выблісквалі з-пад памятага брыля старой шапкі.— З кароваю трасца нейкая. Каторы дзень во да жолаба не падходзіць. Вады й тае не п'е.

— З каторاю? — Ульяна падступіла бліжэй да яго.

— З каторاю, з каторاю...— Паўлюк раздражнена перасміхнуў яе.— З тою, што ў цябе купіў.

— А божачка,— кабета рукамі спляснула.— А Паўлючок ты мой, а я ж гэта сярэдначы падхапілася, як душа чула. Прыснілася яна мне сёння.

— А-а-а,— Паўлюка аж закалаціла, і калючыя вочы яго зноў нядобра пранізалі Ульяну.— То ж бо я і думаю, што ж бо магло стацца. А яна — на табе — сніць, шкадуе... Цьфу, каб ты згарэла — снілася. Ужо карова сніцца.

— Паўлючок, пачакай. Чаго ты распырхаўся, паслухай,— Ульяна кранула яго за гладкае, зашмальцаванае рукаво старой ватоўкі.— Паўлючок...

— Паўлючок, Паўлючок... Звяжыся з дурною бабаю,— ён рэзка крутануў локцем, адкідаючы Ульяніну руку:

— Пусці во, пайду скарэй, каб дактароў захапіць на ўчастку, хай падыдзе каторы, паглядзіць. Калі нічога рады не дасць, то хоць на мяса здам. А то лясне тысяча, жартачкі табе.

Ізноў скрывіўся, пісклявым голасам передражніў:

— Паўлючок, снілася...

Ульяна, як не чуючы гэтай знявагі, раптам захвалявалася, крапчэй ухапіла Мазюка за рукаво:

— Пачакай, Паўлюк. І праўда, баба дурная: казала ж, да цябе іду... Гэта ж ці ведаеш...

Пачала непаслухмянымі, адубелымі рукамі расшпіляць ватоўку, залезла за пазуху, пашамоталася там і нарэшце выцягнула тугі, хрусткі вузельчык, торкнула ў вялікія, разгублена-нерухомыя Паўлюковы рукі:

— Во, тут усе 950 і яшчэ 10 накінула, што карміўпаіў гэтыя дні.

Паўлюк, не могучы, відаць, зразумець, што да чаго, стаяў і толькі лыпаў усё яшчэ злымі, няўцямнымі вачыма. Пасля нарэшце датумкаў і моцна сціснуў грошы, як спалохаўся, што Ульяна раптам перадумае, забярэ іх назад. Але ўсё стаяў, нерашуча перамінаўся з нагі на нагу, спрабаваў нешта мармытаць, як усё роўна апраўдваўся:

— Дак яно, ведаеш, неяк не так выходзіць, дак...

Яна нецярпліва-радасна перабіла яго:

— Ды што там, Паўлючок. Што там. Так яно ўсё добра выйшла. А то во я йшла і не магла прыдумаць, як гэта падступіцца да цябе, каб угаварыць, каб Саколку ты назад аддаў... Іду як не сваімі нагамі. І так і гэтак маракую. Знаю, што нядобра раблю: прадала, усё як мае быць. Думаю, скажуць людзі, здзяцінела. А тут так яно якраз выйшла... Не ад хваробы гэта, Паўлюк. Жывёла, яна таксама, ведаеш, смуткуе...

— Ну, прыдумала,— Паўлюк недаверліва, скоса глянуў на Ульяну. Памаўчаў, ніякавата кашлянуў, задумаўся.

Змоўкла і Ульяна, але ўжо доўга маўчаць і чакаць не магла: рупіла хутчэй пайсці да Мазюкоў, забраць сваю Саколку і дахаты. Як і што яно будзе ў хаце без жмені сена — не думала. Выкруціцца неяк. Пойдзе ў кантору, будзе прасіць. Паслухаюць, дзе яны дзенуцца. Дадуць які з воз, а рэшту — купіць. Не прападуць з Саколкаю...

Тым часам Паўлюкоў настрой рэзка змяніўся. Тая першая радасць, што збудзе з галавы клопат, аддаўшы Ульяне хворую карову, прайшла. Падумаў, што, можа, й праўду кажа старая — не прывыкла скаціна да новага месца. Смуткуе... Цьфу, але ж і выдумае. А зрэшты, трасца яе ведае, можа, й смуткуе, можа, й праўда нявартa спяшацца. Аддасі, а тады цягайся па рынках, шукай. А на рынку надта ты купіш добрае што. Гэта тут, у сваёй вёсцы, пры хаце, бачыш, што купляеш, а там... Хто хоча прадаць, ніколі не прызнаецца, што дрэнную продае. Ва ўсіх добрыя.

Паўлюк аж шапку з патыліцы ссунуў, галаву пачухаў:

— Ну, задала ты мне задачу. Чыста рак ты, Ульяна. То плакала нядаўна, што не насенавала, то ўжо раптам...

Нечакана раззлаваўся, зноў залапатаў, запырскаў слінаю:

— І прадавала, пэўна, шкадуючы, вот і не пайшла рукою...

— Паўлючок,— Ульяне аж дух забіла ад крыўды,— пабойся бога. Ці ж я дурная, ці малая — не ведаю, не першы ж гадок гаспадыняю. Колькі ўсяго за свой век перапродала і ад людзей благога слова не чула. Ведаю, што, барані бог, шкадаваць нельга. І не шкадавала. А вот што яна мне гэтак прыснілася... Як бачу, стаіць пад ганкам і, ці паверыш, голасам чалавечым кажа: «Нашто ты прадала мяне, Ульяна? Пражылі б мы з табою, пракарміліся б неяк...» І так, ты знаеш, за душу мяне ўзяло, што, не думаючы, схапілася сярэдначы і во, додніцы, да цябе.

Паўлюк заўважыў, як пачырванелі раптам Ульяніны вочы, адвярнуўся: вот баба дурная, яй-бо, як выдумае што...

— Дальбог жа, Паўлючок, за душою нічогенька злога не мела.

Голас у яе задрыжаў, яна змоўкла, махнула рукою, мусіць, вырашыўшы, што сказала ўсё сваё.

Паўлюк маўчаў таксама.

Падняўся моцны вецер, глуха зашумеў у старых бярэзінах, якімі скрозь была абсаджана вясковая вуліца. Па небе, засцілаючы чырвоную палосу ўсходу, пайшлі нізкія, шэрыя хмары.

«Снегавыя. Скора стане зіма»,— зазначыў сабе Паўлюк і заўважыў, што ўжо й развіднела як след, пакуль яны так важдаліся. Раптам неяк па-другому, зусім цвяроза падумаў, што дарма ён тут лапоча сам і слухае гэту старую, толькі час дарагі траціць. Рашуча засунуў руку ў кішэнь, выцягнуў адтуль Ульяніну насоўку з грашыма:

— На, баба, і галавы не дуры. Пайду барзджэй на ўчастак, знайду раду...

Ульяна, адчуваючы, як становіцца ёй раптам горача на гэтым пранізлівым ветры, рэзка адхіснулася:

— Не, не вазьму. І не думай. Цвёрда сказала. Не пайшла табе карова мая. Забяру я яе, Паўлюк. Яшчэ не дай бог траціцца — косці мае праклянеш.

І не зважаючы больш на яго, звярнула на загуменне, пайшла напрасткі да нізкай і доўгай Мазюковай хаты. Чула, як гулка бухаюць ззаду па голай, адубелай зямлі Паўлюковы кірзовікі, і ўсё прыбаўляла хады. Не хацела, каб дагнаў яе, нядобра пра яго думала: «Чорт ненажэрны... Удваіх з жонкаю і каб дзве каровы трымаць. Шурку ўсё лецечка ў гарэлцы мачыў, калгаснае начамі вашкаваў, як не кончыўся, а як прасіла, напрамілы бог, каб хоць воз сена прадаў з восені — дзе там! Ну, то во, маеш. Забяру Саколку, на чым бы то ні стала».

І ўжо калі ступіла на Мазюкоў надворак, каля самага хлява, здалося, зноў пачула саладжавы, з гаркавінаю, пах свежага мурагу.

За ноччу раніца

Ноч набліжалася ад бору. Няспешна вылазілі з лесу першыя вечаровыя цені, збіраліся, тоўпіліся на невялічкім папары, затым паволі, як крадучыся, сунуліся да Андруковай сядзібы, што ляпілася на самым краі папару непадалёк ад бору.

Цені ўсё гусцелі, зліваліся ў густую завесу шэрага зімовага змроку. Лес, здавалася, наблізіўся да самай хаты і прыпыніўся насцярожанаю жывою сцяною.

Ноч ступіла на падворак, гаспадарліва папрычыняла вароты, нячутна зайшла ў хату. І ўжо там стаілася, моўчкі пазірала з усіх кутоў сваімі змрочнымі вачыма.

Андрук доўга варочаўся, масціўся бліжэй да кафлянкі, уздыхаў. Яму ўсё не хапала цяпла. Тупа ныла, мусіць, на перамену надвор'я, скалечаная нага. Яго гаспадыня ўсю зіму спала на ложку, прысунутым да самага акна. Было чуваць, як колькі разоў крэкнуліўздыхнулі спружыны пад ёю, як ужо праз сон мармытнула яна і тут жа засапла спакойна і роўна.

Добра прыгрэўшыся, урэшце звёў вочы і Андрук. Ці то печка звечара была занадта напалена і перагрэла гаспадара, ці то сапраўды на перамену надвор'я круціла скалечаную нагу, але спаў ён цяжка і нядобра.

Сніўся Андруку далёкі і страшны Швабмюнхен. Лазарэт для ваеннапалонных. Ён, Андрук, ляжыць на доўгім стале, і белае, сляпучае святло электрычнай лямпкі б'е яму ў вочы. Ён хоча засланіцца, але раптам святло слабее, над ім схіляецца гарбаносы твар у акулярах. Рэзкі боль працінае ўсё цела і мільгаціць, скача

ў вачах вогненнымі матылямі. Андруку здаецца, што нагу яго рве гайня аўчарак. Ён чуе, як тузаюць яны яе сюды-туды, кожная цягне сабе, у свой бок. Ён стогне, намагаецца падняцца, але цела цяжкае, няўладнае, рукі і здаровая нага прыкуты да стала. Нечакана боль адпускае: Андрук чуе прарэзлівы смех і голас. Ён бачыць усё той гарбаносы твар у акулярах. Шчэрацца доўгія белыя зубы, здаволена прыцмокваючы, варочаецца між імі язык. Андрук ведае ўжо, што гэты немец — доктар, ведае і яго прозвішча — Венер. Венер гаворыць, што Андрук — шавец, што ён будзе ўсё жыццё рабіць ім, немцам, боты. Кожнаму па два, а яму, Андруку, ад сённяшняга дня патрэбен толькі адзін. Якраз гэта вельмі радуе Венера. Андрук адварочвае галаву, каб не бачыць ашчэранага, ненавіснага твару, але як бы ён ні стараўся, доктар усё перад ім. Страх працінае ўсё нутро. Андрук намагаецца крыкнуць і тут жа ўсхопліваецца, сядае на ложку.

Ноч са свайго кута назірае за ім. Бачыць даўно не голены, хваравіта апушчаны твар, разгублены позірк наздзіў блакітных вачэй. Андрук узнімае рукі. Яны абвялікія, з вузлаватымі, пакручанымі пальцамі. Ён абхоплівае і ўсё мацней сціскае сівую, растрэпаную галаву, нават круціць ёю, гоніць ад сябе прывід доктара Венера. Таго Венера, што ў далёкім Швабмюнхене дваццацігадоваму хлопцу з такою асалодаю адпілаваў нагу. Венер, бліскаючы напаследак акулярамі, адступае. Але Андрук ужо не можа адбіцца ад успамінаў. Яны плывуць і плывуць, як бы толькі й чакалі гэтага моманту. Паддаючыся іх уладзе, Андрук напружана ўглядаецца ў тое сваё далёкае, перажытае. Ён бачыць маёнтак Люхвальд. Шырокі двор пры доўгім, з чырвонай цэглы будынку. Бачыць сябе сярод гэтага двара на чорным шавецкім крэсле. Андрук сядзіць, выцягнуўшы нагу, якая ўжо амаль загаілася пасля ранення, правіць абутак. Праз двор, проста да яго, шыбуе стары, даўгавязы не-

мец — гаспадар маёнтка. Андрук адчувае на сабе позірк яго круглых, вадзяністых вачэй, на момант узнімае голаў. У выцягнутай руцэ гаспадар трымае паперу, другая, сагнутая, схавана за спінаю. Нядобрае прадчуванне сціскае, халодзіць Андрукова нутро.

Немец рэзка спыняецца каля яго, доўга маўчыць, упёршы ашклянелыя, як у нябожчыка, вочы ў самае цемя Андруковай галавы. Андрук ляпае і ляпае па старой, вынашанай падэшве, заганяе невялічкія драўляныя цвікі. Тонкаю, ледзь бачнаю стужачкаю ўзнімаецца ад падэшвы, залаціцца на сонцы пыл. Рукі не слухаюцца Андрука, дранцвеюць. І тут жа на яго калені, на выцерты шавецкі фартух кладзецца разгорнутая паперка. Андрук доўга ўглядаецца ў яе, і паступова даходзіць да яго сэнс напісанага. Ён здагадваецца, што гэта пахавальная. На трэцяга, значыць, гаспадаровага сына ўжо. На двух першых гаспадар атрымаў, калі яго, Андрука, тут яшчэ не было. Ён толькі бачыў іх фатаздымкі ў чорных рамках. Лёгкая ўсмешка нечакана набегла на сухія Андруковы вусны. Ён забывае, што стаіць над ім вораг, бацька забітага ворага, і паднімае апушчаную галаву. Няўцямныя, ашклянелыя ад гора вочы заўважаюць гэту ўсмешку, страшны сэнс яе даходзіць да свядомасці немца, сцірае з яго вачэй мутную павалоку гора. Сагнутая за спінаю рука выпростваецца, і ў ёй заўважае Андрук чорны вальтэр.

Круглае вочка пагрозліва глядзіць на яго, напружаным маўчаннем лепш за ўсякія словы гаворачы адно: канец. Не. Не. Толькі не смерць. Андрук не вытрымлівае: парывіста кідаецца са свайго шавецкага крэсла, падае, хрыпіць, не могучы ў адчаі сказаць ніводнага слова. Рэзкі ўдар у правую пашчэмку. Андрук глуха стукаецца галавою аб ножку крэсла. Пасля з цяжкасцю разнімае павекі, бачыць насцярожаны, ліхаманкавы бляск ашалелых гаспадаровых вачэй, увесь сціскаецца.

Немец апускае ўзнятую руку. Яго тонкія, бяскроўныя вусны выцягваюцца ў грэблівай усмешцы. Ён доўга думае. Нарэшце вырашае, што смерць будзе вельмі нязначнаю платаю за гібель трох яго хлопчыкаў. Позірк халодных вачэй упаў на Андрукову бездапаможна выцягнутую нагу. На скамянелым твары мільгнуў адбітак раптоўнай думкі. Узнятымі вачыма Андрук сочыць, як паступова мяняецца гаспадароў твар, намагаецца абаперціся на локці, прыўзняцца, але не паспявае. Востры, нечалавечы боль шугануў раптам ад параненай нагі, працяў усю істоту, імгненным рыўком распластаў Андрука на зямлі.

«Айн Зоон»,— глуха прагучала над ім. Другі стрэл — яму здалося, што, сарваўшыся, ляціць ён у чорную, страшную бездань. Дзікі крык вырваўся з грудзей. Заглушаючы гэты крык, яшчэ больш дзіка прагучала над ім: «Цвай Зоонэн».

Трэцяга стрэлу Андрук не чуў, не чуў і помслівага шэпту: «Драй Зоонэн...»

Глухі стогн вырываецца з Андруковых грудзей, і ён баязліва азіраецца, абводзіць вачыма ўсе куты цёмнай хаты, як баючыся, што нехта нябачны пачуе яго думкі.

У хаце ціха і цёмна. Роўна сапе каля акна жонка. Андрук услухоўваецца ў глыбокае, з лёгкім прысвістам дыханне. Яму здаецца, што жонка не спіць, толькі прыкідваецца, а сама ўсё чуе і бачыць. Халодны пот выступае на твары, на шырокіх, як лапата, далонях. Тупым болем абзываецца левая кукса — адзіны сведка перанесеных пакут. Андруку здаецца, што ўжо не будзе канца гэтаму болю, не будзе канца растрывожанай, пакутна-неадчэпнай памяці.

Перажытае паўставала перад вачыма яскрава, як было яно толькі ўчора. Андрук, не паспяваючы нават здзівіцца гэтаму, зноў і зноў адыходзіў ад рэальнасці, захліснуты новаю хваляю ўспамінаў. Як паратунак,

даходзіў аднекуль здалёк, праз напластаванні часу, голас маці: «Сынок, сыночак мой». Андрук бачыць, як схілілася яна над ім, старая, нямоглая, і абдымае, туліць да сябе, супакойвае: «Гэта ж трэба, сынок, як жа ты так забыў, як...»

Тады, у першую раніцу пасля палону, прачнуўшыся ў роднай хаце, ён забыў, што калека, што без нагі, і ўсхапіўся, скочыў з ложка, як бывала да вайны, абуджаны матчыным голасам. Скочыў і ніцма распластаўся на падлозе. Ляжаў і ўпершыню за ўсе пакутныя гады плакаў ад бяссілля, болю і роспачы. А маці, не ведаючы, чым і як суцешыць яго, сказала тое, што і цяпер агнём паліць яму нутро: «Ты ж ваяваў, сынок. Як усе. І жывы, дзякуй богу, вярнуўся...»

...Яны тады асталіся ўдвох з цэлага ўзвода. Ён, Андрук, і зямляк яго — вясёлы, чорны як смоль Іван Чыгункоў, або проста Чыгунок. Яны ўдвох і дзве гранаты. Так і ляжалі з тымі гранатамі сярод чыстага поля, з рэдкім чубком нізкарослага ялаўцу, сяк-так прыхаваўшыся за шырокім, пляскатым каменем. Чакалі, пакуль падсунецца бліжэй шчыльны ланцуг гітлераўцаў. Трэба было затрымаць іх хоць на нейкі час. Але што, што яны маглі супраць такой навалы? І ўсё ж чакалі. Моўчкі, думаючы кожны аб сваім. Аб чым думаў тады Чыгунок, хто яго ведае, але павярнуў пасля галаву, цвёрда сказаў: «Ты тут астанешся, за каменем, як мага бліжэй падпусціш, а я раней іх стрэну, унь за тымі кустамі. Так мы іх даўжэй затрымаем». Андрук не пярэчыў, адно адчуў раптам, як стала ўнутры да нематы пуста і холадна.

Ці то адчуваючы яго стан, ці яшчэ з-за якой прычыны, але доўга, дапытліва глядзелі на яго перад развітаннем чорныя ўсмешлівыя вочы Чыгунка. Андруку здалося, што й цяпер, праразаючы цемру часу, глянулі яны проста ў душу, і балюча сціснулася, трывожна затахкала ад пагляду таго сэрца. Ясна, як чутыя ўчора,

прагучалі ў памяці словы: «Бывай, не марудзь толькі». Яшчэ раз бліснулі на развітанне цыганскія вочы, узнялася над галавою моцна заціснутая ў руцэ граната, паплыла насустрач мышастым, прыгнутым постацям.

...Слуп агню і дыму асляпіў Андрука. Ён моцна заплюшчыў вочы, а калі расплюшчыў іх, на месцы тым сіне дымілася яма. У адно імгненне ён усхапіўся на ногі і, то падаючы, то зноў узнімаючыся, кінуўся прэч, прэч ад гэтага каменя, ад гэтай страшнай, варожай лавіны. Кароткая чарга ўдарыла ззаду, і ён, у той самы момант адчуўшы, як пякуча зайшлося, пацяжэла левае сцягно, ніцма ўпаў на зямлю.

...Ноч, пасвятлелымі на золку вачыма, угледзела, як спусціў чалавек з ложка здаровую нагу, доўга шамотаўся каля печкі, а пасля, згорблены, белы, парываючы пратэзам, пайшоў да стала, адчыніў шафу, дрыжачымі рукамі выняў адтуль шэрую скрыначку. Пакаціліся па стале, заблішчэлі на абрусе медалі. Андрук сутаргава браў іх, падслепавата ўглядваўся і адкладваў, каб пасля зноў узяць у дрыжачыя, скурчаныя пальцы, паднесці да самых вачэй і глядзець, глядзець. Медалі былі пасляваенныя, ручаныя яму ў дзень дваццацігоддзя Перамогі, у дзень трыццацігоддзя... Ён атрымліваў іх на ўрачыстых мітынгах, у калгасным клубе, прыносіў дахаты і клаў у гэту шэрую скрыначку, хаваў у шафу. Ніколі нікому не паказваў Андрук сваіх узнагародаў, ніколі не даставаў іх з шафы. А цяпер во... «Ты ж ваяваў, сынок. Як усе. Жывы, дзякуй богу, вярнуўся...» Андрук уздрыгнуў. Рукі міжволі пацягнуліся да стала і застылі... Адчуў, як усяго яго зноў захліснула трывога. Дамешваючыся да яе, няпрошана палез у душу страх. І Андрук раптам зразумеў, што і трывога гэта і страх ішлі не з таго далёкага мінулага, якое так пакутна ўспаміналася яму сёння, а былі яны нядаўнія, толькі што перажытыя.

Ён павёў вачыма па хаце раз і другі, як шукаў усё роўна прычыны гэтага свайго неспакою, але, не знайшоўшы, упарта варочаўся позіркам да стала, дзе на абрусе ледзь прыкметна блішчэлі, адсвечвалі ад акна медалі. Нечакана зразумеў, што менавіта яны непакояць, трывожаць яго. Першы раз за ўсю бяссонную ноч успомніўся раптам аднарукі Ігнась. Успомніўся да драбніц увесь той майскі пахмурны дзень, калі яны нечакана сустрэліся. І трэба ж было якраз у той дзень ім сустрэцца. Столькі часу абыходзілі, абміналі адзін аднаго, а тут — нос у нос...

Яшчэ калі Андрук толькі з палону вярнуўся, маці казала яму, што незадоўга прыходзіў з Каваліч чалавек без рукі, вайсковец, пытаў, дзе Андрук, ці чутно што ад яго. Яна сказала, што нічога не чула пра сына, а ён адно толькі слова кінуў, як адыходзіў: «Пачакаем...»

Потым усё ж прыйшоў да Андрука. Сядзеў каля стала, лоўка круціў адною рукою тоўстыя самакруткі, пускаў едкі сіні дым на хату. Усё распытваў пра той апошні бой. Андрук тады яму нешта блытана расказваў і так і не запытаў, не рашыўся, адкуль ён ведае, што Андрук быў там, пад Чавусамі. Чалавек, або, як ён назваўся, Ігнась, пайшоў, і яны пасля таго доўга не бачыліся. Кавалічы былі за дзесяць вёрст адгэтуль. Потым, па часе ўжо, бывала, сустракаліся, але, як усё роўна не пазнавалі адзін аднаго, праходзілі не вітаючыся. А тут — нос у нос, каля магазіна. Андрук ад нечаканасці спыніўся. Стаў і Ігнась. Быў ён чыста паголены, паднядзелены. І Андруку раптам стала няёмка за свой замызганы выгляд — толькі выкідаў з хлява гной, за свой няголены твар. Ігнась як зразумеў гэту яго няёмкасць і, замест прывітання, спытаў:

— Не святкуеш?

Андрук толькі цяпер заўважыў, што на Ігнасевых грудзях зіхцяць да бляску начышчаныя медалі, і яшчэ

больш сумеўся. Стаяў і глядзеў, не могучы адвесці вачэй. Медалі былі не такія, як гэтыя, што цяпер ляжаць у Андрука на стале. Іншыя. Ён спахапіўся, адчуўшы, як уважліва сочыць за ім Ігнась, падняў вочы. Іх позіркі сустрэліся. І Андруку на нейкае імгненне здалося, што гэта Чыгунковы чорныя вочы глядзяць на яго. Забіла дух ад такой нечаканай згадкі, і ён ухапіўся рукою за штыкеціну, пабялеў.

— Дык, значыцца, не святкуеш? — пачуў Ігнасеў голас, вярнуўся да памяці.— А я, думаю, дай зайду. Паседзімо. Вып'ем. Прыпомнім, як яно тады было ўсё... Вот і пляшачку ўзяў.— Андрук і праўда заўважыў, што з кішэні ў Ігнася тырчэла жоўтая галоўка «Рускай», не ведаючы, што рабіць, што сказаць, толькі пакруціў галавою.

А той усё гэтак жа паволі, расцягваючы словы, як усё роўна здзекуючыся, гаварыў далей:

— Ну, не бойся, не бойся. Не буду адбіраць у цябе часу. Бачу — заняты. Не святкуеш. То неяк другім разам зайду. Паталкуем. Прыпомнім...

Андруку тады хацелася крыкнуць, запытаць: што прыпомнім, што... Але ён, як і раней, маўчаў. Як анямеў.

Цяпер стала да роспачы цяжка і крыўдна. За што ўсё гэта? За што? Захацелася, каб у адзін міг знікла ўсё: і вайна, і аднарукі Ігнась, які невядома чаго чэпіцца да яго, і ён сам, Андрук, даўно абрыдлы сабе і гэтымі снамі, і гэтым страхам, і ўсім тым, што сядзіць у ім і мучыць. Каб усё знікла, усё... Каб нікога і нічога...

Ноч нячутна выходзіла з хаты, пакідаючы сагнутую постаць над цёмным сталом. Ленаватая зімовая раніца няспешна заходзіла на Андрукоў падворак, сваім белым святлом улівалася ў акно, і ў гэтым святле неяк асабліва трывожна блішчэлі на абрусе медалі. Андрук, як не могучы больш глядзець на іх, згроб ме-

далі ў шэрую скрыначку, прыўзняўся, схаваў яе зноў у шафу.

Доўга стаяў, здавалася, не могучы выбіцца з нейкага цяжкага одуму, а пасля скалануўся, пасунуўся ў куток, сцягнуў з цвіка ватоўку, накінуў на плечы. Стараючыся не стукаць, паступіўся на палок, зняў са сцяны стрэльбу, прыслухаўся. Уздыхала ў сне жонка. Раптам захацелася, каб расплюшчыла яна вочы, загаварыла да яго, хоць што-небудзь запытала. І тады б ён ёй расказаў пра ўсё, аб чым думаў цэлую гэту ноч, што цяжкім каменем ляжала на душы ўжо колькі гадоў і ў чым ён нікому, нават ёй, за ўвесь гэты час так і не змог адкрыцца...

Андрук кашлянуў, пераступіў з нагі на нагу, але Франя толькі перавярнулася на другі бок і зноў засапла спакойна і роўна. Горка падумалася, што нікому на гэтым свеце няма справы да ягоных пакут і думак. Нікому...

Павалі клыпаючы, Андрук падаўся з хаты.

Глуха маўчаў прысыпаны снегам лес, папіскваді, прачнуўшыся, у застрэшку вераб'і. Мароз ледзянымі пальцамі лез пад расхрыстаную ватоўку, здзекліва казытаў, пашчыпваў цела. Андрук спахапіўся, пачаў зашпільваць гузікі, а пасля адумаўся: цяпер яму ўсё роўна. Ад гэтай думкі сціснулася сэрца. Ён раптам убачыў, як стаіць адзінокі, расхрыстаны, без шапкі, сярод заснежанага пустога двара, спакутаваны і бездапаможны чалавек. Пякучая сляза, стынучы і ліпнучы да нягоэенага зморшчанага твару, пакацілася з вока.

Ён глыбока ўздыхнуў, здрыгануўся ўсім целам, пастаяў, прыслухоўваючыся да сябе, і паволі, як бы раздумваючы, пасунуўся ў хату. Ужо на ганку няўцямна глянуў на балюча прыліплы да далоні ствол паляўнічай стрэльбы, прыпыніўся. Ахалоджваючы разгарачаную галаву, цвяроза і ясна мільганула: «Калі ўбачыць Франя, скажу, што выў каля хаты воўк».

Лёгкі хлеб

— Ты чуў, стары? Гэлька Камарыха гармонік купіла,— яшчэ не пераваліўшыся цераз парог, сказала Антосю яго кабета.

— Ну? — не адрываючыся ад сталяркі, азваўся Антось.

— «Ну». Табе ўсё «ну»,— зачыніўшы дзверы і скідаючы ватоўку, папікнула Алена.

— Каму купіла? — Антось чэркнуў апошні раз па дошцы алоўкам, падняў ад варштата галаву.

— Каму, каму. От пень стары, сабе купіла, каму ж яшчэ! Камарыхі не ведаеш?

Антось няўцямна паглядзеў на сваю бабу. Яна ж, бачачы, што да яго ўрэшце дайшло, зарагатала, аж закалыхаліся вялікія, пад бараду, грудзі. І ўжо праз смех вымавіла: «Музыкантам будзе. Па вяселлях хадзіць. Хлеб, кажа, лёгкі: і пап'еш, і паясі, і грошы заплацяць...»

Не ўтрываў, засмяяўся і Антось, добра ўявіўшы малую, худзенькую Гэльку пад цяжкім, як паваладаць, гармонікам.

— О, і трэба ж гэта, ты толькі падумай,— адсмяяўшыся, разважала Алена.— Паехала сёння ў горад і прыперла. Вялізны такі, сіне з чырвоным. Кажа, усе грошы аддала. Трыста рублёў, ці што. Дастала з нейкага чамаданчыка такога чорнага, знарок пад гармонік, усцягнула на калені і давольная сядзіць, аж свеціцца. Бяды тае, кажа, што граць не ўмею, заўтра вучыцца буду. Пакруціла, пагладзіла гармонік гэты і ўзваліла на ложак.

Антось зноў засмяяўся, высока закідваючы белую, вялікую, што качан, галаву:

— А, каб цябе з бабаю. А хто ж яе вучыць будзе?

— Сама, кажа. Як бацька калісьці, Камар стары — праз сябе. Галасы падбіраць. І на гармонік тут жа.

— Хіба як бацька.— Антось нечакана спахмурнеў, заўлаваў.— Рабіць ёй няма чаго. Бульбу вунь капаць зачалі, а яна зноў выдумкамі займаецца. Людзей усё жыццё смешыць. І не абрыдне бабе! Гады ўжо, сівець пачала, а горш дзіцяці. Цьфу ты! — Сплюнуў злосна, звёў сівыя, кусцістыя бровы, схіліўся зноў над варштатам.

Алена як анямела ад нечаканай мужавай злосці, але тут жа апомнілася, напусцілася на яго крыўдліва, абурана:

— Табе што? Табе чаго баліць гэта? Хай смешыць. Сваячка яна табе, ці што? Абыходзіць яна табе ўсё жыццё, смыліць табе стрэмка гэтая.

Антось не абзываўся, як не чуў. Угнуўшы галаў, круціў у руках абгабляваную дошку, прыкідваў на вока, ці роўна адрэзаў, чэркаў па краі алоўкам. Алена не адыходзіла, тапталася ззаду, цяжка дыхала, перакідвала, соўгала па пліце гарнушкі, знарок моцна ляпала засланкаю.

Ён нечакана павярнуўся да яе, спакойна, як і не было злосці, сказаў:

— Шкода яе, Алена. Якое там сваяцтва, жывем лічы што разам з малых гадоў. На вачах усё. Жыццё ў яе, знаеш сама, не злажылася...

Алена стаяла застыўшы, няўцямна моргала круглымі, без веек, вачыма, толькі паторгваліся моцна сцятыя вусны. Антось не дагаварыў, змоўк, адвярнуўся. І тады яна як апомнілася, заверашчала тонка, захліпіста, не разабраць:

— То ж праз цябе ў яе не злажылася, праз цябе! Усе ж ведаюць. Чаму ж, чаму ж ты ёй не злажыў?

Курыцы гэтай чорнай, абшчыпанай. Стрэмцы гэтай сухой, каб яна ўшчэнт высахла, як душу яна маю каторы ўжо гадочак сушыць. Чаму ж не прыняў ты яе, як прыходзіла да цябе сярэдначы, у кашулі сподняй, чаму ж не прыгрэў, не пашкадаваў, як цяпер шкадуеш? Адправіў, за мяне ўхапіўся. За багатую. На зямельку маю паквапіўся. Ажно не спатрэбілася. Саветы зайшлі. Не пацешыўся. Нуда цябе ела, бачыла я, сэрца маё чула, што даравацъ ты сабе не можаш. Усё жыццё песні яе слухаць выходзіў...— І зайшлася ад крыўды, закалыхалася — мажная, высокая, у злосці сваёй непрыступная.

...Тое, што Гэлька Камарыха купіла гармонік, да вечара стала вядома ўсёй невялічкай Гаранёўцы. Бабы, згаладалыя па навінах, закідаліся да яе то штонебудзь пазычыць, то аднесці пазычанае, а ўсё з тым, каб на свае вочы пабачыць той гармонік і найпершае — даведацца, на якую ж патрэбу прыдбала яго Камарыха. Няўжо такі й праўда ў музыкі пойдзе пад старасць?

Сама Гэлька ні ад каго не хавала свае радасці, з ахвотаю тлумачыла цікаўным кабетам усе выгоды свайго новага занятку.

— Вот, бабачкі мае, зажыву...— казала нараспеў, пабліскваючы чорным вокам то на адну, то на другую суседку.— Гэта ж вяселлі во як пойдуць, а музыкантаў у наваколлі мала, толькі й будуць гадзіць мяне... А што ж, я вунь у пляменніцы свае гуляла на вяселлі, дак там маладзіца адна на цымбалах, каб чулі, як хораша. За душу бярэ.— І крыху перадыхнуўшы, Гэлька кідала свой апошні козыр, перад якім, ведала добра, гаранёўскія кабеты не ўстояць:

— Гэта ж во, за адно вяселле, любкі мае, сотні паўтары заграбеш. Месяц на кароўніку таптацца трэба, каб такія грошы мець. Дак не раўняць жа, што на вяселлі ў людзях пабыць, а што на ферме гной мясіць...

Петрачкова Маня, якая рабіла даяркаю, не стрывала:

— Ну, ну, разышлася, мілая, нагуляеш ты па вяселлях, як кінуць усе гной мясіць.

— Я ж не пра ўсіх, Манечка,— лагодна не згадзілася Гэлька,— я ж пра сябе талкую. Цябе ў гармапісты не заву, з фермы не пераманьваю, не бойся, трэба ж некаму й гной мясіць...

Гэльцы не дала дагаварыць, разважліва падтрымала Маню старая маўклівая Адаміха:

— Праўда, Манечка, праўда. Дзе-та, дзетачкі, відана, каб баба хадзяйства кідала і ў свет з гармонікам ішла. Я дак такога шчэ на сваім вяку не бачыла.

— Ат, цётка, шмат там цётка чаго бачыла,— зноў не сцярпела Гэлька.— За гаранёўскім лесам і то не была. Пражывеш во так, як на свінні праедзеш, нічога людскага не ўбачыш, не аглянешся — паміраць пара. Дзеля чаго жыў, дзеля чаго біўся як рыба аб лёд, сам не ведаеш. Не хачу я так, хоць напаследак пажыць трэба як чалавек, у людзях пабываць, людзей і сябе павесяліць. А грошы... Халера з імі. Няма дзеля каго мне панчоху набіваць.— Гэлька задзірыста зарагатала, акінула бабаў чорным бліскучым паглядам, весела, адчайна махнула маленькаю рукою.

Адказаць Гэльцы ніхто не паспеў. Цяжка сапучы, у хату ўвалілася Антосева Алена. Спынілася ў парозе і, як чаго шукаючы, вадзіла па хаце вачыма. Урэшце згледзела на ложку гармонік, крута павярнулася да Гэлькі, якая ўсё яшчэ весела блішчала вачыма і неяк неўразумела, здзіўлена глядзела на раз'ятраную суседку.

— Гармонічак, кажаш, купіла, пяюха, цешышся ўжо? — Алена не гаварыла, а сіпела, як сытая гуска, і ўсё бліжай падступала да Гэлькі.— Любошчы мінулыя прыпомніліся? Вечарыны гаранёўскія вярнуць зажадалася?.. Думаеш, як пры бацьку хвастом кру-

ціць будзеш, гэтак выспеўваць і вытанцоўваць, галовы чмурыць гэтай сваёй,— Алена раптам крутанулася да знямелых бабаў і, засланіўшы Гэльку шырокаю, як лава, спінаю, завяла нечакана тонка, з надрывам: «Канарэ-е-чка, дробна пта-а-шачка...» — Гэта ж, бабачкі, сколькі я з-за «канарэечкі» тае слёз выліла — ніхто не знае. І глядзі ты, зноў пачынаецца, зноў яна за сваё ўзялася. Ну, не. Дудкі. Цяпер-та я ўжо плакаць не буду. Калі што якое, то як хаплю музыку гэту — трэскі пасыплюцца. Мінулася бабіна лета.— Алена пагрозліва ступіла да ложка, але тут жа раздумалася і зноў, трацячы голас, засіпела:

— Да каб жа ж праўда яна пра рубель той дбала ды дзеля заробку гармонік гэты купіла. Хата ж во ад ветру валіцца,— Алена павярнулася да змярцвелай у нерухомасці Гэлькі, дадала ўжо спакойна, упэўнена: — Глядзі, заверне калі з гармонікам разам — не піснеш. Хоць на падпоры зарабі, весялуха. Досыць ты ўжо людзей павесяліла...

На які час усталявалася ў хаце цішыня. Было чуваць, як надаедліва звінела, білася аб шыбу галодная расенняя муха. Бабы ніякавата маўчалі, а пасля ўсе разам заварушыліся, бы толькі-толькі ўспомніўшы нейкі неадкладны клопат, хуценька зазбіраліся з хаты. Упершыню за гэты дзень не знайшла што сказаць Гэлька. Прыбітая Аленінай злосцю, моўчкі глядзела ў акно, чуючы, як перасядае ў горле даўкі камяк, не дае дыхаць...

Даўно ўжо сцямнела. На небе адна за адной успыхвалі зоркі, насупроць акна выплываў з-за хмары ціхі месяц. На зямлю апускаўся светлы асенні вечар. А Гэлька ўсё сядзела здранцвеўшы, нерухома, усё слухала тыя злыя Аленіны словы, што як вогнік варочаліся ў душы і пяклі, пяклі яе крыўдаю. Усё жыццё ненавідзіць яе Алена, усё жыццё не можа даравацъ Гэльцы таго даўняга маладога яе пачуцця да Антося.

Божа, ды калі было тое? Калі былі тыя шумныя вечарыны пад бацькаў гармонік, пад яе «канарэечку», на якіх адчула яна, што кахае Антося? Калі было тое і што там было? Адно што й асталося ад адзінае ў іх жыцці, такой во асенняе, светлае начы — горкі пах вікі ў Антосевых сенцах, дзе яна, Гэлька, роспачна гаварыла яму пра каханне, ды сорам той, што засцілаў вочы, як ішла ад яго, ішла назаўсёды. Калі было тое і што там было! Нікому няўцям, што й цяпер яно ёсць, што й цяпер яе мучыць. І хіба толькі адна Алена здагадваецца пра гэта...

Нерухома сядзела Гэлька. Забыта, моўчкі ляжаў на ложку новы, блішчасты гармонік. Яна нечакана ўспомніла пра яго, устрапянулася, падышла да ложка. Як жывое, ласкава, лёгка пагладзіла, паставіла на калені. Адчула, як кранула сэрца пяшчота, як неадольна захацелася раптам пачуць яго голас. Яна адпусціла раменьчыкі, ціхутка пацікнула гузікі і ўздрыгнула ад тонкага, адзінокага голасу, што вылецеў з-пад пальца, прарэзаў цішыню. Яна пачала асцярожна перабіраць, кратаць белыя, чорныя гузікі, услухоўвацца ў бязладнае шматгалоссе і ўжо, здавалася, чула ў ім тую, адзіную мелодыю, якая гэтулькі год жыла ў душы, не давала спакою. Ужо, здавалася, бачыла, як выходзіць адвячоркам са свае хаты Антось, задуменна апіраецца на нізенькі плотчык і слухае, слухае гэту мелодыю...

Мурза

Стары Мурза добра памятаў сваю маці — высокую-худую, брудна-шэрай масці, з рыжымі падпалінамі па баках, з доўгімі вушамі, што навісалі на самыя вочы і амаль закрывалі іх, пакідаючы толькі чырвоныя куточкі-кропелькі. Ён памятаў, як маці асцярожна брала яго, паднімала з пацёртай, сапрэлай за зіму саломы і выносіла з цёмнай нізенькай будкі на сонейка. Вынесшы, доўга тапталася, круцілася, выбірала месца, куды б яго палажыць, а пасля апускала на цёплыя, сухія трэскі, параскіданыя каля тоўстай, пашчапанай калоды, на якой гаспадар сек дровы. Мурза, хістаючыся, уставаў на крывыя дрыжачыя лапы, доўга жмурыўся, пырхаў ад казытлівых праменьчыкаў — прывыкаў да сонца. Маці насцярожана сачыла за ім чырвонымі куточкамі-кропелькамі з-пад навіслых вушэй, а пасля падыходзіла і пачынала гладзіць-лізаць шурпатым мокрым языком. Мурза тоненька павіскваў, яшчэ больш жмурыўся і гыркаў. На гэты раз ад матчынай ласкі.

То была яго першая вясна на гэтай зямлі, былі першыя і апошнія шчаслівыя імгненні жыцця. Абарваліся яны зусім нечакана, калі прыйшлі аднаго разу чужыя людзі, забралі ад Мурзы маці, павялі яе некуды з падворка. І ніколі ніхто больш не лашчыў яго, увесь свой век сядзеў ён на цяжкім ланцугу, пільнуючы сялібу старога хрыпатага Юзюка...

Мурза памятаў сваю маці. Яна з'яўлялася перад ім, калі даводзілася асабліва горка ў ягоным жыцці, з'яўлялася такой, якой запомніў яе з тых сонечных

дзён шчаслівага маленства. Нячутна, як прывід, падыходзіла, вывернуўшы доўгі чырвоны язык, гладзіла па галаве, а ён ціхенька так павісквау, зусім як шчанюк, заплюшчыўшы моцна вочы і ўсім нутром адчуваючы гэты мокры язык на сваёй зношанай, збітай поўсці. Вось і цяпер здалося яму, што падышла ледзь чутна старая і глядзіць-глядзіць насцярожанымі куточкамі-кропелькамі... І робіцца Мурзу чамусьці сумна і цяжка. Мо ад таго, што раптам разумее ён: гэта толькі здань, а маці павялі чужыя людзі туды, адкуль ужо не прыходзяць ніколі. Тоненькі енк, як усхліп, вырываецца знутры раз, пасля яшчэ і яшчэ, перарастаючы ў суцэльны тужлівы матыў. Абрывае яго хрыплы голас гаспадара. Юзюк, моцна ляпаючы брамкаю, заходзіць на падворак. Ён не адзін. За ім, грабучы нагамі снег, сунецца яшчэ нехта. Чужы. Яго чуе Мурза па кіслым паху пракуранага адзення, па ўдушлівай вязкасці густа наваксаваных ботаў. Мурза не падымаецца, не паварочвае галавы, не разнімае прыплюшчаных павек. Ён слухае.

— Сляпы, кажаш? — чуе незнаёмы, нейкі занадта ўжо тонкі і прарэзлівы голас.

— Ага, сляпы, браток. Што крот,— сіпіць у адказ гаспадар.

— І як-та, ад прыроды, ці што?

— Дзе табе. Ад старасці, мусіць. Трасца яго ведае. Ужо з год як... Але чуткі, халера — уся сіла ў вушы перайшла. Браток ты мой, чужога за вярсту бярэ... кхэ-кхэ-кхэ-кхэ,— і зайшоўся, захрыпеў, прысядаючы, душачыся кашлем. Штосьці нядобрае чуецца Мурзу ў гаспадаровым кашлі, ён крышачку разнімае павекі, бачыць тупыя насы ботаў Чужога, бліскучыя галёшы Юзюка, што вытыркаюцца з глыбокага, яшчэ не ўбітага нагамі снегу, увесь сцінаецца.

— Гі-гі-гі,— нечакана весела, перабіваючы гаспадароў кашаль, гігіча Чужы.— То якога ты ражна хо-

чаш, хай і быў бы сабе, што ён табе, буквар чытаць будзе, ці што? Сляпы, ну й сляпы, абы чужога браў... Ды, можа, яшчэ й не сляпы. Скуль ты там знаеш? На каго яму тут глядзець у цябе? Гі-гі-гі. Дрэмле во сабе, ды ўсё.

І зноў загігікаў тонка, візгліва. І ад гігікання гэтага, бяздумна-вясёлага, цяпло разліваецца па застылым, сцятым у нядобрым чаканні нутры,— Мурза ўжо хоча расплюшчыць вочы, падняць галаву, бліжэй падсунуцца да гэтага кіслага, вісклівага, але, па ўсім відаць, добрага чалавека, як над вухам зноў нездаволена, сіпла бухае Юзюк:

— Та браток ты мой, казаў жа ж ужо табе. Бяды тае было б, хай бы яшчэ з год які пабыў, так сын жа вунь паспяшыў, з горада маладога прывалок, купіў, кажа, пяцёрку аддаў. Ферму ж, браток, разводзіць не буду. Карміць жа іх трэба, як ты думаеш? Парсюка ўтрымаў бы на тым месцы. Не жартачкі.

Мурза зноў сціскаецца, халадзее.

— А, ну тады другое дзела! — гігікае зноў Чужы. І Мурзу ўжо зусім не хочацца прытуліцца да гэтага чалавека. Хочацца хутчэй зашыцца ў сваю будку, каб не бачылі, не дасталі. Але ён не рухаецца, ляжыць, як і раней, вялікі, сівы, выцягнуўшы дужыя лапы, утуліўшы галаў.

— Тады другое дзела,— паўтарае Чужы,— тады я зараз, толькі шратовачку з печы дастану, як відзіш яхнуць не паспее...

І ўжо ўраз ажыўляецца, весялее Юзюк:

— Ага, ага, браток ты мой. Век не забуду. Рашы ты ўжо ж гэту, так сказаць, трудную задачу. Я ўжо, браток, і так і сяк думаў, трасца яго ведае. Рашыў паляўніка якога клікнуць, як хадзіць дзе тут будзе. Яны ж, кажуць, б'юць сабак, у іх план там нейкі на шкуры сабачыя, ці што. Чорт іх, адным словам. А ў гэтага ж поўсць якая, паглянь, хоць на каўнер, падлу.

Разлёгся, воўчае мяса,— як нежывога ўжо піхнуў Мурзу ў бок,— але чорта там звязвацца з паляўнікамі, ты во якраз накруціўся, то й ладна, падыдзі, як кажаш, з гэтаю сваёю шратовачкай, кхэ-кхэ-кхэ...

— А гэты, малады, што сын прывёз, дзе ж ён у цябе, ці хоць вартае што? — зноў піскліва кінуў Чужы.

Мурза насцярожыўся.

— Ат, да часу ў гумне прыпёр. Навязаць няма дзе. За гэтым во,— зноў тыцнуў пад бок галёшам.— Паджары такі. Ладны ўжо. Зараз пайду, выпушчу — глянеш.

Матляючы доўгімі рукавамі ватоўкі, Юзюк пайшоў да гумна. Неўзабаве выскачыў адтуль рыжы, як ліс, шчанюк. Гыркаючы і нюхаючы, пёр проста да Мурзы. Мусіць, баючыся, каб не ўкусіў, Чужы адсунуўся за плот, ляпнуў брамкаю. Крыху не дабегшы да Мурзы, шчанюк прыпыніўся, нецярпліва азірнуўся назад, пачакаў, калі падыдзе гаспадар. Затым колькі разоў весела аббег вакол Юзюка, заскакаў высока ўгору, стараючыся дастаць да рук, прылашчыцца. Юзюк паблажліва завуркатаў нешта сабе пад нос, прыціснуў Рыжага да сябе, пагладзіў рукою па загрыўку і, як саромеючыся гэтае свае нечаканае ласкі, сказаў да Чужога:

— Глядзі ты, які ліслівы, падла, гаспадара чуе...

Як штосьці зрушылася раптам у сцятым, схаладзелым нутры ў Мурзы. У шырока расплюшчаных вачах, якімі пільна сцярог кожны рух шчанюка, было столькі крыўды і болю, што Рыжы, нечакана наткнуўшыся на гэтыя вочы, нерашуча застыў, які час з недаверам глядзеў на яго. А Мурза паволі, не зводзячы вачэй, падымаўся на пярэднія лапы, здавалася, ледзьве стрымліваў сябе, каб не кінуцца да гэтага маладога нахабніка. І ўсё ж нерашучасць у Рыжым перамагла зялёная шчанячая цікаўнасць. Ён весела гіцнуў да Мурзы, весела, як гуляючы, тыцнуўся ружовым языком у абвіслае вуха. Мурза нават не варухнуўся, толькі касіў вачамі, паранейшаму сцярог шчанюка, і дзесьці глыбока ўся-

рэдзіне яго заклекатала, забурчала пагрозліва, злосна. Але Рыжы ўжо не звяртаў увагі, зусім асмялеўшы, гойсаў вакол яго, весела гыркаў, тыцкаўся пыскаю ў сівую доўгую поўсць, спрабаваў яе пацягваць сюды-туды, тузаць і ўрэшце-такі не вытрываў: добра цяў вострымі маладымі зубамі. І было гэта як сігнал, як тая апошняя кропля, што перапоўніла чашу цярпення. Са страшным рыкам, ірвучы цяжкі ланцуг, Мурза кінуўся на шчанюка і ўраз падмяў яго. Не чакаючы такога павароту справы, баючыся, што Мурза хутка расправіцца са сваім наступнікам, адборна мацюкаючыся на ўвесь падворак, Юзюк марна стараўся ўхапіцца за ланцуг, адцягнуць Мурзу. Перабіваючы яго, верашчаў з-за плота Чужы:

— Юзюк, дурны, чаго ты, гі-гі-гі, чаго ты, няхай, не руш, пачакай, пагледзімо хаця. Гі-гі-гі.

Усё яшчэ мацюкаючыся, Юзюк паслухаў, адступіўся ад жывога клубка, што шалёна круціўся, вірыў у яго пад нагамі.

Мурза ж усё больш і больш насядаў на шчанюка, ужо добра-такі ціснучы таго да зямлі, адчуваў, як спружыніць пад ім маладое, пруткае цела, стараючыся вырабіцца, як у адказ на гэту маладую сілу і гнуткасць усё больш і больш разгараецца ў ім лютая злосць, якой ніколі раней не знаў у сабе, булькоча, кіпіць. Не месцячыся ўнутры, страшным рыкам ірвецца з яго, пенаю валіць на збэрсаны лапамі снег. Яму трэба было перамагчы. Абавязкова перамагчы гэта маладое, страшэнна нахабнае, ненавіснае, што круцілася, вірыла пад ім і таксама гыркала, вуркатала, балюча драла яго старое цела не на жыццё, а на смерць. Ашчэранай зяпаю ён шукаў горла, у якое мусіў упіцца. І ўжо знайшоў, ужо ўпіўся, ужо адчуў, як пачаў слабець, распрамляцца пад ім Рыжы, ужо злы, пераможны рык вырваўся аднекуль знутры, як раптам глухі ўдар па спіне нечым тупым і цяжкім апусціўся раз, пасля яшчэ і яшчэ не-

шта цяжка і глуха біла і біла яго, а ён усё не расшчамляў зубоў, не адпускаў тонкага гарачага горла свайго праціўніка. І толькі хрыплы і страшны голас гаспадара, што ўрэшце дайшоў да яго, прымусіў расслабіцца, скарыцца. Ён разняў знямелыя зубы, адпусціў лапы.

Жывое, мокрае цела выслізнула з-пад яго, атрасаючыся, пасунулася ўбок. А ён стаяў, прылёгшы на пярэднія лапы, яшчэ ўсё ашчэрыўшы зубы, утуліўшы голаў, як чакаючы тых тупых, балюча незаслужаных удараў. Але іх не было. Толькі цяжка і злосна соп над ім гаспадар і нечаму па-дурному радаваўся-гігікаў за плотам Чужы.

Мурза паволі апусціўся на зямлю, палажыў галаву на выцягнутыя лапы. Пакляванай калінай стыла на снезе кроў. Ён бачыў гэтыя чырвоныя круглыя кроплі на белым снезе, адчуваў іх пах. На момант здаліся яны тымі куточкамі-кропелькамі матчыных вачэй, якія так добра памятаў. Чырвоныя кроплі расплываліся ў вялікія чорныя плямы, падступалі да самых вачэй, клаліся на зрэнкі пякуча, невыносна пякуча. Мурза круціў галавою, нават колькі разоў спрабаваў падняць цяжкую, нерухомую ў самых кіпцях лапу, спрабаваў правесці ёю па вачах, гэтак, як, бывала, улетку адганяў назойлівых мух, але лапы яго не слухаліся. Мурза паволі апускаў павекі. Прападала, адсоўвалася кудысьці пякучая невыносная гарачыня, насоўвалася халодная, нямая ноч.

Бярэзнік на загонах

Забелаў бярэзнік пачынаўся адразу за хатаю. Малады, выносны, цягнуў светлаю, шырокаю палосаю ўніз, да невялічкага, абмялелага лужка і ўжо там, у самай нізіне, прападаў, саступаючы месца цубкаму, радкаваму ў лазе, алешніку.

Перад самаю вайною Забелы садзілі тут картоплю. Але месца было нізкаватае, зямля — адзін сівак — марная, і картопля тая, колькі ні давалі гною, ці прападала, ці радзіла дробная, што арэхі.

Сцяпан Забела, які толькі перад вайною аддзяліўся ад бацькавай гаспадаркі, меркаваў на весну засеяць гэты кусок жытам. Але не паспеў. На самым пачатку вайны пайшоў Сцяпан на фронт. У хаце асталася жонка з малымі дзецьмі.

Зямля без гаспадара здзічэла, узялася папарам. Ад старых бярозавых прысадаў нанесла сюды насення, і яшчэ вайною ўзняўся на загонах часты, як шчотка, падлесак.

Вярнуўшыся з фронту, Сцяпан ад здзіўлення толькі свіснуў: «Во, брат, загадавала жонка лес пад хатаю». І ўжо ў першыя дні ўзяўся за сякеру, каб расчысціць зямлю. Але Зося, здзіўляючы яго яшчэ больш, стала прасіць, каб не чапаў кустоў... «Хай растуць, Сцяпанка. Усё роўна з зямлі гэтай толку мала». І, бачачы, што муж не зусім разумее яе, расказала, як хавалася ў ляску з дзецьмі, калі адступалі каля іх хаты немцы, як ратавалася ад голаду, знаходзячы пад бярозкамі першыя грыбы-расавікі. Адным словам, памагаў ёй бярэзнічак, шкода яго нішчыць...

Паскроб тады Сцяпан патыліцу, памеркаваў і рашыў: ладна, хай расце. З зямлі гэтай і праўда не разбагацееш. Так і астаўся пад Забелаваю хатаю лес. Сцяпан штовесну падцярэбліваў яго, і незаўважна бярэзінкі выцягнуліся, дагналі цыбаты вішняк каля плота. Даўно ўжо бярэзнік, як і ўся Сцяпанава дзялка, адышоў да калгаса, а Сцяпан па-ранейшаму лічыў яго сваім. З-за бярэзніку гэтага і ў вёску не захацеў выбірацца, як з хутароў ссялялі. Сам старшыня ўгаворваць прыязджаў. Што ты, казаў, Забела, як воўк адзін тут сядзець будзеш. І дзецям у школу далёка, і вам з жонкаю на работу. А ён тады жартам адгаварыўся: «Дзе я, Пятровіч, салаўёў слухаць буду. Прывык я да салаўёў...»

Жарт жартам, а яно і праўда, ужо вот каторы год, жыццё лічы што прайшло, дзяцей пагадаваў, у людзі выправіў, Зосю сваю правёў у апошнюю дарогу, дый сам не сказаць каб надта дужы быў, а як прыйдзе вясна, як ажыве, зазеляніць бярэзнік, так і ўстрапянецца Сцяпанава душа. Неяк па-маладому трывожна і светла захвалюецца, і думаецца тады старому, што жыццё яшчэ не пражыта, што не нацешыўся ён ім удосталь.

Так і гэту вясну было. Штодня, з самага ранку, выходзіў Сцяпан з хаты і ўжо не прыпыняўся да самага вечара. Тая вірлівая радасць, якая панавала ў прыродзе, здавалася, перасялілася ў яго самога, запаланіла, захліснула і трымала, не выпускаючы са свайго трывожнага, хмельнага палону. Гнала ў рост травы. На вачах развіналіся, разгладжваліся клейкія бярозавыя лісточкі. Аж галавілася ў бярэзніку занятае сваім адвечным клопатам разнастайнае птаства, снавала сюды-туды між галін, зусім не зважаючы на чалавека. Не па-вясноваму густое, настоенае на першай, маладой зеляніне, на паху шчодра ўгрэтай, прамытай цёплымі дажджамі зямлі, кружыла галаў паветра.

Можа, таму Сцяпану сёння з самай раніцы неспакойна ўспаміналася яго другая, як ён сам яе называў,

пасляваенная маладосць. Бо першая, што была да вайны, цяпер мала й помнілася, зацягнутая, заслоненая горам і пакутамі доўгіх ваенных гадоў. А вот пасляваенная помнілася. І неяк так ярка, да шчымлівага болю, жыва.

Сёння да Сцяпана які ўжо раз вярталася з мінулага адно і тое ж. Стаяў у вачах сонечны красавіцкі дзень у гэтым, яшчэ голым, не ўбраным у зелень, бярэзніку. Высокае і сіняе, аж калола ў вочы, неба, што прасвечвала праз рэдкі паркаль трапяткога голля. Ён з Зосяю, укленчыўшы пад тонкаю бярозкаю на яшчэ сырой, не ўгрэтай як след зямлі. Тады яны ўпершыню спрабавалі пускаць сок са сваіх бярэзін.

Помнілася Сцяпану, як молада і звонка, на ўвесь бярэзнік, смяялася Зося, калі ён, як малую, паіў яе са збана тым халодным і чыстым, як сляза, бярозавым сокам...

І ўжо цэлы дзень пасля таго ўспаміну хадзіў Сцяпан, носячы на сваіх засмяглых сухіх вуснах саладжавы прысмак бярозавіку. Адчуў яго зноў, калі надвечар, зайшоўшы ў магазін узяць хлеба, убачыў на самай верхняй паліцы побач з белымі «гускамі» «Сталічнай», запыленыя, трохлітровыя слоікі зеленавата-празрыстай вадкасці. Як першы раз заўважыўшы такое дзіва, стаяў і доўга ледзь не па складах чытаў надпіс: «Березовый сок». «Бог святы, і хто яго тут, у вёсцы, купляе. Свайго ж людзі штовесну кадушкі цэлыя напускаюць. Да самай касавіцы хапае...»

Невядома, колькі гэтак стаяў бы Сцяпан, каб не гукнуў яго з дзвярэй рыжы Антольчын Юрка:

— Здароў, Забелка! Што ты, брат, утаропіўся? Мусіць, выпіць рашыў і грошай шкадуеш?

Сцяпан адвёў ад паліцы вочы і, паціскаючы Юркаву маленькую, калючую руку сваёй вялікай, кашчавай, адказаў таксама жартам:

— Думаю вот, чаго ўзяць лепей: гарэлкі ці соку.

3 Зак. 1206

— Га, соку. Можна падумаць, ты свайго не назапасіў. Нябось на гады тры расстараўся...

— А на халеру мне на тры гады... Я прывык штогод свежы піць.— Сцяпан здзіўлена слізгануў зверху ўніз па прысадзістай, камлюкаватай Юркавай постаці. Той, відаць, якраз ішоў з фермы, бо ўвесь быў асыпаны жоўтаю саламянаю пацярухаю. Адна доўгая саломіна, як цыгарка ў заядлага курца, тырчэла ў яго з-за вуха.

Нечакана выкасаўшы голыя дзясны з ледзь прыкметнымі чорнымі ямкамі ўшчэнт з'едзеных зубоў і хітра прыскаліўшы левае вока, Юрка зіркнуў на Сцяпана:

— А трэ было, брат, гэту весну не на тры, а на ўсе пяць запасіць. Бо свежага ўжо не будзе...

І, бачачы, што збіў Забелу з панталыку, пераможна павёў вачыма за прылавак, дзе сядзела, асалавеўшы без работы, мажная, чырвоная, як бурак, прадаўшчыца.

Рэня ўжо й без таго ленавата прыслухоўвалася да гаворкі мужчын і цяпер згодна заківала рыжаю, у дробных кацёлачках завіўкі, галавою.

— Во, не дасць зманіць,— тыркнуў зноў у Рэнін бок чорным, карэлым пальцам Юрка.— Кудзярку тваю, Сцяпанка, таго, ліквідзіраваць збіраюцца.

Сцяпан знерухомеў. Стаяў, яшчэ якраз не разумеючы, пра што пляце Юрка, але ўжо адчуваючы, як гняце, ціснe на плечы нечаканая бяда.

— Ну, што, мову табе адняло? — трацячы цярпенне, Юрка аж прысеў.— Глянь, стаіць як слуп. Бярэзнік, кажу, твой, таго, заўтра драць будуць. На свае вушы чуў сёння. Гэнька Адамкаў пад масцярскімі казаў. Заўтра, кажа, на Забелаў бярэзнік еду. Пятровіч загадаў. Як запушчу, кажа, звяра свайго — гэта ён на бульдозер — да палудня знаку не астанецца.

Ажыла, заварушылася за прылаўкам Рэня:

— Ага, дзядзька, гэта ж і я чула. Пад план нейкі

бярэзнік ваш падпадае. Кажуць, Заброддзе асушаць будуць, а на месцы бярэзніку трубы якраз пройдуць.

— Во, во. Заброддзе. Так што, Сцяпан, не стой, а давай да хаты дуй. Да ночы яшчэ паспееш бярозы, каторыя лепшыя, спусціць. А то заўтра во як па́дуць вясковыя — уміг панясуць...

Нешта яшчэ лапатала, ужо зусім разрухаўшыся і прагнаўшы дрымоту, Рэня, махаў дзелавіта рукамі Юрка, але Сцяпан іх не чуў. Ён як адышоў раптам ад усяго гэтага, заглыбіўся ў сваё, аднаму яму вядомае, аднаму яму зразумелае. І ўжо прыгнуты, згорблены гэтым «сваім», забыўшыся развітацца, забыўшыся купіць хлеба, пайшоў з магазіна.

Нязнаная дасюль вяласць і слабасць разлілася па ўсім целе, скавала рухі. Здавалася, ліплі да зямлі, упарта за яе трымаліся падэшвы лёгкіх, вынашаных кірзовікаў, і ён цяжка адрываў іх, пераастаўляў ногі няўпэўнена, крыва, як п'яны.

Не хочучы ні з кім сустракацца, не пайшоў вуліцаю, а скіраваў адразу на загуменне і адтуль ужо, цярэспаля, заламаў на цёмны чубок свайго бярэзніку. Але чым бліжэй падыходзіў да яго, тым слабейшыя станавіліся ногі, тым большая роспач агортвала душу.

Сцяпану ўспомнілася, як колькі гадоў таму перажываў ён падобнае, калі даведаўся, што яго самы малодшы брат Павел пры смерці.

Гэтакая во шкадоба, змешаная з адчаем, стаяла ў душы, гэтаксама не слухаліся тады ногі, як ішоў да Паўлавай хаты, і Сцяпан не ведаў, як гляне брату ў вочы, пра што будзе з ім гаварыць і што рабіць. Горыч вялікай і непапраўнай віны, як і тады, захліснула цяпер Сцяпанаву душу. Здавалася, што нейкім чынам і ён сам, Сцяпан Забела, вінаваты ў тым, што павінна адбыцца.

Гэта раптоўнае адчуванне свае віны спыніла Сцяпана. Ён прыстанавіўся і толькі цяпер убачыў, што не-

заўважна дайшоў да лужка. Нязвыклая цішыня панавала навокал. Ні адсюль, з лазы, ні з бярэзніку не чутно было ніводнага шолаху, ніводнага птушынага голасу.

Цішыня насцярожыла Сцяпана. Ён стаяў доўга, напружана ўслухоўваючыся. І толькі сабраўся завярнуць на сцежку да хаты, як раптам на другім канцы бярэзніку, каля поля, натужна крэкнула спілаванае дрэва, зашумела, чапляючыся голлем за суседнія, і гухнула на зямлю.

Тут жа зазвінела сякера, цярэбячы сукі, хутка зашоргала пілка.

Сцяпан, разводзячы рукамі голле, ступіў у бярэзнік, пайшоў па загоне. Ішоў не спяшаючыся, нейкі абыякава-скамянелы, спакойны. Усё бліжэй і бліжэй чулася пілка. Здагадаўся, што ўжо спілаванае рэжуць на кускі, каб лягчэй было выносіць. «Цікава, каму ж гэта так не цярпіцца?»

Праз рэдкую яшчэ лістоту Сцяпан неўзабаве змеціў шырокую спіну Адамкавага Гэнькі. Успомніў, як яшчэ летась вясною, калі ён, Сцяпан, прыходзіў у сельсавет выпісаць брыкету, Гэнька, перастрэўшы яго на вуліцы, дзівіўся: «У лесе сядзіш, дзядзька, а брыкетам паліш. Я во ў вёсцы і то на гадоў дзесяць бярозавых назапасіў...»

Гледзячы цяпер, як завінаецца Гэнька над бярозаю, адчуў, што душу захліснула злосць. Ледзь стрымліваючы сябе, Сцяпан падышоў бліжай. Гэнька быў у бярэзніку адзін. Прыкленчыўшы на зямлю, набычыўшы тоўсты, чырвоны ад натугі карак, адною рукою трымаў, каб не круцілася палена, другою цягаў пілу-двухручку. Аднаму было, відаць, нязручна, бяроза сцінала, не даючы пілцы ходу, і Гэнька цяжка, натомлена соп.

Распілаваныя на роўныя кускі, тут жа ляжалі некалькі бярэзін. Збоку, заплываючы сокам, ружавелі свежыя пні, бялела на яркай, маладой траве пілавінне.

— Бог помач, чалавеча,— як мага спакойней, разгледзеўшыся, азваўся Сцяпан.

Гэнька ўздрыгнуў, падняў вочы.

Убачыўшы над сабою Сцяпана, вышчарыў белыя, што часнок, зубы:

— Казаў бог, каб і ты памог.— Устаючы, атрос калень пілавінне і, быццам не заўважаючы калючых Сцяпанавых вачэй, сцёр шапкаю з расчырванелага твару пот, загаварыў весела, усё гэтак жа па-блазенску ўсміхаючыся:

— От пара харошая, дзядзька. Сама ўсё расцвітае. Аж галава кругам ідзе ад пахаў. Як у раі жывеш тут. Шкода толькі, што канец гэтаму раю прыходзіць.

Сцяпан не абзываўся, і Гэнька спахапіўся, перавёў на другое, спытаў сур'ёзна, заклапочана:

— Праўда, а чаму не пілуеш, Забела? Браўся б, пакуль ёсць за што, заўтра ўжо наўрад ці ўхопіш.

Сцяпан страпянуўся:

— А чаго гэта я, па-твойму, хапаць павінен? Хапаць я, чалавеча, не збіраюся і другім не дазволю,— Сцяпан гаварыў паволі, глухаватым ад хвалявання голасам.— Цікава, хто табе даў права хапаць, хто даў права разгарнуцца тут, як на сваім, уласным?

Гэнька глядзеў на Сцяпана ўсё такімі ж, як і раней, вясёлымі, празрыста-нахабнаватымі вачыма і, мусіць, зусім не хочучы заводзіцца, не зважаў на яго пагрозлівы тон і калючы выгляд. Гаварыў знарок спакойна, гнуў сваё:

— А што, дзядзька, не чуў хіба? Гамон бярэзнічку. Усё роўна гамон. Хапай не хапай. Заброддзе асушаць будзем. Пятровіч вунь з меліярацыі тэхніку запрасіў. На заўтра дакляравалі. Я вот думаю ўгаварыць хлопцаў, каб не перліся зранку, каб паспець лепшыя дровы выхапіць. А то пабузуем як відзіш. За дзень усё ў бурты ссунем — тады не выцягнеш.

— А гэта мы яшчэ паглядзім, як вы ссунеце.—

Глыбокія Сцяпанавы вочы нядобра заблішчэлі. Ён увесь сціснуўся, падступіў да самага Гэнькі.— Хопіць вы ўжо нассоўвалі. Скора ссоўваць не будзе чаго.

Яшчэ ўсё не верачы ў Сцяпанаву злосць, Гэнька зноў засмяяўся:

— Во загнуў, дзядзька. Ды не бядуй ты, на наш век хопіць дабра такога — бярэзнічкаў, лужочкаў. Вот збожжа, кажуць, не хапае, сеяць больш трэба, а ў нас зямлі колькі марнуецца. Заброддзе адно якое...

— Што Заброддзе, што там марнуецца? — Сцяпан аж падскочыў.— Ты хоць раз ці быў на тым Заброддзі, ці бачыў, колькі там баброў развялося? Як гэта ты сушыць будзеш, куды іх падзенеш?

— А, тваю такую,— Гэнька аж прысеў,— здзяцінеў стары, яй-бо. Баброў. А што бабры? Я, брат, не першы год на бульдозеры. Не такія Заброддзі прасаваў. Чыста, гладка. Як пачуюць бабры твае, што трактар завуркаў — толькі іх і бачылі. Знаходзяць месца. Надумаў ты, дзядзька, пра што гаварыць. Можа, яшчэ й варонаў у бярэзніку сваім пашкадуеш, каршуноў? Я вунь адну бярэзіну спусціў з гняздом. Як гухнула — не піскнулі нават. Падышоў — поўнае гняздо пражор. Вывеліся якраз. Зараз бы твае кураняты ім на корм пайшлі. А так — цэлыя будуць.

І, бачачы, што Сцяпан па-ранейшаму зацята маўчыць, дадаў памяркоўна:

— Не бядуй, стары. Тут такое дзела, сам панімаеш — асушка. Пагалоўная, брат. Нікуды не дзенешся. Так што станавіся во і пілуй разам. Якую тоўстую, то й я памагу спусціць. Дроў хоць будзеш мець. А то дрыжыш над гэтымі кустамі ўсё жыццё, сабе шкадуеш — брыкетам паліш. Усё роўна — памрэш, пакінеш, і тады не паглядзяць — выпілуюць.

— От як памру, тады і прыйдзеш сюды, а цяпер — вон! — апошняе Сцяпан крыкнуў адрывіста, моцна.

Не чакаючы такога павароту, Гэнька ўмомант на-

ліўся чырванню, адхіснуўся, але тут жа апомніўся, заенчыў на ўвесь бярэзнік:

— А-а-а, вот ты як. А што ж гэта я ў твой уласны прыйшоў, што ты ганяеш мяне? Не ў твой. Ты забыў, пэўна, што бярэзнічак калгасны, а значыць, я рубаў і рубаць буду.— Гэнька сунуўся да бярозы, узняў сякеру.

— Папробуй.— Белы як палатно Сцяпан ступіў напярэймы, проста пад узняты абух.

— Тты што, пень стары, тты што, звар'яцеў, жыць надаела? Зараз цюкну гэтым абухам і будзеш ляжаць...

— Цюкні. Ну, цюкні,— Сцяпан падступаў усё бліжай, аж пакуль не прысунуўся да самага.

Які час мужчыны моўчкі елі адзін аднаго вачыма, цяжка саплі. Першы не вытрымаў Гэнька. Апусціў сякеру, плюнуў.

— Цьфу ты. Рукі мараць аб трухлё такое буду. Сам рассыплешся.— Адступіў ад бярозы, падняў з зямлі пілку, сказаў пагрозліва: — Я пагляджу, што ты заўтра запяеш, як сюды начальства прыедзе і я бульдозер прыганю. Пад гусеніцы не ляжаш.

— Лягу.— Сцяпан таксама адышоў ад бярозы і, адчуваючы, як дрыжыць усё нутро, з усяе сілы стрымліваючы сябе, каб не кінуцца, не ўчапіцца ў чырвоны Гэнькаў карак, ішоў за ім следам, аж пакуль той, аглядваючыся, бы ўсё роўна ўгадваючы Сцяпанава жаданне, не высунуўся з кустоў на бераг, не пайшоў прэч ад бярэзніку.

...Доўга тую ноч не мог заснуць Забела. Ляжаў, шырока расплюшчыўшы вочы, напружана, усёю істотаю слухаючы, ці не загрукоча дзе паблізу трактар. Не верылася, што Адамкаў пустадомак дачакае раніцы, не прыпрэцца сярэдначы. Але на дварэ было спакойна і ціха.

Сцяпан адчуваў, як уліваецца гэта ціша праз расчыненае акно ў асветленую маладым месяцам хату.

Чуў, як недзе воддаль, на лужку, прабіваючы цішыню, нясмела зацёхкаў салавей і яму тут жа адказаў другі. Зусім побач. У бярэзніку.

Стары ўздыхнуў. Адчай і роспач, якія тачылі душу ўвесь дзень, адступілі. Ён адчуў, як вяртаецца да яго сіла і ўпэўненасць у тым, што ўсё будзе добра, што здолее ён заўтра адстаяць і Заброддзе, і свой бярэзнік. Не можа быць, каб не здолеў.

І толькі калі цяжкая стома звяла нарэшце Сцяпанавы вочы, убачыўся яму Адамкаў Гэнька. Яго жалезны бульдозер з вострымі, бліскучымі зубамі поўз да бярэзніку. І ўжо соннага Сцяпана зноў працяла трывога...

Цыба

I

Антоля адчула, што заблудзілася. Ужо добрую гадзіну яна ішла, а хутара ўсё не было. Лес на вачах мяняўся, гусцеў. У лагчынах выносны хвойнік пераходзіў у нізкарослы і часты дубняк. Антоля старалася абмінаць такія лагчыны і ўсё больш і больш упэўнівалася, што заблудзіла.

Было ўжо каля паўдня. Сонца паднялося і цяпер, высокае, зыркатае, прабівалася праз кроны, крапліста клалася на зямлю. Усё цяжэй станавілася дыхаць. Натомлена сапучы, роспачна азіраючыся кругом, Антоля ў душы кляла сябе, што адгаварыла пляменніцу ісці разам. Выбіраючыся ў гэту дарогу, не хацела, каб быў хто побач. Дый пэўная была, што патрапіць сама, што памятае ўсё да драбніц. Аж не. Лес адмяніўся, стаў чужы, незнаёмы. Праўда, на кароткае імгненне не-не дый здавалася Антолі, што яна пазнае мясціны і вотвот выб'ецца да Лемяшоў, да таго хутара, дзе калісьці стаяла і яе хата. Але марна. Тое, што на момант здалося знаёмым, тут жа адварочвалася чужым, зноў наганяючы на душу страх і роспач.

Кабета не была тут з самай вайны. За гэтыя гады яна састарэла, ушчэнт высахла і ад таго выдавала яшчэ больш высокаю і нязграбнаю. У чорнай, доўгай, па пяты, спадніцы, у суконным, хоць стаяла сярэдзіна ліпеня, сачыку, махаючы доўгімі, як граблі, рукамі, яна кідалася між дрэў, усё яшчэ спадзеючыся выбрацца.

Урэшце, зусім выбіўшыся з сілы, зняможана апусцілася на купіну шарага, пухкага моху.

Выцвілыя, падслепавата прымружаныя вочы яе глядзелі тужліва і абыякава. Густы хваёвы пах дурманіў галаву. Адчуваючы, як пачынае надходзіць, падварочваць пад грудзі млоснасць, Антоля прысланілася плячыма да хвойкі, заплюшчылася.

Паплыў, закружыўся перад вачыма лес. Ужо не гэты, стары й незнаёмы, а той, ранейшы, яшчэ малады хвойнік, які яна так добра ведала. З дзіцем на руках кружыла яна па хвойніку, шукала ратунку. Недзе зусім блізка, у спелым, перастаялым жыце, гарэла яе хата. Свежаспечаным хлебам пахлі падсмаленыя каласы, і гэты салодкі пах ёй, галоднай, выварочваў нутро. Але яна перасільвала сябе і ўсё мацней прыціскала да грудзей дзіця, усё хутчэй старалася бегчы. Толькі раз-пораз прыпынялася, каб паслухаць, ці бягуць за ёю, ці даганяюць. За ёю ніхто не бег. У хвойніку было спакойна і ціха. Раптам, зусім нечакана, насмерць палохаючы яе, закрычала на руках дзіця. Антоля здрыганулася і расплюшчыла вочы.

Памалу даходзячы да памяці, ужо зусім блізка ад сябе пачула галасы. Гаманілі кабеты, чуўся дзіцячы смех. Антоля борздка ўсхапілася, намерваючыся бегчы, ірванулася ў бок ад хвойкі, але тут жа апомнілася, спынілася. У галаву цюкнула, што гэта ж, пэўна, мясцовыя збіраюць ягады і што ў іх яна можа папытаць дарогу да Лемяшоў. Паспакайнелая, расправіла на сабе памятую спадніцу, падцiснула рагі хусткі, пайшла на галасы. Не даходзячы да ягадніц, стала за крушынавым кустом, зблізку старалася разгледзець, хто ж гэта. Убачыла дзвюх незнаёмых маладзіц і дзяўчынку-падлетка. Яны, прысеўшы на кукішкі, порстка шморгалі спелыя, буйныя чарніцы, перагаворваліся. Антоля ўслухалася. Гаварылі пра нечае вяселле, смяяліся. Яшчэ раз добра агледзеўшы кабет і ўпэўніўшыся, што іх не ведае, яна выйшла са схованкі, знарок кашлянула. Жанчыны змоўклі, паднялі галовы. Яна дала даб-

рыдзень, дзеля вока пацікавілася ягадамі і тут жа, не слухаючы, пакуль адкажуць, спытала дарогу да Лемяшоў.

Кабеты пераглянуліся, з цікавасцю на яе паглядзелі. Затым адна з іх, мажная, чарнавокая, засмяялася: «Так гэта ж і ёсць Лемяшы, цётка.— І бачачы, што старая зусім разгубілася, удакладніла: — Гэта лес Лемяшоўскі, а самі Лемяшы у-унь,— махнула сіняю ад ягад рукою,— прагалак свіціцца. Поле там цяпер. Скрозь жыта расце. Хутароў тых даўно няма...»

Другая маладзіца моўчкі паднялася ад ягадніку і цяпер уважліва, неадчэпна глядзела на старую сінімі, вострымі вачыма. Штосьці да болю знаёмае здалося Антолі ў гэтым паглядзе. Яна занепакоілася, заспяшалася. Ужо на хаду спахапілася, павярнулася зноў да чарнявай:

— Дзякуй табе, дзеткі. Цяперака ўжо дайду.— І хутка, незаўважна махнулася за крушынавы куст, з-за якога нядаўна выйшла. І толькі там, у гэтай сваёй схованцы, перавяла дух, агледзелася. Шалёна калацілася сэрца, і здрадліва, як пасля доўгага бегу, лекацелі яе худыя, усё яшчэ быстрыя ў хадзе, ногі. Чуючы, што зноў загаманілі кабеты, яна стаілася, прыслухалася. Па голасе ўгадала чарнявую:

— Што-та за яна, ці пазнала ты, Маня?

Антоля замерла.

— А ты хіба не пазнала? Гэта ж Цыба Гартунова...

Як выцятая чым вострым, уздрыгнула ад гэтых слоў і ад гэтага голасу Антоля. Пякучая гарачыня разлілася ўнутры, дала ў твар, заслала вочы. Як праз туман дайшоў да яе глухі, ледзь чутны голас чарнявай: «Глядзі ты, калі прывалаклася. А я думала, яе даўно на свеце няма...»

Антоля болей не слухала. Як што піхнула яе раптам у плечы, зрушыла з месца. Не разбіраючы дарогі, коўзаючыся на слізкім шыльніку, чапляючыся санда-

лямі за голае, рабрыстае карэнне, падыбала, ужо не думаючы, не разбіраючы, куды і па што.

Гулка стукала ў скроні, аддавалася болем у сэрцы нечакана падслуханае: «Гэта ж Цыба Гартунова». Яна то на момант прыпынялася, услухоўваючыся ў абыякава-санлівую цішыню разамлелага пад сонцам лесу, стаяла скамянелая, нерухомая, то зноў, каторы раз, уздрыгвала, чуючы, як ажывае, гучыць у душы голас: «А ты не пазнала? Гэта ж Цыба...» І ўжо вісела, як праклён, неадступна ішла за ёю забытая, сцёртая часам, даўняя яе мянушка. Антолі здавалася, што і лес гэты, і кожнае дрэва ў ім, кожны куст пазнаюць яе, аб усім памятаюць. Адусюль глядзелі, сцераглі кожны яе крок на гэтай зямлі сінія, вострыя вочы Хадовічавай Мані. Антоля пазнала яе па гэтых вачах, яшчэ не чуючы голасу, пазнала адразу, як толькі тая паднялася ад ягадніку і позіркі іх сустрэліся.

Штосьці незразумелае стала тварыцца з Антоляю пасля гэтай сустрэчы. Тое, што хвіліну назад выдавала чужым, да непазнанасці змененым, цяпер, як на злосць, мучыла, даводзіла душу да роспачы жывым напамінкам пра пražытае, даўняе. Яна пазнавала ўсё тут, ужо не могучы сабе даравáць, што заблудзілася, што мусіла пытаць дарогі.

Як бы наперакор успамінам, у сонечным бляску зіхацеў, жыў сваім жыццём лес. Антоля нечакана востра адчула, як недарэчы яна тут, як непатрэбна яна анікомачку на гэтай роднай, калісьці сваёй, зямлі.

Праз пякучы, едкі туман, раз-пораз сціраючы яго ражком хусткі, глядзела Антоля на знаёмы высокі груд, услáны чабаром, на амшэлы пляскаты камень пад старою елкаю ў далінцы, на якім, божа літасцівы, гэта ж калісьці сядзела яна сама.

Антоля зараз жа і ўбачыла сябе на гэтым камені з дзіцем на руках, скамянелую ад страху і волкай, вясновай прахалоды таго далёкага вечара. І зноў, як і тады, здалося, усю яе праця̆ў адчайны крык Хадовічавай Мані: «А татачка, а браточак мой, а што ж гэта ён з вамі нарабіў...»

Крык гэты рэхам азваўся ў глыбокай, як іх лемяшоўская студня калісьці, Антолінай памяці, падняў з самага яе дна ўвесь той мул, які сама Антоля ніколі не чапала, баялася варушыць. І цяпер ён, патрывожаны, ужо проці яе волі і жадання ўпарта ўсплываў наверх, выносячы з самых патаемных глыбінь усё новыя і новыя пясчынкі прыпамінаў. Яны кругціліся, вірылі, бы ў шалёным танцы, адзін аднаго зменьваючы, блытаючы, перабіваючы.

Зусім недарэчы ўспомніўся раптам Уладак. Малады і чужы. Ніколі й не ўспаміналася тое. Здаецца, усё жыццё была звязана з ім адною вяроўкаю, якой ужо да смерці не разарваць, не разрэзаць. Аказваецца, не. Быў час, калі й без яго жыла, як пташка вольная, ні перад кім душою не вінаватая. Антоля аж не паверыла сабе — такое яно тое, дзявоцкае, было недасяжнадалёкае, нерэальнае. Але ж было. Да тае вечарыны ў Хадовічавай хаце, дзе ўпершыню прыкмеціла, як употайкі, з кута, сочаць за ёю лупавата-настойлівыя шэрыя вочы. Ёй і няёмка было ад тых таемных позіркаў, і, невядома чаго, страшна, і разам з тым добра, бо ніхто ніколі не глядзеў на яе так, як глядзеў Уладак. Згадала цяпер, што ён ні разу й не танцаваў, стаяў у куце, якраз у тым, каля печы, дзе старая Хадовічыха ставіла качэргі, пераміна́ўся з нагі на нагу і ўсё пазіраў. Калі вочы іх часам сустракаліся, адводзіў свае ўбок і невядома каму ўсміхаўся — паказваў рэдкія, няроўныя зубы. Ён быў невысокі — не даставаў ёй нават да пляча. Можа, таму й ніколі не вывеў яе ў танец, баяўся,

каб не смяяліся. А яна ўжо чакала тых вечарынак, чакала тых позіркаў... Дачакалася. Па зямлі сваёй ходзіць крадучыся, азіраючыся, як злодзей. Людзей баіцца, каб не пазналі. А як жа — не пазнаюць... Маня адразу пазнала: Цыба, кажа, Гартунова. А Цыбаю яе празываць сталі, як за Уладака пайшла. Ён нізкі, як выйдуць, бывала, разам куды, яна побач з ім яшчэ вышэйшай выдавала... Думала, забылі тут мянушку. Яна сама за столькі гадоў забыла яе. А некалі, як толькі пачуе, што скажа хто гэтак — крыўдзілася моцна... Не забылі. Помняць. Маня помніць. Як і яна, Антоля, усё помніць...

Сонца стаяла якраз над галавою і смажыла, смажыла — не выжыць. Яе чорная хустка напалілася, як засланка ў печы, і цяпер нясцерпна пякла галаву. Перад вачыма, варта было толькі прымружыцца, плылі-круціліся жоўтыя колы, і слаблі, падгіналіся ў каленях ногі. Шукаючы ценю, Антоля азірнулася, заўважыла, што ўсё яшчэ стаіць на тым самым месцы. Пад старою елкаю згледзела ўсё той пляскаты валун, з цёмнымі шырокімі пляйстрамі моху, не думаючы ступіла туды, угнула галаў, падшылася пад раскідзіста-нізкія, густыя лапы. Адчула, як усю абняў раптам нечаканы і прыемны пасля спёкі халадок, як дыхнула ў твар пахам прэлай ігліцы, грыбоў і вільгаці. Пачула, як разам з гэтым халадком, з гэтымі пахамі зноў вярнуўся, паплыў у душу Манін крык, неяк адразу ўся сціснулася, знерухомела. Ясна, нібыта было гэта ўчора, убачыла вузкі абмежак з маладою кучараваю дзічкаю і Маню ў сінім вясновым прыцемку пад гэтаю дзічкаю на абмежку. У светлым плаццечку яна, што кнігаўка, то ўздымалася ад зямлі, то зноў прыпадала да яе і галасіла, галасіла, асіплым ад доўгага плачу і крыку голасам. Там, на абмежку, адзін каля аднаго, нерухома ляжалі стары Хадовіч з сынам. «А татачка, а браточак мой, а за што ж ён вас, Гартун праклятьі...» Яна, Анто-

ля, і цяпер не ведае, за што... Казалі, Хадовічы з партызанамі былі звязаныя. А Уладак як бы ведаў пра гэта ці, можа, дагадваўся, але чапіўся да іх з самага пачатку свае службы. Каб яна дымам пайшла. А і пайшла ж. Усё дымам пайшло. Але тады... Нядзеля якраз была. Першы дзень вялікадня. Цёплы такі. Сонца з самае раніцы, жаўранкі ў полі, кнігаўкі аж галавіліся. Сама ўсё зелянець пачынала. Вялікдзень той год пазнаваты быў, а вясна выдалася ранняя, дружная — вот і прыйшлося свята якраз у цяпло. Але не цешыла яно Антолю. Якое там свята. На людзі і то баялася выйсці. Вот так і сядзела. Акно, праўда, адчыніла, на гасцінец пазірала, Уладака начэквала. Ён цалюткімі днямі ў Ганевічах прападаў — гарнізон там быў.

У Хадовічаў, чутно было, надвячоркам суседзі сабраліся. І яна ўсё прыслухоўвалася, чакала, калі яны на падворак выйдуць і стары Хадовіч скрыпку возьме.

Гэтак штогод было. На першы дзень вялікадня, пасля доўгага посту, браў Вінцук у рукі скрыпку, выходзіў на падворак, сядаў на прызбе. І не было ў Лемяшоў лепшага і святлейшага часу, чым гэты. Да позняга вечара, бывала, граў Хадовіч, да першых халодных зорак. Адмыслова граў. Моладзь з другіх вёсак збярэцца, хлопцы яшчэ з гармонікам ці з бубнам далучацца, і тады ўжо танцы пачыналіся...

Прычакала Антоля Вінцуковай скрыпкі. Як толькі стала хіліцца на захад сонца, выйшаў стары з хаты.

Антоля найперш галасы пачула: звонкі, яшчэ дзіцячы, Манін і басавіты, зусім ужо мужчынскі, малодшага Хадовічавага хлопца, што не так даўно вярнуўся з польскага фронту. Маня тады, помніцца, да яе нараніцы ўляцела і, задыханая, радасная, абвясціла: «Наш Юзічак з фронту вярнуўся. Шынялёк увесь пастраляны прынёс, а сам цэлы. Буду, кажа, цяпер жыта сеяць. Адваяваўся...»

Антоліны думкі нечакана прарвалі першыя гукі музыкі. Ацішаючы ўсё кругом, загаварыла, заспявала ў руках старога Хадовіча скрыпка. Здаецца, ніколі яшчэ не граў так Вінцук. Мелодыя была нязнаная, ніколі раней не чутая. Як бы й не скрыпка то была, а жывы чалавечы голас, ад якога беглі па целе мурашкі і сціскалася сэрца.

Антоля сядзела нерухома, скаваная, паралізаваная гнеўнымі гукамі музыкі. У такім здранцвенні і застаў яе Уладак.

— Ну, што, усе кадрылі стары бандыт перайграў? — Ён ледзьве трымаўся на нагах.— Хай грае. Мы гэта любім...

Пастаяў які час, хістаючыся, пасярод хаты, паківаўся над калыскаю, зноў падышоў да акна:

— Што-та ён уперыўся ў адно? Пілуе ўжо катора пара. Пайду закамандую весялейшае што. Лявоніху закажу, га, жонка?

Як падкінула тады Антолю. Учапілася за рукаво, не пускаць стала.

— Не ідзі, Уладачак, не трэба. Хай грае. Што табе. Кладзіся. П'яны ты. Не йдзі.

Не паслухаў. Ірвануў руку, аж зляцела з рукава белая павязка, да дзвярэй крутануўся. І каб гэта ж яна тады за ім следам кінулася, то, можа, іначай усё было б, а то як сядзела на лаве, так і асталася сядзець. Слых напружыла, кожны гук з Хадовічавага падворка лавіла. А там па-ранейшаму плакала, выварочвала нутро Вінцукова скрыпка. Антоля ўжо й сама ў роспачы, нядобра падумала, што, й праўда, стары залішне ў адно ўкляпаўся, хай бы што весялейшае зайграў. І толькі яна гэта падумала — змоўкла скрыпка. Ціха так стала кругом. Было чутна, як каля лесу, над полем, крычала кнігаўка. Адзінока. Трывожна. Але хутка з Хадовічавага падворка пачуліся галасы, і Антоля замерла, услухалася. Напачатку даляталі толькі паасобныя словы:

«немцы», «кроў», «дзеці», «Каснікі». Чула, што гаварыў адзін Вінцук.

«Божачка, што ж гэта ён, нашто?»

Пасля дайшло выразнае, глухавата-гнеўнае: «Каб духу твайго тут не было, чуеш? Смуроду каб не было! Ніводнага вырадка ў нас не знайшлося, ніводнага сабакі з нашага боку. Адзін ты».

Штосьці лапатаў, не разабраць, Уладак. Пасля брыдка, пагрозліва вылаяўся. Ізноў, чула, закрычаў Вінцук: «Юзік, вазьмі за каўнер падлу, выкінь з надворка. Бачыш, ён яшчэ камандаваць будзе, мацюкацца тут!»

Баючыся, што мужчыны зараз счубяцца біцца, Антоля скочыла з лавы, кінулася да дзвярэй. Яшчэ з сенцаў пачула стрэлы. Адразу паслаблі, падкасіліся ногі. Не цямячы, што здарылася, нутром адчула: бяда. Як непрытомная кінулася з сяней і ўтрупела ад тонкага пранізлівага енку. З гарачкі здалося, што скрыпка гэта Вінцукова галосіць. Аж дайшла да памяці, разабрала: Маня вылічáе...

Юзік іхні яшчэ суткі жыў пасля таго. Паміраў надта цяжка.

Усю тую ноч прасядзела Антоля на гэтым камені з малою Стаськаю на руках. Тулялася з дзіцем па лесе, аж пакуль не пахавалі Хадовічаў...

III

Па тым, як усхадзіліся, зазвінелі кругом камары, Антоля зразумела: блізка вечар. Яна паднялася з каменя, ступіла колькі крокаў непаслухмянымі, задзервянелымі нагамі, але тут жа разрухалася, заспяшалася, спалоханая, што так завідна й не дойдзе да Лемяшоў.

У лесе было яшчэ светла і сонечна. Але ўжо не горача: сонца хілілася на захад і цяпер не смаліла, як удзень, а свяціла праз дрэвы лагодна і мякка.

Пахла багуном, разагрэтаю за дзень смалою, пераспелымі на грудку суніцамі.

Да ўрачыстасці ціха было кругом. Антоля міжволі прыпынілася, уражаная гэтым спакоем і цішаю. Крыўдліва заныла ў грудзях сэрца, што ўсё гэта хараство чужое, што яна, Антоля, любуецца ім неяк употай, як крадучы ўсё роўна, і быццам заўтра ўсяго гэтага ўжо не ўбачыць. Раптам з'явілася ўпартая думка, што анікуды адсюль не паедзе, што мае права тут, на сваёй зямлі, памерці. А што ж, і мае. Чым яна заслужыла, каб чужы пясок ёй на вочы сыпалі... Тут во радзіліся і паміралі яе дзяды і бацькі, тут нарадзілася яна сама і тут, каля іх, ляжа... Стася, дачка, там і без яе дасць рады. Дарослая ўжо, сваю сям'ю мае. А яна во ў пляменніцы дажыве, пры сваіх, колькі ёй тае жыткі асталося. Вандзя дагледзіць, не чужая. Але тут жа ўспомніла сённяшнюю раніцу, калі, стомленая, прыйшла з цягніка ў вёску. Спалоханыя Вандзіны вочы, яе недаўменне, якога не хавала перад цёткаю. І ўсё гэта замест тае радасці, на якую так спадзявалася Антоля, едучы сюды. А што яна благога зрабіла Вандзі, чым пакрыўдзіла? Гадаваць памагала малую, бо сястра хваравекая была, астатнім куском дзялілася...

Ну, няхай Маня Хадовічава гэтак, няхай маладзіца тая чарнявая — чужыя яны. А тут жа радня такая блізкая, кроў адна... А каб сказаў і перад Маняю — чым яна, Антоля, вінавата.

«А то не вінавата.— Аднекуль з глыбіні душы выплыў другі, як не яе, чужы голас, здзекліва запярэчыў.— А хто Гартуна хаваў, як туліняцца стаў пасля расправы з Каснікамі? Каб не памагала яму, жывыя Хадовічы былі б...»

Ага, лёгка сказаць — «каб не памагала». А куды ёй дзецца было? Ды і не верылася, што Уладак тыя Каснікі паліў, людзей сваіх страляў. Не верыла яна. Мала што людзі нагаварыць могуць. І ён бажыўся, дач-

кою кляўся, што не вінен, што не быў і блізка. А хавацца, казаў, мусіць, бо хто там надта разбіраць будзе: быў не быў. Пусцяць кулю ў лоб, не дастанеш. А не чужы ж ён ёй, што там гаварыць. Вот і паліла яна ў печы, як толькі на хутары хто паяўляўся. Дамоўленасць у іх такая з Уладакам была: дым з коміна ідзе, дахаты ехаць нельга...

Антоля як убачыла свае Лемяшы, усе сем хат. Вунь яны паўкругам стаяць, кожная глухою сцяною да лесу, вокны да гасцінца. А гасцінец бег ад Ганевічаў, каля іх хутара вырываўся з лесу, кроіў хутар, як нож круглы бохан, напалам і зноў хаваўся ў лесе, каб выбіцца ўжо аж каля Радзюкоў — бліжэйшай да хутара вёскі. Вунь і Антоліна нізкая, доўгая, сточаная з хлявом хата. Яна стаяла па правы бок ад гасцінца, глядзела маленькімі, на шэсць шыбак, цьмянымі вокнамі на свет, як бы вот і яна, Антоля, сёння глядзіць-углядаецца ў тое сваё мінулае, даўняе. І ўжо бачыць і дымок той над рудою саламянаю страхою, і Уладака на гасцінцы. Ён ківаецца на сваім чырвоным, з выгнутымі ўверх ручкамі, ровары. Не бачыць дыму. І яна, Антоля, толькі цяпер заўважае, што дыму і праўда няма, і ўся аж млее ад страху — у хаце ж чужыя людзі. Пасля ўздрыгвае, прыходзіць да памяці. Ні хаты, ні Уладака — кругом лес і ўсё тая ж вечаровая лагода і ціша, а яна стаіць, ашчаперыўшы гладкі ствол маладой хвойкі здранцвелымі рукамі... З ёю часта бывала такое, надходзіла во гэта відовішча, і Антоля ўпадала ў забыццё, пачынала трызніць, палохала дачку. Стася аніяк не магла ўцяміць, пра які дым шэпча маці як непрытомная. І скажы ты, як малодшая была, па вайне адразу, хоць бы што, не ўспамінала нават. Быццам і не з ёю было тое. Загнала ўсё глыбока ў падпол, у чужых людзях, дзе аніхто нічога пра яе не ведаў, і сама ад усяго адышла. Як бы і не яна, не Антоля, жыла на свеце, а зусім другі, чужы чалавек. І калі іншы раз і

ўспамінала што, то зноў жа, быццам не пра сябе, а пра некага добра знаёмага, але чужога. Душыла сябе работаю. Як праклятая з ранку да вечара на цялятніку. Дахаты прыйдзе, ледзь ногі цягае, а тут яшчэ гаспадарка свая,— Стася малая,— зноў мусіла заводзіцца. Пасля ўжо толькі да падушкі прытуліцца — адразу што забітая. Ні сноў, ні ўспамінаў. А вот цяпер, як пастарэла, на пенсію пайшла, няма ратунку. І, каб сказаў, што думала надта, успамінала — само што адкуль і бярэцца. Лезе і лезе, хоць парачом пары ў вочы: стаіць усё, як жывое. Апошнім часам Хадовічы сніцца сталі. Юзік іхні. Прыйдзе ў хату, у тую, што на хутары была, і яна, Антоля, у той хаце, здаецца. Прыйдзе, стане ў парозе і глядзіць на яе. Ні слова не кажа, глядзіць, і ўсё. А яна месца сабе не знаходзіць, круціцца, што падсмаленая, пад тым позіркам. Слова яму сказаць хоча і таксама не можа. І так, бывала, змучыцца за ноч, хоць не жыві, а расказаць няма каму пра ўсё, няма перад кім пабедаваць, паплакаць, каб палягчэла на сэрцы. Доўга гэтак мучылася, а потым надумалася паехаць сюды. Спадзявалася: адляжа ўсё, адыдзе, супакоіцца. Бо і праўда, што каму яна, Антоля, злога, нядобрага зрабіла тут. Душою перад богам не вінная. І дым во той з коміна, што ўсё перад вачыма стаіць, не ішоў ён тады, калі Уладака забілі. Бо каб ішоў, то не забілі б. Не падпаліла яна ў печы, не падала яму знаку. Лічы, сама забіла. Ніхто — яна, Антоля. Ага, а людзі ж не ведаюць пра гэта. Усе лічаць, што яна памагала яму, што хавала яго. І Маня Хадовічава гэтак думае, ненавідзіць яе. А тут во як выходзіць. Антолі аж дух заняло ад гэтай раптоўнай здагадкі. Захацелася тут жа вярнуцца, пабегчы назад, да ягадніц, да Мані, сказаць пра ўсё. Пра тое, што не запаліла яна тады ў печы. А магла б, магла б, каб хацела. Антолі цяпер і праўда здалося, што магла б яна тады ў печы падпаліць. Ну, вядома. Каб во як згледзела толькі, што не-

знаёмыя ад хлява да хаты ідуць, каб не чакала іх, а ў хату адразу і — агонь у печ. Трэскі ж там напагатове ляжалі. А то ж не, стаяла што ўкопаная. Цяпер ужо яна не думала, што ад страху тады скамянела, што потым схітраваць хацела. Думала, сустрэне мужчын на ганку, скажа, што нікога ў хаце няма, яны й пойдуць. Але не ўдалося так, як думала. Гэта ўжо яна пасля датумкала, што памылілася, калі першага з трох пазнала — прысадзістага чарнявага Косціка з Каснікоў. Ён да Хадовічаў часцяком заходзіў, як бы ў Вінцука на скрыпцы граць вучыўся. Яна й тады здагадвалася, што не так сабе ўсё гэта, што Уладака ён выцікоўвае, і курала з коміна, аж пакуль Косцік з хутара не сыходзіў.

А тут — на табе. Стаіць і варухнуцца не можа, як зачараваная. А яны ідуць утрох. Тыя, што ззаду, незнаёмыя. Можа, таксама каснікоўскія, бо не ўсіх адтуль ведала.

Падышлі. Павіталіся. Усё як след. І яна адказала. Вады папрасілі, як бы падарожныя якія. У яе дух адкаціўся, замітусілася: зараз, зараз, мужчынкі. Вядро вынесу, халодненькай дастанеце...

Косцік тады спыніў яе адразу:

— Не трэба халодненькай. Мы з кубка, у хаце, летнюю любім...

Ступіў на ганак, крэпкі, раскарачысты, адхіліў яе ўбок, дзверы ў сенцы піхнуў. І тыя двое следам. А яна ўжо за імі.

— Гаспадар дзе? — Косцік за сталом, на покуці сядзеў, калі яна ўвайшла.

— На службе. У Ганевічах, дзе ж яму быць.

— Ранні ён у цябе, старанлівы...

Яна толькі плячыма паціснула і, не ведаючы, што далей рабіць, куды дзець сябе, па лаве фартухом шарганула: сядайце, мужчынкі. Бо тыя, двое, не праходзі-

лі, у парозе стаялі. Але яны як не чулі. З Косцікам перамігнуліся, з хаты выйшлі.

Заплакала, прачнулася ў калысцы дзіця. Яна падышла да калыскі, учапілася за край непаслухмянымі рукамі, задугала яе сюды-туды па падлозе. Дзіця аціхла. Маўчаў за сталом Косцік. Незнаёмыя тым часам, праз акно змеціла, зайшлі ў гародчык, схаваліся за высокім кустом жоўтай вяргіні. Тады ўжо сумнення не асталося: будуць чакаць Уладака. І разам з гэтаю здагадкаю прыйшла, абняла ўсю абыякавасць. Каб во ў той момант, здаецца, навёў на яе Косцік сваю стрэльбу — не варухнулася б, не папрасілася б. Абыякавая, мляўкая цішыня стаяла ў хаце. Ціха было на двары.

Косцік на Антолю не глядзеў. Сядзеў, павярнуўшыся бокам да акна, пазіраў на гасцінец. Ён, напэўна, як і яна, ведаў, што Гартун зараз павінен ехаць дахаты. Час блізіўся да палудня. Яго няўмольна адлічвалі ходзікі на сцяне: так-так, так-так, так-так. А яна сядзела ў нейкім дзіўным здранцвенні, як бы ўсё гэта, што адбывалася тут, у хаце, да яе самой не мела аніякага дачынення. Толькі чула, як варочаецца ў грудзях колкім камяком, цісне пад сэрца жаль да сябе. Вот і пажыла на свеце. З самага маленства ў горы. Пакуль на ногі паднялася, кідалася, як гарох пры дарозе, потым па чужых людзях служыла, хлеба кусок зараблЯла, бо самая старэйшая ў бацькоў была. Потым замуж во гэты. Пайшла абы пайсці. Напачатку ўсяго было. Але ж неяк усё прыцерлася, прыцярпеліся адно да аднаго. Дачка нарадзілася, жыць па-людску сталі. На табе — вайна праклятая пачалася. Ён у гэту службу ўлез, чортам зрабіўся. Не шкадавала яго цяпер. Ні трошачкі. Помсліва праходзіла па душы адно: заслужыў — хай мае. Не слухаў яе... І ўсё ж недзе глыбока-глыбока, на самым дне душы, чула, варушыцца жаль да яго. Хоць і не хацела, а перад вачыма, як на злосць, плыло, мільгала тое нямногае, харошае, што было з ім.

І тады яна пачынала трывожна пазіраць на печ, на складзеныя на прыпечку пад трыножкаю трэскі, на запалкі ў пячурцы. Але нешта трымала яе, не давала ўстаць, не давала парухацца. Можа, той роспачны Манін крык, што ўсё яшчэ стаяў у яе ў вушах, можа, Хадовіч з сынам на абмежку пад дзічкаю. Абодва ў белых кашулях, нерухомыя. Яны ўсё бачыліся ёй. Шкадавала найбольш Юзіка іхняга. Малады такі, добры быў... За што было людзей біць, за што? Па суседству, як родныя жылі... Не, заслужыў — хай мае. Ёй адно цяпер: дачку ратаваць трэба. Не была пэўная, што не зачэпяць. А дзіця ж не віннае... І таму, як толькі згледзела праз акно на гасцінцы Гартунову постаць, як толькі скочыў з-за стала і кулём вылецеў на двор Косцік, не стала марудзіць. Ухапіла з калыскі сонную малую, шмарганула з сцяны нейкую адзежыну і вышмыгнула з хаты...

Стрэлы пачула, калі ўжо бегла па жыце да лесу. Адтуль, з лесу, стаіўшыся ў грабняку пры беразе, глядзела, як гарыць хата. Ніхто яе не тушыў. Нідзе не было ні душы. Ні на адным падворку. Людзі як вымерлі. «Вот табе і суседзі»,— падумала роспачна, з крыўдаю. Але тут жа апомнілася, адразу ўсё зразумела. І тады ўжо, не думаючы, кінулася з дзіцем праз лес куды вочы глядзяць, абы далей ад гэтага месца...

IV

Праз частыя, калючыя зараснікі кусцістага граба Анатоля прадзіралася да берага. Ён ужо добра бачыўся, праступаў светлымі лапікамі прасторы, зіхоткімі промнямі сонца, якое апускалася ўсё ніжэй і ніжэй. Нарэшце хмызняк скончыўся, і яна спынілася перад шырокім паўкругам жытнёвага поля. Ад яго спелай жаўцізны аж закалола ў вочы. Яшчэ не цямячы добра, куды выйшла, пачула, як загучала ў душы нядаўняе, све-

жае: «Хутароў тых даўно няма. Скрозь жыта расце...» Тут жа зразумела: гэта і ёсць Лемяшы!

Антоля круціла галавою, падслепавата мружачы вочы, старалася ўгледзець хоць што-небудзь з таго, што было тут даўней, што яна помніла, дзеля чаго сюды перад смерцю ехала. І такі ўгледзела. Якраз пасярэдзіне поля, у правы бок ад гасцінца, у яркіх промнях нізкага ўжо сонца зіхцела круглая крона старой дзічкі. Не зводзячы з яе вачэй, Антоля ступіла ў жыта. Нечакана наляцеў з таго боку, не па-летняму холадна дыхнуў вецер. Жыта захвалявалася, паплыло ёй насустрач, пругкай сцяною ўпіралася ў грудзі, не давала ісці. Ногі стомлена блыталіся ў бярозцы, чаплялія за сцебле, рукі не хацелі адводзіць каласы, і яны білі па твары шорсткімі, калючымі асцюкамі. У роце ў яе перасохла, і была там такая нясцерпная гаркота, бы хто знарок нацёр і насыпаў туды палыну. Кружылася галава: толькі цяпер успомніла, што з самага ранку яшчэ нічога не ела...

Чым бліжэй падыходзіла Антоля да дзічкі, тым яскравей праступала перад вачыма ўсё, аб чым думала, што сёння так пакутна ўспаміналa. Зноў ажыла, загучала ў памяці Вінцукова скрыпка, і яна як убачыла іх абодвух, бацьку і сына, пад гэтаю грушаю, на абмежку, сярод яркай веснавой руні.

Трывожачы душу, паплыў над полем адчайны Манін крык: «А татачка, а браточак мой...» Як не верачы сабе, Антоля азірнулася, пасля стаілася, услухалася. Шапацела лісцем старая дзічка, і стогалоса стракаталі ў жыце польныя конікі. «Цы-цы-цы-цы»,— неслася адусюль, сцякалася да яе з усяго поля. Быццам нехта нябачны дражніўся з ёю, пачынаў і не дагаворваў тое, чаго яна так баялася, не хацела чуць. І ўсё ж чула. Яно стаяла ў душы, нядаўняе, крыўднае: «А ты не пазнала? Гэта ж Цыба Гартунова...» Падумала, што так во і памрэ Цыбаю і астанецца ёю навек і для Мані,

і для Вандзі, і для тае чарнявае маладзіцы... Не. Яна мусіць расказаць ім усё. Усё, як было. Каб ведалі, каб не думалі... Антоля павярнулася, хутка, не азіраючыся, пайшла прэч ад дзічкі.

Яна спяшала, ледзь не падала, як баючыся, што спозніцца, не дойдзе. І хоць не азіралася, адчувала, што дзічка ўсё тут, побач, за плячыма, што яна ніяк не можа адысці ад яе, хоць на крок аддаліцца.

Чырвона-крывавая крона старога дрэва то пагрозліва выцягвалася над галавою, і тады гарачыня біла Антолі ў твар, то зноў круглела, ператваралася ў агністае, нясцерпна пякучае воблака. Воблака навісала над ёю, сядала на плечы, душачы, ціснучы долу. Але яна ўсё ішла, упарта перастаўляла слабыя, непаслухмяныя ногі.

Ды поле чамусьці не канчалася, перад вачыма балюча трымцела яго бязмежная жаўцізна.

Антоля адчула, як нечакана моцна дыхнула ёй у твар водарам перасохлай зямлі, змешаным з ледзь улоўным пахам васількоў і рагулек, як тут жа нешта балюча, аж заняло дыханне, штурхнула яе ў грудзі...

Расступілася на момант і зноў злілося, закалыхалася цяжкое, налітае ўжо калоссе...

Жыта на былым хутары расло высокае і густое.

Блізка вясна

За цёмным незавешаным акном шалеў вецер. Здавалася, нехта нябачны ў вячэрнім змроку злосна тузае гэта акно сюды-туды, спрабуе адчыніць. Слаба падагнаная рама дрыжэла, бразгацела, але не паддавалася. І тады, той, нябачны, са злосцю шпурляў у шыбіну жмені дробных снежных круп, ізноў пачынаў адчайна тузацца і бразгаць.

Нечаканая, пасля першых, па-вясноваму цёплых дзён, на двары бушавала завея.

У вялікім напаўпустым пакоі, як і за акном, было холадна і няўтульна. Неяк адразу, усім нутром адчуўшы гэты холад, Віка сцепанулася, падняла вочы. Ярка гарэла настольная лямпа; Анатоль па-ранейшаму сядзеў за сталом, і вочы яго, невялічкія, вузкія шчылінкі, сцераглі кожны яе рух. Ад гэтых ягоных вачэй, як ад холаду, Віка ізноў здрыганулася, зябка пацiснула плячыма. Заўважыўшы, што дзяўчына ўрэшце варухнулася, Анатоль зноў пачаў, як відаць, даўно перарваную гаворку. І голас яго, здавалася, зліваўся з выццём ветру, губляўся ў ім, даходзіў да яе слаба, як праз сцяну:

— Ну, дык што, можа, усё-такі надумалася? Аставайся, я табе сур'ёзна кажу. Па-першае, чуеш, сабакі не выгнаць — бушуе, а па-другое...— ён памаўчаў, падбіраючы патрэбныя словы,— няўжо ты не разумееш, што, каб рашыцца на нешта сур'ёзнае, аднаго пачуцця мала. Нам трэба вельмі добра адно аднаго ведаць. Ва ўсіх адносінах...

— У якіх адносінах, Толя? — сіплым, ледзь чут-

ным пасля доўгага маўчання голасам спытала Віка, неяк сумна, бездапаможна ўсміхнулася. Здавалася, яна яшчэ больш сціснулася, стала амаль нябачнай у глыбокім, вялікім крэсле.

Анатолю нечакана стала шкада дзяўчыны. Ён як упершыню ўбачыў, якая яна худзенькая, кволая і безабаронная. Анатоль парывіста падняўся з-за стала, ступіў да яе, паклаў рукі на плечы. Віка не варухнулася. Упершыню дотык ягоных рук пакінуў яе спакойнай і безуважнай. Як бы і не рукі гэта ляглі на яе плечы, а так, нешта цяжкае націснула зверху. Захацелася страсянуцца, каб скінуць з сябе гэты непатрэбны цяжар. Быццам адчуваючы яе настрой, Анатоль адняў рукі, нервова захадзіў па пакоі. Счакаўшы, загаварыў амаль пра тое, пра што якраз думала сама Віка.

— Ты вот лічыш, што я сумны і нецікавы рэаліст. Мала ў мяне, як у некаторых, рамантыкі, я не пішу вершаў, не ўмею прыгожа і шмат гаварыць, называю рэчы сваімі імёнамі. Чорнае для мяне чорнае, белае — белае. Ружовага я ніколі не бачыў і не веру ў яго. Але, зразумей правільна, гэта значна лепш, чым бачыць толькі ружовае, жыць ім, глядзець на свет, як на нейкую забаўку. Такіх поглядаў жыццё звычайна не даруе, і чалавек не вытрымлівае першага ж сур'ёзнага выпрабавання... Я не хачу, каб гэта сталася з табою, Віка.

Анатоль асцярожна, як крадучыся, падышоў да яе, зноў паклаў рукі на плечы. На гэты раз Віка не вытрывала, здрыганулася, атрасаючы іх. Але ён як не заўважыў гэтага. Стоячы за спінкаю крэсла, нахіліўся над ёю, лёгка, як малую, пацалаваў у галаву, зноў захадзіў з кута ў кут.

Віка па-ранейшаму нерухома сядзела ў крэсле. Гледзячы на яе спакойны, застылы твар і прыплюшчаныя вочы, здавалася, што дзяўчына незнарок заснула. І толькі тое, як яна сядзела, як моцна трымалася за

ручкі крэсла, выдавала вялікае напружанне, што жыло ў ёй.

Анатоль нутром адчуваў у дзяўчыне гэту напятасць, яна перадавалася і яму, руйнавала ў ягонай душы звыклы спакой і ўпэўненасць, раздражняла. Ён вось-вось быў гатоў узарвацца, але стрымліваў сябе. Раптам здалося, што Віка бачыць яго наскрозь, разумее тое, што ён так старанна хаваў за доўгімі і нуднымі, аж самому праціўна, развагамі. «Ну, дык і што ж, што бачыць, што разумее... Даўно пара. Прыкідваецца авечкаю. Як усё роўна з другога цеста зьлеплена, не такая, як усе...» Ён ужо раздражнена, куды падзелася ранейшая пяшчота і шкадоба да яе, акінуў Віку позіркам, і вузкія шчылінкі яго вачэй зусім прапалі, зліліся ў адну цёмную рыску.

«Кожная цаца патрабуе асаблівага падыходу, асаблівай увагі да свае персоны. Іш ты. Нават такая правінцыялачка, а туды ж...» Здзівіўся цяпер, што колькі месяцаў таму ўсур'ёз захапіўся ёю, гэтулькі часу валэндаўся.

...Яны пазнаёміліся на вечары студэнцкіх будатрадаў на філфаку. Яшчэ падчас канцэрта, які па традыцыі быў наладжаны студэнцкімі агітбрыгадамі, Анатоль прыкмеціў танклявую, светлую дзяўчыну. Вялікія сумныя вочы і пышныя русыя валасы, што свабодна рассыпаліся на плячах, рабілі яе, далёка не красуню, прывабнай і нейкай асабліва загадкавай. Віка тады са сцэны чытала вершы. Прыемны, глыбокі голас надаваў дзяўчыне яшчэ больш таямнічасці, і Анатоль ужо адчуваў, што яна яму падабаецца. Таму, калі пасля канцэрта пачаліся танцы, ён адразу ж адшукаў яе вачыма, упэўнена падышоў, запрасіў на танец. Віка танцавала лёгка і добра. Падатліва слухала кожнага яго руху. Анатолю было асабліва прыемна адчуваць гэтую

яе пакорнасць. Яны неўпрыкмет разгаварыліся, пазнаёміліся. Аказалася, што яна, як і ён, студэнтка пятага курса. Адно толькі, што ён вучыўся ў радыётэхнічным інстытуце, а яна — тут жа, ва універсітэце, на філфаку.

Высвятлілася таксама, што прыехала яна з невялічкага раённага цэнтра і што пры размеркаванні ёй, канешне, свеціць не што іншае як якая-небудзь вясковая школа. Добра, каб у сваім раёне. Пра гэта з лёгкім сумам паведаміла Анатолю сама Віка. Ён быў мінчанін і не мог зразумець, як гэта з Мінска абавязкова некуды трэба ехаць, асабліва ў вёску. А таму адразу стаў горача пераконваць дзяўчыну, што ёй трэба астацца ў сталіцы, бо ў вясковай глушы яна загубіць і сябе і свае здольнасці. Віка міла ўсміхалася, няпэўна паціскала плячыма, як бы гаворачы, што зробіш? На яго ж прапанову праводзіць яе да інтэрната адмоўна хітнула русявай галавою:

— Э, не. Праважаты ўжо ёсць. Мой верны рыцар. Вунь, бачыце, стаіць у кутку і раўніва сочыць за кожным маім рухам.

Анатоль зірнуў у той бок, куды глядзела Віка, і ў кутку актавай залы ўбачыў адзінокую фігуру невысокага, у акулярах хлопца. Насуплены выгляд, крыху прыўзнятыя вострыя плечы і непаслухмяныя віхрастыя валасы рабілі яго дзіўна падобным на ваяўнічанастроенага вераб'я. Анатоль міжволі засмяяўся:

— Ну, гэта сапраўды рыцар. І я тут — пас.

Віка таксама ўсміхнулася, але тут жа [redacted] гонарам дадала:

— Гэта наш паэт. Алесь Заполіч. Дарэчы, ужо даволі вядомы. Друкуецца. І нават у тоўстых часопісах.

— О, ну тады гэта зусім сур'ёзна.

— А хочаце, я прачытаю адзін яго верш...

Сярод гулу і грому музыкі Анатоль пачуў і нават запомніў чатыры радкі з гэтага верша:

У залу ты сышла са сцэны.
Богатварыўшы твой парыў,
Шчаслівы самы, летуценны,
Цябе, як зорку, я адкрыў.

Было ясна, што паэт сур'ёзна закаханы ў Віку. І верш гэты напісаны дзеля яе і пра яе. Але, нягледзячы на такое адкрыццё, Анатоль усё роўна прапанаваў «зорцы» сустрэцца назаўтра вечарам. Яна згадзілася. З таго часу яны пачалі бачыцца часта.

...За акном, у цёмным халодным бяздонні, бушаваў вецер. Ляцелі і білі ў шкло сухія снежныя крупы; стукала ў шыбу, прасілася ў хатняе цяпло азяблая, настылая галінка старога клёна. Жаласліва рыпелі пад цяжкімі Анатолевымі крокамі масніцыны рассохлай падлогі.

Віка расплюшчыла вочы, міжволі заглядзелася на яго, высокага, дужага, упэўненага. Менавіта гэта ўпэўненасць і сіла з першага дня іх знаёмства, як магнітам, пацягнула Віку да хлопца. З Анатолем ёй было спакойна і добра. Чаму ж тады сёння ён так раздражняе яе? Не, ён тут ні пры чым. Проста дзень сёння такі. Цяжкі дзень у іх на курсе. Віка зноў прыплюшчыла вочы і ўбачыла шумны натоўп аднакурснікаў каля дэканата, узбуджаныя твары, позіркі, скіраваныя на дошку з аб'явамі. З раніцы там вывесілі спіс абласцей і раёнаў для размеркавання іх 5-га курса. Віка таксама прашылася да тых белых лісцікаў з адрукаванымі назвамі, але ніяк не магла засяродзіцца. Вочы перабягалі з назвы на назву, з раёна на раён, але ўсё здавалася аднолькава чужым і далёкім. Нават свой райцэнтр, які яна ўрэшце заўважыла ў спісе, не сагрэў, не абнадзеіў. Наадварот. Шукала іншага і не знаходзіла. Ні Мінска, ні нават Мінскага раёна ім не прапанавалі. Пачула, як усю яе, аж паслаблі ногі, агарнула пякучая роспач. Вось і ўсё. І бывай сталіца. І ўсе

прыгожыя мары, і надзеі, і сябры, і тэатры. Усё. Вучылася, старалася, на чырвоны дыплом цягнула, а ўсё роўна, як кажа Анатоль, вясковая школка свеціць...

У інтэрнаце, куды яна прыйшла разам ■ дзяўчатамі, панаваў усё той жа вэрхал. Назаўтра мелася быць папярэдняе размеркаванне. Праўда, дзяўчаты з яе пакоя былі надзіва спакойныя — кожная наважылася прасіць свой раён, і гэта яшчэ больш прыгнятала Віку. Ніхто не падзяляў яе роспачы. Ды яна нікому нічога і не казала. На пытанні сяброўак няпэўна паціскала плячыма — яшчэ, маўляў, не вырашыла.

Але найбольш здзівіў Віку Алесь Заполіч. Ён віхрам уляцеў у іх пакой, раскінуў на стале карту Беларусі:

— Які прастор, дзяўчаты! Выбірайце сабе любы запаветны куточак — глядзіце...

Ён вадзіў рукою па зялёна-блакітным полі карты, як лашчыў усё роўна.

Віка здзекліва хмыкнула:

— Ну, а ты які сабе выбраў, цэнтр Мінска?

Ён паправіў акуляры, запытальна глянуў на яе, шырока ўсміхнуўся:

— А гэта мы зараз...

Рашуча зняў акуляры, затуліў адною рукою вочы, другую выцягнуў у бок карты, ваўчком закруціўся на месцы і торкнуў наўгад указальным пальцам.

Дзяўчаты адразу зразумелі яго, кінуліся да стала, і не паспеў ён разняць вачэй, дружна зарагаталі.

Віка не падышла, не пацікавілася. Яе злавала гэта незразумелае Алесева дзівацтва, яна не магла ў яго паверыць. Знайшоў жарты.

А ён спакойна згарнуў карту, сур'ёзна сказаў:

— Трэба вяртацца туды, адкуль выйшлі...

У нейкі момант Віка ўсё гэта жыва ўбачыла, здалося, пачула глухаваты Алесеў голас і зноў сціснулася, бездапаможна азірнулася.

Анатоль стаяў спінаю да яе, глядзеў у акно. Ёй захацелася прытуліцца да яго, схавацца за гэтыя шырокія, моцныя плечы. Яна варухнулася, ціха паклікала:

— Анатоль!

Ён рэзка павярнуўся. Убачыла, як пільна, насцярожана ён глядзіць на яе. Цяпер толькі заўважыла, якія ў яго маленькія калючыя вочкі, якія тоўстыя, як вывернутыя вусны, які ўвесь ён чужы і незразумелы, і скаланулася. Усю пранізала халодная і ясная думка: «Я не кахаю яго. Не кахаю... Чаго я тут? Навошта?..»

Успомніла, як званіла яму з інтэрната ў той неастылай, трывожнай роспачы, як пытала дазволу прыехаць, як ехала, а потым бегла да гэтага дома. Хутчэй, хутчэй... А ён нават не запытаў, што здарылася. А што, што здарылася?

Гарачы сорам, як вар, заліў усё нутро, плямамі выступіў на твары.

— Ну, што Анатоль, што Анатоль? Я ўжо дваццаць пяць гадоў Анатоль...

Ён падышоў да яе, прыкленчыў каля крэсла, стараўся зазірнуць у вочы.

— Слухай, Віка, ты праўда кахаеш мяне?

— Анатоль...

Ён узяў яе халодныя пальцы ў свае вялікія цёплыя рукі.

— Віка... Астанься ў мяне сёння, калі яшчэ будзе такі выпадак у нас? У цябе інтэрнат, дзяўчаты ў пакоі, у мяне бацькі штодня дома. Раз у год выбраліся ў госці...

Ад яго ціхага, сцяроджкага шэпту яе скаланула, працвярозіла. Нечакана для сябе, з усяе сілы штурханула яго ў грудзі, з нянавісцю выдыхнула:

— Пусці!

Убачыла, як хістануўся ён на сагнутых нагах, упёрся рукамі ў падлогу, ускочыла з крэсла.

Не помнячы сябе, выбегла ў прыхожую, ухапіла з вешака паліто, піхнула дзверы.

...Яна доўга бегла. Не азіралася. То хутка, хутка, да шалёнага біцця сэрца, то прыцішвала бягу, прыслухоўвалася, тады зноў бегла. Урэшце зняможана прытулілася шчакою да халоднага, гладкага ствала маладога каштана, азірнулася. На вуліцы было нязвыкла пуста і ціха. Вецер улёгся, пасвятлела і вызарылася на пагоду неба. Віка глыбока ўздыхнула і раптам усёю істотаю адчула ледзь улоўны пах свежай зямлі, набрынялай драўніны. Аднекуль з поўдня ў яе родную Беларусь ішло сапраўднае цяпло, ішла вясна. Успомнілася нядаўняе Алесева: «Мы павінны вяртацца туды, адкуль выйшлі...»

Віка адарвалася ад каштана, пайшла па начной вуліцы спакойна, упэўнена.

Фэлькавы яблыкі

Яшчэ звечара Фэлька Шымуль выбіраўся на рынак. Дамовіўся з брыгадзірам і завідна прыгнаў з пашы каня, укасіў і падкінуў яму ладную дзяругу атавы і стаў парадкаваць воз.

Яго кабета, невысокая, рухавая, цягала з садку пудовымі кошыкамі і ссыпала ў палукашак дачасна абтрэсеныя ветрам яблыкі. Тавар, канешне, не бог ведае які, але гэта мала турбавала Шымуліху. З даўняй сваёй практыкі яна ведала: пойдуць і такія, абы былі. «Горад усё з'есць»,— горнучы з вялізнай, набранай за цэлы тыдзень кучы ўлежаныя, прывялыя ападкі, супакойвала сама сябе Ганця.

Яна ўжо добра-такі натамілася, і цяпер яе разбірала злосць на маруднага ў рабоце гаспадара. Фэлька ўсё яшчэ тыцкаў шмаравідлам у чорную вось — мазаў колы. Урэшце кабета не вытрывала — марсканула на зямлю пусты кошык, зашморгала пляскатым, што прыліпаў да верхняй, рассечанай яшчэ ў раннім дзяцінстве, губы носам. За гэтае шморганне і за гэту губу Шымуліху празывалі ў вёсцы Трускаю.

— Ці доўга ты будзеш тыцкаць, каб ты ўжо затыцкаўся? Я ўсе яблыкі сцягала, чыста рукі гэтымі кошыкамі павырывала, а ён усё тыцкае.

Фэлька толькі крэкнуў, яшчэ бліжэй падсунуўся да кола, але змоўчаў. Ганця якую хвіліну пастаяла над ім, ваяўніча ўпёршы рукі ў бокі, і, ведаючы, што ўжо не даб'ецца ад гаспадара ні жаднага гуку, зараз жа адступілася, падняла кошык, шморгаючы носам, зноў падыбала ў садок.

Калі яна ўжо брала з зямлі апошнія яблыкі, змеціла, што сюды, пад яблыні, несучы перад сабою доўгі, на высокіх ножках, зэдаль, ідзе Фэлька.

Гэтак было заўсёды, як стаў радзіць іхні садок і яны пачалі вазіць яблыкі на рынак. Ганця ведала, што зараз ён падставіць зэдаль пад адзіную ў садзе ранету, узлезе на яго сам і пачне асцярожна, бы яны шкляныя, здымаць з сукоў самыя большыя, з чырванаватымі бакамі яблыкі і гэтак жа асцярожна, як баючыся пабіць, будзе класці іх у новы жоўты кошык з адкладным вечкам.

Тут жа адчула, як вярнулася, тарганула нутро даўняя злосць: ніяк не магла даўмецца, на якую трасцу ён цягае сюды-туды гэты кошык. Ведала, што так во паўнюткі, некрануты прывязе яго з рынку дахаты. Але чапаць у такія моманты гаспадара не смела. Яна ўжо была навучана за цэлае жыццё з ім, калі, як і што можна сказаць ці зрабіць. І навука гэта, трэба прызнацца, далася ёй нялёгка. Пакуль жыць будзе — будзе помніць і ляйчыну тую, у цэбры загадзя вымачаную, і пісягі чырвоныя, што па тыдню, бывала, ніжэй спіны гарэлі. Іншы раз вырабіцца ад яго, праз усю вёску, як мага, да бацькавай хаты кінецца. А што ў той хаце? Матка з ёю разам паплача, пагаруе, а бацька — ні слова. Пайшла — жыві, ніхто, маўляў, сілком не пёр, сама галыша гэтага выбрала, цешся цяпер. Стары да смерці адпусціцца не мог, што ў галоту ўвалілася. Шымулі тады ў іх вёсцы найбяднейшыя лічыліся. Пяцёра сыноў у Павэлкі Шымуля было, а зямлі — зайцу хвост палажыць. Ды, як кажуць, хоць адным бог не пакрыўдзіў: хлопцы ўсе як на падбор выраслі: харошыя, відныя — як падняліся на ногі — разышліся ўсе, хто куды. Па маёнтках служылі, у асаднікаў. Адзін Фэлька, самы малодшы, пры бацьках астаўся. А таксама ж прыгожы быў. Гэта цяпер ён ужо здаў, зусім не той стаў цяпер — Ганця глянула на свайго старога,

на яго прыгорбленую постаць пад яблыняю, на зморшчаную, худую шыю, якую ён старанна выцягваў, выглядваючы на суках лепшыя яблыкі, і ўсю яе агарнула нечаканая шкадоба да яго. Яна ціхенька падышла да зэдля, узялася за кошык, каб аднесці на воз, але Фэлька тут жа страпянуўся, як баючыся, што яна не пачуе, крыкнуў моцна, на ўвесь садок:

— Не руш! Я сам! Не чапай кошыка!

Ганця сцялася, моўчкі адступіла, пайшла дахаты...

У дарогу Шымулі выбіраліся зазвычай рана, яшчэ да свету. Так во і сёння: не заспявалі ў вёсцы першыя пеўні, а Ганця пачала ўжо штырхаць свайго чалавека:

— Уставай, Фэлька, чуеш? Уставай. Відняць зараз пачне. Пакуль дакалываемся да таго места — свет не блізкі. І конь такі — шоры ледзьве цягае...

Хоць Фэлька і не спаў, ён не варухнуўся, не азваўся. Ён увогуле гэту ноч не зlажыў нават вокам і штогадзіны падумваў, ці не пара падымацца. Але цяпер, як толькі пачуў жончына шморганне, у душы, як то здаралася з ім кожны раз, раптам паднялося ўпартае жаданне зрабіць па-свойму, абавязкова ёй насуперак.

Ляжаў Фэлька апрануты, нават не скідаў ботаў, не рассцілаў пасцелі. Управіўшыся, прыгатаваўшы ўсё ў дарогу, так во прылёг на пару гадзін, а заснуць, хоць і быў стомлены, як ні стараўся, не змог. А можа, таму й не заснуў, што быў у адзенні, у ботах. Нязвычна. Але не. Хутчэй за ўсё не спалася яму ад блізкага дарожнага клопату, ад нейкага няяснага, незразумелага хвалявання, якое невядома чаго так во надходзіла на Фэльку перад дарогаю. І каб сказаў першына была яму ехаць на той рынак. Колькі ён за свой век ад'ездзіў туды, колькі ўсяго перапрадаваў, як гаспадаром стаў, а ўсё вот прыходзіць у душу неспакой, як толькі мустане выбірацца ў горад. А сёння асабліва грызе, мучыць ён Фэльку. І ўжо не таму падымаецца ён урэшце, што аж асіпла, будзячы яго, Ганця, а ўстае, бо і сам

разумее, што пара ўставаць, што цягнуць далей няма куды — дарога й праўда — няблізкая.

Ён стаіць які час каля ложка, калываецца, як п'яны, на слабых, мляўкіх ад бяссоння нагах, адчуваючы, як задзеравянела за ноч і не хоча распроствацца яго цела, як ные яно, старэчае, дабітае ўшчэнт цяжкою штодзённаю працаю. Фэльку разбірае раптоўная злосць, што трэба во гэтак, сярэдначы, недзе перціся, што нельга нават у нядзелю спакойна адпачыць, даўжэй паспаць. З ягоных вуснаў ужо гатовы сарвацца злыя крыўдлівыя словы на Ганцю, бо гэта ж усё ёй мала, бо гэта ж яна грошай ніяк не наесца, але раптам ён успамінае новы жоўты кошык у палукашку, вялікія, з чырванаватымі бакамі яблыкі і стрымліваецца. Па душы цёплым струменем праходзіць тое няяснае хваляванне, якое не дало яму заснуць сёння ноччу. І Фэлька толькі недавольна хмурыць бровы, зыркае з-пад ілба на Ганцю, якая нецярпліва топчацца побач, і, нічога не сказаўшы, ідзе на кухню. Там, упоцемку, бразгаціць аб вядро вялікім алюмініевым кубкам, п'е цеплаватую з ночы ваду. Потым з гэтага ж кубка плюхае сабе на рукі, абмывае твар. І, адчуўшы, як паступова вяртаецца да яго бадзёрасць, намацвае на цвіку за печаю новую ватоўку, выходзіць на вуліцу.

На дварэ яшчэ ноч. Цёплая, месячная. Якую хвіліну Фэлька нерухома стаіць на ганку, глядзіць, слухае. Незнаёмым і дзіўным выдае яму ўвесь падворак, заліты ясным, белым святлом поўнага месяца, чужымі здаюцца прыгорблены хлевушок у канцы падворка, старыя бярэзіны каля плота, круглыя цёмныя кроны яблыняў у садзе.

Ціха вакол. Так ціха, што далёка чуваць, як хрумстае маладую атаву прывязаны пад бярозаю Каштан, і, здаецца, на ўвесь свет стракочуць нябачныя ў траве конікі.

Фэлька глыбока ўздыхае, убірае ў сябе празрыстае, аж коле ў грудзях, паветра, ідзе запрагаць каня...

Яшчэ не пачынала світаць, калі яны ўехалі ў вялікі Рымараўскі бор, і ўжо далей, да самага горада, дарога ішла гэтым старым, дрымучым борам.

Даўней лес гэты і дарога былі падарожнікам небяспечныя. Людзі так во, паасобку, не ездзілі ні на кірмашы, ні з кірмашоў: заступалі зладзеі, адымалі і тавар, і грошы. Гаспадары, бывала, яшчэ за тыдзень дамаўляліся адзін з адным, каб ехаць разам. А цяпер тут спакойна — хоць начуй на возе або пад якою елкаю...

Ціха коцяцца шчодра змазаныя звечара колы, парыпвае злёгку вупраж, пфыркае раз-пораз Каштан, ідзе павольнаю, размеранаю хадою. Падганяць яго — марная справа. Хутчэй ісці гэты стары, спрацаваны конь не можа, але затое і кіраваць ім не трэба: ён сам добра ведае дарогу. І Фэлька, лежачы ў возе, толькі што трымае ў руках лейцы. Прыгрэлася пад кажухом, даўно задрамала і цяпер сонна дыхае за плячыма Ганця.

Фэлька радуецца і гэтай цішыні, і сваёй адзіноце, а найболей таму, што ён можа во гэтак нерухома ляжаць, глядзець праз вузкі прасвет між ялінамі ў цёмнае, усыпанае зорамі неба, на круглы месяц, што неадступна плыве за імі, адно зрэдку хаваючыся то за шэрую парваную хмарку, то за чорную вершаліну высокага дрэва і думаць, думаць. Пра ўсё на свеце. Вот цяпер Фэлька думае, што за ўсё сваё жыццё, колькі ён ходзіць па гэтай зямлі, колькі ездзіць такімі вот начамі ў горад, а ніяк не можа налюбавацца ўсім гэтым, нацешыцца, наглядзецца на ўсё.

«Чорт яго, як у апошні раз, як перад смерцю ўсё žoроўна,— здзіўлена думае Фэлька.— А хто ведае, можа, і ў апошні. Людзі рэдка пра тое думаюць, колькі ім жыць на свеце адведзена. Як паглядзіш на каторага, дык здаецца, ён вечнасць жыць збіраецца: горне,

цягне, а хвіліна тая падыдзе — раз, і ўсё. І нічога не трэба... Ды і ён, Фэлька, ці думаў калі пра гэта во так, як сёння...» І ўжо зусім па-новаму зноў глядзіць Фэлька на загадкава-ціхі месяц у небе, на мігатліва-недасяжныя зоркі, на зялёныя агеньчыкі светлякоў у цёмнай глыбіні маўклівага лесу і халадзее ад думкі, што й праўда ж яно некалі станецца і для яго, для Фэлькі Шымуля, што ўсяго гэтага не будзе. Што не вечная гэта дарога ў горад, не вечны салодкі пах яблыкаў у палукашку, змешаны з пахам вупражы, конскага поту і прывялай атавы, з усімі тымі звыклымі, такімі роднымі, здаецца, такімі вечнымі пахамі. І заміраe Фэлька ад гэтай думкі, нерухомее ад яе рэальнай, цвярозай яснасці і неадступнасці. І тут жа ў душы пачынае апраўдвацца перад некім нябачным, што рана яму яшчэ адыходзіць адсюль, бо несправядліва гэта, бо што ён там надта пажыў на свеце, і то ўсё, лічы, у горы. Цяпер во лягчэй стала, узбіўся на нешта людчэйшае, то вельмі ж яно нядобра акурат цяпер адыходзіць.

І пачынаў Фэлька таму, нябачнаму, жыццё сваё расказваць, як яно ўсё ў яго склалася. І зноў выходзіла, што як бы апраўдваецца Фэлька, што не так бы ён усё хацеў, але вот жа... І гэтае «не так» пачыналася даўно-даўно, аж у ранняй яго маладосці, аж у тым дні, калі страціў Фэлька самае дарагое на свеце — сваю Юльку. О, колькі пасля вяртаўся Фэлька памяццю да таго дня, колькі горычы ў душы ягонай пакінуў ён. Хапіла б яе, каб захліснуцца, як у цёмным віры, таму ненажэрнаму, тлустаму, што кормны парсюк, горляцкаму пробашчу...

Гніе ўжо колькі гадоў, і грошы не памаглі, і модлы ад смерці не адкупілі. А таксама думаў, што канца на яго не будзе, гроб пад сябе як мог, людзей абіраў, як воран косці. А было б каго абіраць. Як тады жылі людзі. Гэта не тое што цяпер: аб грашах сваіх не знаюць. А тады... А што тады? Хоць бы яго, Фэльку,

узяць. Пяць злотых не хапіла, каб таму ненажэрцу на запаведзь даць. Гэта ж каб на цяперашні розум, плюнуў бы чалавек — не хапіла і не хапіла, без запаведзі, без шлюбу абышліся б. Хто цяпер шлюбы бярэ і — жывуць, не паміраюць. А тады што ж... Выйшлі, памятае, яны з плябані, а Юлька ў слёзы адразу: не лёс нам, значыць, Фэлечка, сам бог процi нас. Як ён яе ні ўгаворваў, як ні прасіў — дзе там. Не лёс, і ўсё. Процi бога не пойдзем. І ён паверыў ёй, нечакана скарыўся, знерухомеў, як скамянеў. Стаяў і ўтрапёна глядзеў, як пайшла ад яго Юлька: хутка, не азіраючыся, нізка апусціўшы галаву. І ён яе не паклікаў, не дагнаў. Не ведаў тады, што ідзе яна назаўсёды...

Фэлька ўздыхнуў. Першы раз за дарогу абмацаў у кішэні памяты пачак «Прымы», дастаў цыгарэту...

Так і разышліся. Яна ў горад служыць пайшла, замуж там выйшла. І ён таксама ажаніўся. Ганцю Грамюшкаву ўзяў. Нехарошую, затое багатую. Век з ёю пражыў, дзяцей пагадаваў. І калі падумаць, то што на жыццё наракаць: жыццё як жыццё. Ганця яго кабета неблагая, гаспадыня — пашукаць такой. І дзеці як у людзей. Праўда, ад хаты далекавата ад'ехаліся. Ну, але што зробіш. Свет цяпер такі: маладыя хаты не пільнуюцца. Не, няма чаго грашыць. Усё ў яго добра, усё як след, усё як трэба. Але вот не стае Фэльку нечага, мучыць яго штосьці, рады сабе даць не можа. Калі той нічога, у рабоце, у клопаце — дзень да вечара, дзень да вечара, а калі, бывае, надыдзе — хоць аб сцяну галавою біся. Усё здаецца не так, усё перавярнуў бы, перамяніў бы, каб мог.

Нанава жыць пачаў бы, па-другому неяк, прыгажэй, лепей.

Ён часта ўпотай думаў, як бы стаў жыць. І тады ў тыя яго таемныя думкі кожны раз прыходзіла Юлька...

Фэлька даўно не бачыў яе. Даўно. Несправядлівы свет: столькі ён бывае ў тым горадзе, дзе жыве яна,

столькі людзей у яго на вачах пераварочваецца, хоць бы і на рынку, а Юлькі няма. Ды ён усё яшчэ спадзяецца сустрэць яе. Так вот, проста, убачыць, і ўсё...

Фэлька ізноў пачынае думаць пра тое, што жыццё і праўда канчаецца, што хутка нічога не трэба будзе: ні сустрэч, ні жаданняў, нічога. І сціскаецца ён ад раптоўнага, яснага адчування незваротнасці пражытага. Ён разумее, што ўжо нічога не будзе, на што ўсё яшчэ спадзяваўся, што жыццё, пакуль ён збіраўся жыць, прайшло. І што грошы, якія ён упарта, па капейчыне, збіраў, складваў, не выратуюць, не дапамогуць. Яны здаліся раптам непатрэбнымі яму, пустымі паперкамі, што ўжо каторы год тухнуць на самым дне куфра.

Дзеля чаго ж тады ён жыў, дзеля чаго біўся як рыба аб лёд? Фэлька адчуў, як зрабілася яму горача — расшпіліў ватоўку, ссунуў [redacted] узмакрэлага лба шапку.

Прыпомніліся вечары, калі яны з Ганцяю, прыехаўшы з рынку, шчыльна завешвалі вокны, сядалі за стол і пачыналі лічыць грошы. Спачатку ён, паслініўшы пальцы, разгладжваў кожную паперчыну асобна, потым яна. Пералічвала. У тыя моманты Фэлька адчуваў, як моцна стаіць ён на гэтай зямлі. І яшчэ: яму тады заўсёды хацелася сустрэцца з горляцкім ксяндзом і сказаць яму... Што сказаць, Фэлька так ні разу і не прыдумаў. Але жаданне гэта з'яўлялася, і кожны раз ён шкадаваў, што той не дажыў, памёр раней, чым ён, Фэлька, разбагацеў... Цяпер усё гэта разам падалося яму недарэчным і смешным. Стала так нядобра і адзінока, горка, што яму раптам захацелася расказаць пра ўсё Ганцы ці хоць каму. Азірнуўся: яна пераранейшаму ляжала, скруціўшыся пад кажухом. Відаць, спала.

На Фэльку задуменна глядзелі з вышыні зоркі і хітравата вызіркваў з-за дрэў поўны месяц.

Ціха каціліся па ўезджанай дарозе колы, пазваньваў цуглямі Каштан.

Фэлька ямчэй уціснуўся ў сена. Прабіраў дрогкі ранішні холад. Пачынала патроху відняць. Там, на ўсходзе, куды яны ехалі, недзе якраз над горадам, ледзь прыкметна ружавелася неба. У лесе чуліся першыя ранішнія шолахі. Патроху абуджалася жыццё.

І чым бліжэй пад'язджаў Фэлька да горада, тым мацней станавілася жаданне не ехаць туды. Не ехаць на рынак, не стаяць там з гэтымі ападкамі, не ўгавораць, каб хаця іх купілі. Чамусьці ўсё гэта стала раптам брыдкім і непатрэбным. Здаецца, адчуў, як зліпаюцца пальцы ад пакамечаных, зацяганых рублёў, ад напацелых медзякоў, што сыпалі і сыпалі яму ў жменю, і злосна таргануў лейцы. Каштан ад нечаканасці спыніўся, але, адчуўшы, як тут жа паслаблі лейцы, зноў паволі пасунуўся наперад.

Лес канчаўся. Пачынаўся прыгарад. Пры дарозе, у белым тумановым змроку, кучараваліся сады. Запякло, защчымела на сэрцы даўняе, маладое, тое, пра што не раз гаварыла яму Юлька: «Садок каля хаты пасадзім, Фэлечка. Яблынь усякіх, вішань, каб вясною цвілі, каб вакол бела-бела, каб галава ад хмелю таго — кругам... І залатую ранету. Хоць адну...»

Пасадзіў Фэлька садок. І ранета ёсць. Усё ў яго цяпер ёсць. Усё...

Мусіць, ад холаду прачнулася за плячыма Ганця, зашморгала носам, пачала кешкацца, цягнуць на сябе кажух, урэшце азвалася да яго хрыплым спрасоння голасам:

— Ты не змерз, стары? Я чыста ўкарчэла. Ноч халодная.

Ён памаўчаў, нехаця адказаў:

— Ноч як ноч. Пад раніцу заўсёды халадней...

Стылі ў новым кошыку жоўтыя, з чырванаватымі бакамі, ранеты...

Светлая рунь

Стэфка адышла пад раніцу. Свяціў на двары бледны месяц, і якраз у акно на яе глядзела адзінокая буйная зорка.

Цяпер, калі Міхал думаў пра астатняе жончына імгненне, ён найперш бачыў гэту зорку. Не Стэфчын зменены, раптам адмаладзелы твар, не вінаватую ўсмешку, што так і асталася на яе вуснах, а гэту зорку. Можа, таму стаяла яна ў вачах, што быў пэўны: яе бачыла Стэфка ў астатнюю сваю хвіліну. І зорка гэта адна бачыла, як развітвалася Стэфка з жыццём, як адыходзіла з гэтага свету. А ён, Міхал, не бачыў. І цяпер не мог сабе дараваць, што не бачыў, што пакінуў яе адну перад смерцю. Усю ноч сядзеў, а пад раніцу, як на той грэх, сон наваліўся. І ён не ўтрываў — пайшоў на кухню, прылёг на тапчане. Потым неяк раптам прахапіўся, як што тузанула яго, выйшаў на хату. Зорка праз акно проста на ложак, на Стэфку глядзела. Але Стэфка ўжо нічога не бачыла...

Яе пахавалі праз тры дні, дачакаўшыся з далёкай Поўначы старэйшага сына. Справілі памінкі, аднеслі суседзям сталы, і хата раптам стала нязвыкла пустою і вялікаю. Міхал баяўся ў яе заходзіць. Ён усё больш тупаў на двары, знаходзячы сабе розны занятак, і толькі калі выходзіў на ганак сын і клікаў яго палуднаваць, апускаў галаву, пакорліва ішоў дахаты. Не распранаючыся, адно сцягнуўшы з галавы шапку, як чужы, збоку падсядаў да стала. Віця выносіў з каморы запацелы графін з гарэлкаю, наліваў у чаркі:

— Давай, тата. Па кроплі. За матку. Хай ёй зямля пухам...

І неяк адразу перакульваў усю чарку ў рот, сядзеў які з час моўчкі, апусціўшы галаву, не дыхаў. Тады ўжо браў кусок хлеба, доўга яго нюхаў, падсоўваў пад сябе міску з халодным...

Міхал не піў. І есці яму не хацелася, хоць калом пры. Ён глядзеў, як смачна чаўкае Віця, і думаў, што маладому ўсё лягчэй: і гора перажыць, і забыць, і неяк усё абдумаць, рашыць. А старому, вот як бы й яму цяпер, хоць жывому ў зямлю лезь. І каб хто падумаў, што ўсё так будзе, што згарыць Стэфка так хутка, так нечакана. Скарэй на яго, Міхала, думалі. Аперацыю перанёс нядаўна, ды і слабейшы за яе быў, старэйшы нашмат... Думаеш адно, а выходзіць другое. Нічога ў чалавечым лёсе не сплануеш, як ты ні плануй. Стэфцы ўжо адно — ляжыць там пад хвойкамі сабе спакойна, а ты тут, чалавеча, думай думку. Рашай, як і што рабіць, як жыць далей. Яшчэ як жонка жывая была і ён на аперацыю клаўся, гаварылі яны, меркавалі, што ёй будзе рабіць, калі, не дай бог, ён не выкараскаецца. Рашылі тады, што да малодшага сына пойдзе. Хату гэту на Зэнака апіша. Хай што хоча ён з ёю робіць: ці прадае, ці як лепшча сабе трымае. Хата ж новая, што шклянка. І садок во, і двор харошы, і забудова ўся. Ад горада блізка, паўгадзіны язды.

А яно во як усё павярнулася...

— Тата, ты не гаруй. І на Зэнака, тата, не абіжайся. Гэта яна ўсё. Краля яго. Гэта не яму ты, ёй ты не нужон.— Віця паспеў ужо прапусціць пару стограмовак, і цяпер яго цягнула пагаварыць. А гаварылі яны з бацькам каторы дзень пра адно і тое ж. Пра Зэнака і ягоную Галю. Дакладней, гаварыў Віця, Міхал або слухаў, або проста сядзеў, думаючы пра сваё, часам зусім не пра тое і не так, пра што і як гаварыў старэйшы сын. У бацькі былі свае думкі і была свая, бацькі-

коўская, крыўда на малодшага. Бо на Зэнака яны з Стэфкаю толькі й спадзяваліся. Яму памагалі, астатні грош аддавалі, пра Віцю, пра старэйшага, не дбалі так. Занесла, думалі, на край свету, хай сам сабе раду дае. А вот Зэначак... Не, што там Віця на Галю гаворыць. Нявестка — не дачка. Усё роўна чужая. Але ж ты, сын, і каб гэтак... Міхала адразу, як толькі згадваў пра ўсё, пачыналі душыць слёзы...

У той вечар, як пахавалі Стэфку і асталіся ў хаце толькі свае, Міхал сам завёў гэту гаворку. Яшчэ за сталом сядзелі. Зэнак з Галяю, Віця і ён, Міхал. Сам пачаў. Бо што ж адкладваць. Аднаму яму ўсё роўна не дажыць, няма сілы.

— Ну, што, дзеці, з бацькам рабіць будзеце? — Спытаў як бы між іншым, бо ведаў, што тут адно выйсце — да Зэнака прытуліцца, пры ім дажыве. Але спытаў, каб ужо напэўна, каб болей да таго не вяртацца. Сказаў так і падняў вочы на Зэнака. На Віцю й не глядзеў, што Віця. Сёння тут, а заўтра яго толькі й бачылі.

А Зэнак — ні слова. Як бы й не яго датычыла. Віця тады азваўся: «А што рабіць, тата, што доўга думаць. Пойдзеш во да Зэнака, ды ўсё. Сюды сабе, у вёску, як на дачу будзеце ездзіць». І тут нечакана, што падсмаленая, узвілася Зэнакава Галя:

— А можа, ты сабе гэту дачу возьмеш і бацьку заадно? Ашчаслівіў — на дачу будзеце ездзіць,— непрыгожа скрывілася, перасміхнула Віктара.— У маіх вунь старых такая самая дача. Іш ты, распарадзіўся раздва: да Зэнака. А ты што, не сын?

— Сын! — Віця кулаком па стале грукнуў — чаркі зазвінелі.— Сын! Але папытай, ці захоча да мяне бацька за блізкі свет, калі вы пад бокам. Кватэру сваю маеце?

— А ты папытаў? — Гэта ўжо Зэнак на Віцю вызверыўся.

У Міхала пацямнела ў вачах. Ён падняўся, моўчкі выйшаў з хаты...

— Ты, тата, не думай.— Віця торкаў відэльцам у талерку, не могучы папасці ў скрылік кілбасы.— Не думай, тата. Мая Аня не такая. Харошая мая Аня, душэўная. Не яго краля. Ты не трусь. Ерунда, што далёка. Цяпер — усюды блізка. Нам да Масквы глаўна, а там — самалётам. Не трусь. У мяне там — ха-ро-мы. Усё ёсць. Не абіжу цябе. Папомніш слова, не абіжу...

* * *

Ночы над Роўнічамі стаялі месячныя, зорныя. Пачынала патроху марозіць, і зямля нанач бралася грудамі. З раніцы на жухлай траве, на апалым скурчаным лісці доўга трымалася шэрань. Але ўставала з-за туману сонца, угравала зямлю, і ўсё адходзіла, вільготнела. На кудлатай, густой руні за вёскаю буйна зіхацела раса.

Міхал ішоў цярэспаля. Упершыню за жыццё не думаючы, што ідзе па руні, што топча ў адталую ўжо зямлю жыта. Ён вяртаўся з могілак. Раненька, досвіцы, хадзіў да Стэфкі. Мусіў сказаць ёй пра ўсё, што надумаў, параіцца.

Дайшоў да краю поля, стомлена апусціўся на высокі бераг поплаву, дастаў цыгарэты. Ён і раней любіў запасядзець тут. І калі на трактары рабіў — араў ці засяваў гэты клін, і калі проста, бывала, хадзіў блізка. Сядаў во так, курыў, думаў. Зямля заўсёды супакойвала, адцягвала, здымала з душы непатрэбны цяжар, вярталала зноў да жыцця. Міхалу й цяпер хацелася пабыць аднаму, супакоіцца, усё як след абдумаць. Але чамусьці думалася зусім не пра тое, што так мучыла, гняло яго ўвесь час, як пахаваў Стэфку. Ён глядзеў на поле перад сабою, на яркую, маладую рунь і думаў пра гэта поле. Успомніўся той год, калі ў Роўнічах арганізаваўся калгас і во гэты іх, Маргуновічаў, клін такса-

ма далучылі да калгаса. Зямля тут спрадвеку была добрая. Бацька не раз, бывала, хваліўся: «Зямля ў мяне на клінку што масла, хоць бяры на хлеб маж». Нялёгка было старому аддаваць гэту зямлю. Ну, але што ж... Памеркаваў бацька тады, падумаў і ці не адным з першых у Роўнічах падаў у калгас заяву. І вот помніцца Міхалу той год, калі ўжо ўсе землі аб'ядналі, засеялі. На гэтым кліне пасеялі пшаніцу. І ўрадзіла ж тады яна. Бацька не мог надзівіцца: колькі гаспадаром быў, а такога ўраджаю не меў. Усё да поля хадзіў, цешыўся.

Урадзіла той год не толькі на іхнім кліне: збажына стаяла сцяною на ўсіх палетках. І даспела, як на бяду, таксама на ўсіх адразу. А тады што ж, сярпамі жалі — адразу ўсюды не ўхопіш. Бабы спінаў не разгіналі да заходу сонца, а ўсё роўна не ўпраўляліся. Жалі спярша на грудзе, за могілкамі, а клін усё стаяў. Ужо й колас ламацца стаў, зерне на зямлю церушылася, прападала. Бацька да поля больш не хадзіў: глядзець не мог. Але аднаго разу ўсё ж не ўтрываў, пайшоў. Надвечар дахаты вярнуўся. Лёг і ўжо болей не ўстаў...

Міхал курыў і думаў, што ўсё перамянілася з таго часу. І жыццё і людзі. І зямля гэта, хай самая найлепшая, не трымае яна ўжо чалавека так, як раней. Абыякавы нейкі, раўнадушны стаў да яе чалавек.

Вот хоць бы ўзяць яго хлопцаў. Выраслі тут, з маленства рабіць усё памагалі, з трактара ягонага не злазілі, а як толькі сталі на ногі, дык і ў белы свет. Старэйшы невядома куды заехаў. А чаго? Каб сказаў работу якую асаблівую меў там — дык не, звычайны шафёр. Хіба нельга было тую самую баранку ў сваім калгасе круціць...

Малодшы зноў жа — на трактары робіць, але не ў вёсцы, а ў горадзе, на заводзе. З цэха ў цэх соўгаецца, жалеза перавозіць.

І ці толькі сыны яго. Усе маладыя амаль пайшлі з вёскі. А сюды, на зямлю, шэфаў з горада возяць. І хоць разумее Міхал, што не абысціся калгасу ўжо без тае шэфскае дапамогі, а не мірыцца душа з усім, што бачаць вочы. Не можа ён глядзець, як шэфы гэтыя робяць. Чужыя, абыякавыя ў іх рукі: не такія зямлі патрэбны. Палову ўсяго на палях астаецца. А яны — абы дзень да вечара, абы-як. Можа, і не ўсе гэтак, пэўна ж не ўсе, каторы то й стараецца, робіць як трэба, але ўсё роўна, не выйсце гэта.

Баліць у Міхала душа, і часта думае ён, што і сам вінаваты ў нечым. Не змог утрымаць сваіх хлопцаў каля сябе, каля зямлі. Не змог...

Міхал дакурыў, але лягчэй і спакайней не стала. У грудзях, недзе пад самаю лыжачкаю, аж млела нутро, жывым клубком варочалася трывога. Ён падняўся з поплаву, агледзеўся. Дзень, як і ўсе гэтыя дні позняй восені, меўся быць сонечны, цёплы. Спакойнае, шырокае ляжала перад ім поле. Міхал сам яшчэ засяваў яго. Якраз перад аперацыяй. Тады, у верасні, таксама стаялі во гэтакія цёплыя, харошыя дні. Ён не злазіў з свайго «Беларуса». Добра засеяў. Роўна. Рунь кусцілася перад ім яркая, светлая. Міхал адчуў, як на хвіліну адышла, адпусціла душу трывога, заспяшаў да хаты...

Віця ўжо ўстаў. У верандзе на газавай пліце сіпеў чайнік, на кухні патрэсквалі ў печы дровы, пахла пачанаю бульбаю. Сын быў цяпер у хаце за гаспадыню. У Міхала пацяплела на сэрцы. Падумалася раптам, як бы добра было, каб астаўся Віця пры ім назаўсёды. Прывёз бы Аню сваю, дзетак. Сам бы сеў на яго, бацькаў, трактар ці на якую машыну, і Ані работа знайшлася б... Спрабаваў неяк гаварыць з сынам пра гэта — слухаць не хоча. Маштабы, кажа, бацька, не тыя. Маштабы...

— Ну, дзе ты ходзіш пры раніцы?

Віця сядзеў за сталом, курыў. На стале ўжо стаяў графін, дзве чаркі, на скаварадзе сквірчэла яечня.

— Да маткі хадзіў, сынок, на параду...

Віця здзіўлена ўзняў чорныя, калматыя, як у бацькі, бровы:

— На могілках быў?

Міхал не адказаў, выйшаў на хату. Дастаў з шафы чыстую сарочку. Падумаў, што яшчэ Стэфчыны рукі мылі і прасавалі яе, прытуліў да твару, пастаяў гэтак, потым зняў з вешака выхадны цёмна-сіні касцюм. Паднядзелены, адразу памаладзелы зноў зайшоў на кухню.

Віця здзіўлена прысвіснуў:

— Ого, ці не ў сваты?

— А што? Яшчэ можна было б, праўда?..— Сумна ўсміхнуўся.— Да радні схаджу, сын. Трэба ж патроху ўжо развітвацца. Дый, можа, нарадзяць, каму карову, парасё прадаць. Тады адразу ўсяго не ўхопіш...

— Правільна, тата. О, гэта разгавор.— Віця ажывіўся, падышоў да яго, паляпаў па плячы.— Я ж казаў: нада дзелам заняцца, лягчэй стане. Правільна.

І ўсё ж Міхал адчуў, што сын не паверыў яму і нездарма загнуў пра гэтыя сваты. Ужо выйшаўшы на ганак, сам сабе падумаў, што і праўда, каб дзе якая кабеціна адзінокая знайшлася, то не было б патрэбы чортведама куды перціся, дажыў бы з ёю як-небудзь. Каторы раз за гэтыя дні ўспомніў Калюшкаву Вольгу, што адзінока жыла на далёкім хутары і да якой ён некалісьці кавалерам трохі заходжваў. І тут жа адчуў, што як бы засаромеўся гэтага свайго прыпаміну. Не, да Вольгі ён не пасмее. Праз усё жыццё носіць Міхал у сэрцы вінаватасць перад ёю. Калі падумаць, то й прычыны, здаецца, няма на гэта. Ці мала да каго ходзіш у маладосці. І ўсё ж... Міхал раптам зазлаваў на сябе: знайшоў пра што думаць, пень стары. Спусціўся з ганка, рашуча пайшоў у бок праўлення.

* * *

Кабінет старшыні быў шырока адчынены, і Міхал, яшчэ не пераступіўшы праз парог, убачыў яго самога. Яшчэ малады, чырванатвары, але з салідным ужо, круглым, як гарбуз, жывоцікам Парушкевіч стаяў каля стала і на хаду, відаць, разглядаў нейкія паперы.

Міхал узрадаваўся, што хаця застаў яго, з парога павітаўся.

Парушкевіч не адказаў, адно незадаволена глянуў, ізноў апусціў галаву.

— Я да вас, Феліксавіч.— Міхал не праходзіў, нерашуча перамінаўся ў парозе.

— Бачу, што да мяне. Пачакайце, Маргуновіч. Зараз.

Гэтае афіцыйнае «Маргуновіч» нядобра кальнула Міхала. Звычайна старшыня зваў яго па-свойску дзядзькам Міхалам або Сцяпанавічам. «Не ў гуморы нешта»,— падумаў Міхал і раптам адчуў, як прападае, адыходзіць з душы жаданне гаварыць з Парушкевічам, а тым болей прасіць яго аб нечым. Ужо хацеў ціхенька выйсці з кабінета, але ўсё ж затрымаўся, прысеў з краёчку доўгага рада крэслаў, што стаялі ўздоўж сцяны.

Рэзка затрашчалі на стале адразу два тэлефоны, але Парушкевіч як не чуў, не браў трубкі. Урэшце кончыў чытаць, падсунуў да сябе каляндар, чыркануў там нешта алоўкам. Тады ўжо толькі павярнуўся да Міхала:

— Чуў, ад'язджаеце? Што з хатаю вырашылі: прадаваць будзеце ці малодшаму пакідаеце?

Міхал разгубіўся. Не пра гэта ён ішоў гаварыць.

— Ды вот не знаю, Феліксавіч. Сам не знаю...

Парушкевіч нецярпліва перабіў:

— А хто знае? Я ж не проста так, дзеля цікаўнасці.— Падышоў да вешака, сцягнуў куртку, збіраючыся апранацца.

Міхал падняўся, нерашуча камячыў у руках шапку. Раптам выскачыла з галавы ўсё тое, пра што думаў, калі ішоў сюды.

— Я панімаю, Феліксавіч...

— Ну, вот. Хата ў вас харошая, калгас яе ў вас купіць.

У Міхала перахапіла дыханне: «Вот што яго хвалюе. А ты, стары дурань, спадзяваўся, што ён цябе трымаць будзе, угаворваць, каб не ехаў, астаўся. Паможа табе сына пераканаць, каб дахаты, у свой калгас вярнуўся. А як жа. Патрэбен ты яму, стары ды хворы».

Парушкевіч заўважыў Міхалаву разгубленасць, зразумеў яе па-свойму:

— Вы не хвалюйцеся, камісія ўсё ацэніць, падлічыць, усё будзе ўзгоднена з вамі...

Міхал маўчаў. Аднекуль здалёку даходзіў да яго голас Парушкевіча:

— Тут да нас з Караганды кабета прыбілася. Чулі ж, пэўна, даяркаю робіць. Двое дзяцей малых. Кватэра патрэбна...

Міхал болей не слухаў. Глыбока, на вочы, нацягнуў шапку, пайшоў з кабінета.

* * *

Маргуновічы ад'язджалі праз тыдзень. У Віці канчаўся водпуск, і колькі ні прасіў яго Міхал хоць трохі яшчэ затрымацца, сын не згаджаўся: «Няма чаго, бацька, цягнуць ката за хвост. Усё роўна нічога не зменіцца і ехаць табе са мною прыйдзецца...» А Міхал усё яшчэ ў душы спадзяваўся, што пераменіцца нешта, не можа быць. Не можа быць, каб яму прыйшло-

ся некуды ехаць. Не месцілася гэта ў сэрцы, не ўкладвалася ў галаве. Як жа так: пражыў чалавек жыццё на гэтай зямлі, усё аддаў ёй, а паміраць некуды ў свет трэба ехаць...

Але дні ішлі, і нічога не мянялася. Ад'езд набліжаўся. За гэты час Міхал яшчэ больш асунуўся, учарнеў, хадзіў паволі, згорблены, ціхі.

Роўніцкія жанкі, шкадуючы яго, казалі, што гатоў не даехаць Міхал да тых сынавых харомаў.

Хату і ўсю забудову адкупіў у Маргуновічаў калгас. Міхал не хацеў прадаць хаты, казаў, хай стаіць пакуль, суседзі наглянуць, а прадаць Віця заўсёды паспее. Але сын раптам заўпарціўся, зазлаваў, і бацька здаўся: рабі як хочаш. У душы з крыўдаю падумаў, што сыну тых пару тысяч важней за ўсё, але не сказаў нічога. Усё роўна ўжо.

У панядзелак паабедзе пад'ехала крытая калгасная машына, і Віця павыносіў і зладаваў у яе рэчы. Да цягніка заставалася яшчэ болей гадзіны, але Міхал апрануўся, выйшаў з хаты. Звыкла, як выходзіў ненадоўга, прымкнуў веранду, павесіў на сцяне ключ, пайшоў з надворка.

Унутры ў яго ўсё як скамянела. Вочы былі сухія і гарачыя. Віця падышоў, крануў бацьку за плячо, паказаў вачыма на машыну. Але Міхал пакруціў галавою: «Час ёсць, сынок. Прайду пешкі: да маткі па дарозе захілюся. А ты едзь». Бачачы, што сын усё стаіць, растлумачыў: «Адзін хачу пабыць». І калі завуркатала, ад'ехала ад хаты машына, выйшаў з надворка, прычыніў веснічкі. Пачуў, што яны зноў адчыніліся за ім, вярнуўся, зашчапіў на кручок. Паволі пайшоў па вуліцы. Убачыў, што з вокнаў на яго глядзяць, зняў шапку і гэтак ішоў праз усю вёску.

Было ўжо добра папалудні. Свяціла, як і ўсе гэтыя дні, сонца, і недзе там, каля хвойніку, да якога ішоў Міхал, трымцела, пералівалася паветра.

«Як вясною»,— падумаў здзіўлена і быццам упершыню ўбачыў, якое хараство вакол, якая сумная і ўрачыстая краса роднай зямлі перад ім. Вочы не маглі нацешыцца ёю, грудзі не маглі надыхацца яе водарам.

Міхал не спяшаў. Як бы й не ён гэта павінен быў зараз ад'язджаць адсюль...

У хвойніку было ціха. Толькі недзе глыбей, у дрэвах, ценькалі нябачныя сініцы.

Міхал ішоў вузкаю сцежкаю між магіл, пазнаваў іх, і тыя, яшчэ даваенныя, з амшэлымі, урослымі ў зямлю крыжамі, і нядаўнія — з прыгожымі мармуровымі помнікамі, і зусім свежыя — з высока насыпанымі грудкамі жоўтага пяску. Ішоў да Стэфчынай. Яна бачылася здаля, абстаўленая з усіх бакоў яшчэ яркімі, не выцвілымі ад дажджоў і сонца вянкамі. Ён падышоў да яе, апусціўся на калені.

Побач было знарок пакінута вольнае месца — для яго. Ён прасіў аб гэтым мужчын, калі тыя ішлі капаць дол. Хацеў, як памрэ, побач са Стэфкаю легчы. Цяпер яно яму непатрэбна. Невядома цяпер, дзе яго месца...

На вочы навярнуліся слёзы. Ён па-дзіцячы расцёр іх кулаком, азірнуўся. З суседніх помнікаў, з круглых зашклёных фотаздымкаў, здалося, глядзелі на яго твары аднавяскоўцаў. Як і нядаўна, калі ён ішоў праз вёску, Міхал нечакана востра адчуў іх еднасць. Мёртвых і жывых. Іх непарыўную, кроўную повязь. Яны былі ўсе разам. Былі заадно. Яны аднолькава на яго глядзелі. Гэта быў адзіны ланцуг жыцця. А ён, Міхал Маргуновіч, выпадаў з гэтага ланцуга. Выпадала звяно. Ланцуг разрываўся. Таму і ў вачах жывых і ў маўклівасці мёртвых Міхал адчуў асуджэнне. Цяжар ягоны быў невыносны...

І гэта поле, і гэта светлая рунь пад сонцам — яны таксама глядзелі на яго. Праз ствалы дрэў і праз крыжы прабіваліся зіхоткія лапікі прасторы — іх вочы.

Глядзеў на Міхала праз густыя зялёныя кроны чысты блакіт асенняга неба: запытальна, маўкліва...

Ён падняўся. Не атрасаючы з калень пяску, не азіраючыся і ўсё ж спінаю адчуваючы насцярожана-запытальныя позіркі, пайшоў да поля. Як і туды, назад ішоў паволі, толькі неяк адразу распростаўся, паспакайнеў. Ногі ставіў упэўнена, цвёрда. Пачуў, як недзе ўдалечыні коратка гукнуў цягнік. Міхал стаў, прыслухаўся: да станцыі падходзіў хуткі, «маскоўскі». Той, на якім павінны былі яны ехаць.

Ён раптам захваляваўся, зірнуў на гадзіннік і тут жа з палёгкаю ўздыхнуў: спяшаць ужо не было куды.

Белыя брады

Чаму яны белыя, брады? Белыя-белыя. І чаму брады? Звычайнае балотца, перарэзанае раўчуком і пабітае скрозь, як бародаўкамі, высокімі купінамі калючай асакі.

Над раўчуком — купчасты лазняк і ў маленькіх завоінах нерухома стаяць цыбатыя чараты, а па берагах скрозь расце круглатвары бэзавы валяр'яннік.

Звычайнае балотца, нізіна, самае падножжа ўзгорыстага, камяністага поля.

Балотца браліся асушаць, калі толькі паднялася ўся гэта кампанія з асушкаю. А пасля імпэт у калгаснага начальства чамусьці прапаў і справа так і не была даведзена да канца. Балотца па краях узаралі, якраз датуль, дакуль даходзіў трактар, засеялі травамі, а да рова так і не дабраліся. І было там усё, як і раней: кусціўся лазняк, цвіў валяр'яннік, выпускалі свае аксамітныя рыжыя таўкачыкі высокія чараты.

Чаму ж тады ўсё-такі брады?

Нават не брод, а брады. Колькі іх: два, тры, колькі? І калі яны былі тут, за якім часам? А раз былі брады, значыць, была глыбіня. Была вузкая і глыбокая-глыбокая рака. Няйначай. І праз яе ў гэтым месцы якраз хадзілі і ездзілі. Праз брады на той бок, у тую калінавую цяністую лашчыну ганялі некалі коней.

Вось так і бачыцца Сашку: раскручаны сувой ранішняга густога туману над рэчкаю і рыжыя коні, пфыркаючы, нахіляюцца да чыстай вады і паволі-паволі ідуць на той бераг.

Сашку яно часам і сніцца: белыя брады і рыжыя

коні трасуць густымі доўгімі грывамі. І здаецца яму, што праз сон ён чуе іх ціхае, самотнае ржанне. Штосьці трывожнае і светлае нараджаецца тады ў Сашкавай душы і рана-рана будзіць яго, падымае з цёплай пасцелі. Ён падхопліваецца і яшчэ доўга слухае тое дзіўнае трымценне ў сабе, але яно паступова аціхае, каб потым зусім знікнуць і пусціць у душу штодзённы, абрыдлы клопат, які цалкам зойме Сашку, паглыне з галавою на ўвесь спякотны і доўгі ліпеньскі дзень.

Сашка тут жа ўспамінае пра свой стары, дабіты трактар, пра шэрае мора перастаялай цімафееўкі, якую яны ўжо другі тыдзень косяць учатырох. Успамінае Міколу Бруха, Сямёна Касарыка, Селівона Грака, і настрой яго канчаткова псуецца.

Якія ўжо там белыя брады, якія рыжыя коні, калі гэтыя «чарнільшчыкі» сёння зноў будуць ганяць яго па «чарніла», а пасля будуць піць да абеду, а пасля спаць дзе-небудзь, зашыўшыся ў цянёк, і толькі надвечар раскатурхаюцца, возьмуцца за работу. І будуць стракатаць да самага цямна — гнаць норму. І Сашка з імі.

Штовечар, кладучыся спаць, Сашка дае сабе слова, што заўтра — от жа напэўна — з саменькай раніцы ён не паслухае іх, не пабяжыць у магазін. Няхай самі ідуць. А ён выедзе адразу ў поле і пачне касіць. І няхай як хочуць. А то бачыш ты, прывыклі: Сашка схадзі, Сашка прынясі, Сашка падай. Служка ў лапцях, а я босы. Не пайду болей!

Не, Сашка з імі не п'е, гэта — факт. І піць не будзе. А вот рабіць, рабіць без іх не робіць. Так закамандаваў адразу, як толькі Сашку далучылі да іх, Мікола Брух. Сказаў, што ўсе яны — адна брыгада і рабіць павінны толькі разам.

Нядобра ўсё гэта. Сашка ўжо й брыгадзіру казаў, прасіў: перавядзіце мяне на другі ўчастак. А той толькі пасмяяўся. Ты малады, кажа, зялёны шчэ, а тут —

вопытныя механізатары. І Мікалай Мікалаевіч, і Сямён Іванавіч, і Селівон Патапавіч. Вучыся, пераймай вопыт.

А як жа — вопытныя, навучаць... Сказаў бы Сашка пра іх вопыт. Але каму і што казаць, калі ўсе самі ўсё ведаюць.

Дый норму мужыкі даюць. Даюць, не падкапаешся. А маглі б і дзве, і тры даваць, каб рабілі як след. Вунь, ва ўсіх трох трактары новенькія, не тое што яго — Касарыкаў спадак.

Старшыня распарадзіўся: табе пакуль што новага даверыць не можам. Папрацуеш — паглядзім. Ну, што ж, Сашка не крыўдуе. Нічога, пакуль і на старым можна. А там — відаць будзе. Адно крыўдна, што гэтыя «вопытныя» так на новых робяць, як ён на старым. Ім адна халера. Хоць самалёт дай.

* * *

— Дак кажаш, белыя брады? А яны й сінія бываюць, не бачыў? Бываюць. Вясною ранняю. Калі лёд толькі кранецца і вада паверсе пойдзе, затопіць усё. Выйдзі калі на самы грэбень поля, глянь на іх зверху. Яны сінія-сінія... І жоўтыя бываюць. Калі цяпло сапраўднае стане, сонейка прыгрэе і лотаць кругом зацвіце. Падзівіся ў такую пару. Жоўтыя яны. А ты кажаш, белыя...

Старая Люця хітравата прыжмурыла вочы, усміхнулася. Яна толькі што абрывала ў картоплі зелле, ужо, відаць, стамілася і цяпер была рада разагнуцца, пагаварыць з Сашкам.

Дзіўная яна, Люця. Колькі яе Сашка ведае, з маленства самага, а яна ўсё такая, не мяняецца, і, здаецца, зусім не старэе. Усё такая ж, як і тады, калі яны, вясковыя падшыванцы, рабілі часам налёты на яе садок. А яна, пачуўшы, як барабаняць, сыплюцца на

зямлю цвёрдыя, яшчэ зялёныя грушы, выходзіла з хаты, стаяла на ганку і з-пад рукі, засланяючыся ад сонца, глядзела на іх. Яна ніколі іх не лаяла і не ганяла. Але варта было каму-небудзь з хлопцаў заўважыць яе і шапнуць адно толькі слова: «Люця», як усе яны, што тыя грушы, мігам аблятлі з сукоў і рассыпаліся хто куды. І ўжо ў канцы саду даганяў іх, бывала, яе доўгі, вясёлы смех.

Дзіўная яна, Люця. Галава ўся як снегам зацярушаная, твар у драбнюткіх зморшчынках, а вочы чорныя і гарачыя. І бровы таксама чорныя і тонкія, як у дзяўчыны. Можа, таму й завуць яе ўсе неяк па-маладому, коратка: Люця.

А Сашка дык часта і ўяўляе яе маладою: з цяжкаю цёмнаю касою на спіне. Люця сама неяк хвалілася: «Каса ў мяне харошая была, што пранік, плечы адбірала...»

— І што ты ўгледзеўся на мяне? — Люця смяецца, злавіўшы на сабе ўважлівы Сашкаў позірк.— На дзевак трэба глядзець, а не на бабу старую.

Сашка бянтэжыцца, маўчыць, адно пунсавеюць яго вялікія, неяк дзіўна выцягнутыя ўверх вушы. За гэтыя вушы хлопца дражняць у вёсцы Зайцам.

— Чуеш ці не, што кажу?

— Чую, чую.— Сашка ніякавата ўсміхаецца.

— Ну, во. А то ўгледзеўся.

Люця зноў схіляецца над баразною, паднімае ладнае бярэмца прывялай макрыцы з бярозкаю, падціскае зелле пад паху.

— Хадзем ужо адсюль, з гэтага поля. Хоць крышачку ў цень які — зварыцца можна.

Пазвоньваючы пустым бітончыкам, Сашка ідзе за ёю. Яны выходзяць з лапушыстага, цёмнага бульбоўніку на абмежак, вузкаю сцежкаю ідуць дахаты.

Сашка ўжо й так забавіўся тут, загаварыўся з Люцяю, а мужыкі там чакаюць не прычакаюць яго. Пай-

шоў, думаюць, і прапаў. «Нічога, не памруць,— супакойвае сам сябе Сашка.— Дрыхнуць недзе пад кустом, ды ўсё...»

Стаіць высокі ліпеньскі дзень. Не дыхне, не шалохне вецер, не наплыве на неба хмурынка. Яго блакітны паркаль выцвіў, аблез ад яркага штодзённага сонца, здаецца празрыстым. Цішыня і спякота. Чутно толькі, як сонна гудуць над бела-ружоваю дзяцялінаю пчолы і недзе за пагоркам, нябачны адсюль, туркоча на брадах трактар. Гэта Мікола Брух зноў думае абхітрыць начальства — не глушыць свайго лапатуна. Ён хітры, гэты Брух. Сашка яго хіба найбольш не любіць і пабойваецца. А, ды чорт з ім, з Брухам. Вот бы ў рэчку якую цяпер бултыхнуцца. Смаліць дык смаліць.

— Другі тыдзеньчык так пячэ неміласэрна,— як бы чуючы Сашкавы думкі, падхоплівае іх Люця.— Усё пагарыць. Без хлеба астанемся. Сáма колас налівацца стаў. Перамяшалася, перакруцілася ўсё ў свеце.

— Нічога не перамяшалася, цётка,— Сашка ідзе за Люцяю і на хаду выцірае едкі, гарачы пот, што залівае вочы.

— Ну? — Люця прыпыняецца, паварочвае галаву, недаверліва прыжмурвае свае чорныя вочы.

— Праўда, праўда. Гэта здаецца так. Вот нам настаўнік казаў, гісторык. Разумны дзядзька. Казаў, што і ў мінулыя вякі ўсяго хапала. Ну, у 19-м ці ў 17-м стагоддзі, напрыклад. І засухі, і залевы — усяго было. Проста мы не ведаем пра гэта, і нам здаецца, што ў наш час найгорай.

— А хто яго, дзеткі, ведае. Можа, й так.— Люця жа, й так. Але чалавек другі стаў цяпер. Ніколі не быў мацней прыціскае зелле, раздумліва паўтарае:— Мо такі разбэшчаны чалавек. Ніколі. Ці то ад таго, што гора жаднага не бачыць, ці то ад дабра лішняга. Не ведаю. От ты кажаш, твае «чарнільшчыкі» ўжо п'яныя ляжаць.

— Што цапы́,— усміхаецца Сашка.

— Ну, во, бачыш. А дзе-та калі было такое, каб у касавіцу ці ў жніво гаспадар піў. Калі на ўсю ваколіцу, на ўсе пяць вёсак і знаходзіўся які недалэнга, то яго ж за чалавека не лічылі, пальцам людзі паказвалі на такога.— Памаўчала.— А ты кажаш, настаўнік твой. Хай ён мне гэта вытлумачыць... От хоць бы й Мікола Брух. Хто на яго пальцам пакажа? Ніхто. Ці вазьмі ты Касарыка, ці Селівона таго? Да сівых валасоў дажылі, дзяцей павыгадоўвалі. Хто да іх што мае? П'юць, ну й п'юць. А хто сёння не п'е?

— Хворыя.— Сашка зноў вышчарыў дробныя, вострыя, што ў вавёркі, зубы.

— Хворыя. Вот бачыш. Бабы ж вунь п'юць. Адэльку ўчора ў краме спаткала. Чырвоная як рак. Толькі вачыма лыпае. Да мяне — абдымацца, цалавацца: цё-ётушка ты мая. А ад самой, што з бражніка. Узяла піва і проста каля прылаўка, з бутэлькі. Мужыкі стаяць смокчуць, і яна з імі. Хоць бы што, як гэта так і трэба... Ну, хадзем, хадзем ужо. Што пра тое гаварыць.

Хутка зашлэпала босымі нагамі па сцежцы і ўжо болей не спынялася да самай хаты, маўчала.

Загаварыла зноў, калі адчыняла веснічкі і ўпускала яго на падворак.

— Ты ідзі да студні, чэрпай сабе ваду, а я зелле парсюку ўкіну.

...Харошы ў Люці падворак. Прасторны, з высокімі старымі вязамі каля плота. Тут і ў спёку цянёк, і дыхаць адразу становіцца лягчэй. Нізенькая студня з амшэлымі, вышчарбленымі па краях бітонамі стаіць якраз пад раскідзістым вязам. На яе круглым драўляным вечку, як увосень, насыпана жоўтага лісту. Сохне, аблятае ад спёкі. Сашка змахвае яго, падымае вечка. Студня надзіва глыбокая, і вядро доўга ляціць у цёмную прорву, пакуль гулка плёхнецца аб ваду.

Сашка дастае яго, паўнюткае, ставіць на зруб, нахіляецца і п'е, п'е, не могучы напіцца. Вада тонкімі струменьчыкамі б'е з маленькіх, праетых іржою дзірачак, і Сашку асабліва прыемна адчуваць гэтыя ледзяныя, пякучыя змейкі на сваім разгарачаным целе.

Ён урэшце наталяе смагу, узнімае ад вядра галаў. Люця ўжо ўправілася аднесці зелле і цяпер стаіць, апёршыся на плотчык, глядзіць на яго.

Сашка налівае бітончык.

— Панясу, а то дойдуць там без вады.

— А няўжо ж, гарачыня такая.

Сашку здаецца, што Люця ведае, чаго ён прыходзіў. Ведае, што вада — гэта так, зачэпка. Бо навошта было дзеля гэтага зваць яе з поля, мог бы і сам зачэрпаць. Люця ж студні не замыкае. Значыць, не такая «вада» яму трэба. Вунь і пустая бутэлька адцягвае глыбокую Сашкаву кішэнь. Ён мімволі праводзіць рукою па калашыне, нерашуча пераміпаецца, адчуваючы, як зноў загараюцца, чырванеюць вушы. Стаіць які час, баючыся ўзняць вачэй, не ведаючы, што ж рабіць.

І варочацца да мужыкоў без гарэлкі няма як. Брух усё роўна не даруе, у магазін пашле. А магазін вунь як далёка, цэлых пяць кіламетраў. Дый на брыгадзіра нарвацца можна. Ён сам часцяком заходзіць у магазін піва папіць. Што тады скажаш, паслалі? А ён скажа: у цябе што, свае галавы няма?

Не, трэба ўсё ж папрасіць. Гэта ж не так, недарма, за грошы. І тройка скамечаная разам з бутэлькаю ў кішэні ляжыць...

Але ў тым і бяда, што не можа Сашка сказаць Люці пра гарэлку. Не можа, і ўсё. Хоць ты што.

А Мікола наказваў, калі выпраўляў: «Ты ж там папрасі старую харашэнечка. Калі будзе аднеквацца, гаварыць, што няма, скажы: можа, на карэньчыках у вас дзе асталася? Мужыкам палячыцца трэба...» А як

жа, палячыцца ім. Хітры гэты Брух, нябось сам не пайшоў... На карэньчыках...

Сашка зноў нахіляецца да вядра, зноў п'е. А потым паднімае галаву, бярэ бітончык.

— Ну, то пайду ўжо. Дзякуй вам, цётка, за ваду.

— На здароў'е, дзеткі.— Люцня прымружвае вочы, пазірае на яго, і ён заўважае ў яе чорных вачах прытоеную, хітраватую ўсмешку...

* * *

Скошаная і ўжо насохлая цімафееўка ляжыць роўнымі шарымі радамі, і рады гэтыя цягнуцца, паўзуць на пагорак. На самым яго ўзлобку разрываюцца кароткімі выгарынамі, а крыху ніжэй зноў пачынаюць шарэць на зялёнай пожні і ўжо ў самай даліне гарбацяцца ладнымі густымі пракосамі. Трава ў гэты засушлівы год добрая толькі там, у даліне, за якою пачынаюцца брады.

Сашка ідзе напрасткі ад Люцінай хаты, пераступаючы праз вузкія шнуры пракосаў.

Колькі дзён яны касілі гэты кавалак? Дзён пяць, напэўна. Цяпер асталося няшмат. Да нядзелі ўправяцца. Сашка пазірае на пракосы і пазнае, дзе чый. Гэта на першы погляд усе яны здаюцца аднолькавымі, а прыглядзеўшыся, адразу пазнаеш.

Во гэты, выразаны з зямлёю, Селівонаў. Ён і касою гэтак косіць, Сашка бачыў. І трактарам. Пускае касілку каля самай зямлі.

А гэты во, каля Селівонавага, няроўны, віхлясты — Касарыкаў. Косіць і спіць разам. Ён усё гэтак робіць, сплючы.

Міколаў пракос з шырокім захватам, з высокімі чубамі пакінутай травы. Брух усё баіцца наскочыць на камень і, дзе трэба, дзе не трэба, падымае нажы.

Каля Бруухавага, па-вучнёўску роўненька, сцелец-

ца Сашкаў. «Таксама высакавата бяру,— думае Сашка,— трэ было б ніжэй».

Падняўшыся на самы грэбень поля, Сашка бачыць у даліне сінія трактары. Яны купкаю стаяць каля невялічкага чубка цемналістага алешніку. Недзе там, у кустах, зашыўшыся ў халадок, ляжаць мужыкі. Сашка прыспешвае крок...

* * *

— Як гэта няма ў хаце? Куды ж яе чэрці панеслі ў такую спёку? Можа, дзе ў гародзе корпаецца, не глянуў?

— Глянуў, няма.

Сашка стаіць, апусціўшы галаў, і вушы яго гараць як макаў цвет...

Брух, седзячы ў высокай траве, знізу недаверліва зазірае Сашку ў вочы.

— А бутэльку куды дзеў? — Гэта ўжо Касарык умешваецца ў допыт.

— Там, каля плота, пакінуў.

— Ты лянь, а? Каля плота... Яна табе што, дармовая?

— Чакай, Сямён. Правільна зрабіў, што пакінуў. Яшчэ раз сходзіць. Што яе пустую цягаць сюды-туды.

Брух адводзіць недаверлівы позірк ад Сашкі, выцягвае з-пад куста апошнюю бутэльку віна, зрывае зубамі бліщчастую галоўку. Густое і цёмнае, што бычыная кроў, яно булькае, льецца ў шклянку.

— Сядай, чаго мнешся? На во, глыні. Хоць вады прынёс, і то ладна. Зя-цёк.— Мардаты, чырвоны, як распалены цвік, Мікола здаволена, п'яна рагоча.

Сашка апускаецца на калені, але шклянкі не бярэ.

— Ну, ну, не ламайся. Наліваюць — пі. Старэйшых, брат, слухаць трэба.

— Не буду.— Сашка ўвесь натапырваецца, уцягвае

галаву ў плечы. Светлыя, адпушчаныя за лета валасы мякка кладуцца на каўнер вылінялай, заношанай кашулі.

— Давай, давай. Не затрымлівай. Мужыкі вунь чакаюць.

— Сказаў, не буду,— Сашка адсунуўся ўбок, адвярнуўся.

— Не лезь ты да хлопца, Мікола. Уцягнецца шчэ, паспее,— нечакана ўступіўся за Сашку маўклівы, дзюбаносы Селівон Грак.— Давай я вып'ю.

— Пачакай, Грак. Па-чакай,— Мікола свабоднаю рукою адвёў Селівонаву растапыраную далонь.— Мне во цікава, што гэта мой зяцёк сабе думае. Катора пара, а ні разу не раскалоўся. Святога ўдае...

Міколавы лупатыя вочы п'яна ўтаропіліся ў Сашку.

— Гы-гы-гы,— вышчарыўся сонны, з асалавелымі вачыма Сямён Касарык.— Як дзевак упоцемку ціскаць, так не святы, га, Мікола? Ты глядзі, а то дачка, гы-гы-гы, у прыполе скора прынясе. Яны цяпер быстрыя, гэтыя святыя...

— Ну, ты за маю дачку не турбуйся, сваіх глядзі,— агрызнуўся, незалюбіў Мікола.

Сашка адчуў, як чырвань ад вушэй паўзе на твар, туманіць вочы. У хлопца самі сабой сціскаюцца кулакі, і ён ледзь стрымлівае сябе, каб не кінуцца на гэтага з'едлівага, жаўтавокага Касарыка, на мардатага, самаўпэўненага Бруха.

— А, мужыкі, прычапіліся да дзіцяці. Хай як хоча. Мала вам таго, што ён у магазін бегае.— Селівон п'яна дзюбануў доўгім носам.

— Болей не пабягу.

Сашка сказаў гэта ціха, няўпэўнена, але пачулі ўсе трое.

У асалавелых, жоўтых вачах Касарыка мільганула злосць:

— Ты лянь, а? Ты лянь. Канец свету...

— Зай-чык! Ты гэта кінь, Зайчык.— Брух забывае, што называў Сашку толькі што зяцем, пераходзіць на крыўдную для хлопца мянушку.— Ты каму гэта грозіш, га? Цябе хто з рова выцягваў разам з тваім дрындулетам, хто?

— Ну, вы.— Сашка нахохліўся яшчэ больш.

— Вы, вы. То-та ж, Зайчык. То-та ж. А хто гайкі потым памагаў круціць, хто два дні пад тваім недаломкам ляжаў? Маўчыш? Маўчыш, Зайчык. Дык вот і маўчы. А то «не пабягу-у». Пабяжыш, дзе ты дзенешся...

Брух раптам паспакайнеў, ямчэй усеўся, падмяў пад сябе болей травы. Толькі шклянка ўсё яшчэ дробна дрыжала ў яго ў руцэ і віно плёскалася, цякло паміж пальцаў.

— Ты, слухай, дабра не марнуй. Пі або другім давай,— не стрываў, вызверыўся Касарык.

Мікола не адказаў, моўчкі падняў шклянку. Дзве тонкія чырвоныя стужачкі пацяклі па барадзе, на расхрыстаную грудзіну. Брух дапіў, здаволена хакнуў, не закусваючы, наліў зноў поўную шклянку, падаў Селівону.

— На, Грак. Прамый нутро.

Прасачыў, як акуратна, не марнуючы ні кроплі, асушыў шклянку Селівон, з прыхаванаю зайздрасцю падзівіўся:

— Іш ты, і не скрывіўся нават.

— А ад чаго тут крывіцца, ад кампоту гэтага? — Чакаючы свае чаргі і ўсё яшчэ сонна лыпаючы жоўтымі савінымі вачыма, гмыкнуў Касарык.

Мікола наліў і яму, адкінуў убок пустую бутэльку, хрумстка надкусіў белую галоўку маладой цыбулі, укінуў у рот шчопец буйной солі. І ўжо зусім спакойны, улагоджаны зноў павярнуў галаву да Сашкі.

— Эх ты, зяцёк. Заяц ты, адным словам. Каб ты знаў, што ты траціш, гэтак во, адмаўляючыся ўзяць

чарку, каб ты знаў...— Брух любіў пафіласофстваваць, калі добра выпіваў.— Э, дзе табе, смаркачу такому. От яны — знаюць,— кіўнуў у бок разморанага Касарыка і дзюбаносага абыякавага Селівона.— Яны знаюць. Ты от думаеш, чаго мы п'ём. П'яніцы, думаеш, усё такое. Не, брат.

Сашка сядзіць унурыўшыся, маўчыць. Яму ўжо не навіна слухаць мардатага. Ён ведае, што Мікола будзе гаварыць цяпер доўга і нудна, аж пакуль яго як след не разбярэ выпітае «чарніла».

Сашку нядобра і прыкра. Ён амаль і не слухае Міколаву балбатню, а думае пра сваё. І чым болей ён думае, тым горш яму становіцца. Ён прыпамінае, як толькі што круціўся перад Люцяю, баючыся, каб не здагадалася, чаго прыходзіў, як потым стараўся вывернуцца перад мужыкамі, маніў, што не было яе ў хаце... І чаму ў яго ўсё так выходзіць, чаму?

Як бы й не ён гэта, не Сашка, а нехта другі, такі нерашучы і баязлівы сядзіць цяпер тут і слухае п'яную Брухаву балбатню. А Сашка, сапраўдны Сашка, назірае за гэтым бледным, даўгавухім, ссутуленым хлапчанём і ненавідзіць яго. Ненавідзіць гэту паслухмянасць, пакорлівасць і нерашучасць у ім. Ну, чаму так, чаму? Ён жа зусім не такі, Сашка. З сабою, напрыклад. Або з мацераю. Там ён дужы і смелы. І даўно ўсё робіць у хаце, даўно і ва ўсім ёй памагае. І параду талковую дасць, зусім як дарослы, і разважыць усё, разбярэцца, што да чаго. Маці так і гаворыць усім: «Мой гаспадар сказаў, мой гаспадар зрабіў». А тут перад гэтымі «чарнільшчыкамі» ці перад тым жа брыгадзірам, пра старшыню ўжо й казаць няма чаго, гэты «гаспадар» ну чыста заяц. Як хто падмяняе яго. Ну, чаго, чаго, каб сказаў, яму баяцца таго ж Міколы Бруха? Падумаеш...

Сашка падымае вочы і натыкаецца на п'янавата-нахабны, насцярожаны Міколаў позірк.

— А ты не слухаеш мяне, Заяц. Не слухаеш,— Мікола хітае галавою, пакрыўджана лыпае вачыма.— А я вот кажу, абрыдла ўсё. Усё абрыдла. І гэты во лапатун смярдзючы, і гэта цімотка, і гарачыня гэта. Сам сабе абрыд, ці паверыш, Заяц? Абрыд. Прасмерг мазутаю — да смерці не адмыюся. А чалавек не стальны, каб ты ведаў. Не стальны. Яны во, стальныя,— матлянуў галавою на трактары,— і то не вытрымліваюць. Ведаеш, колькі я іх за дваццаць гадоў змяніў? Не ведаеш. Яны мяняюцца, а я што? А ты кажаш, п'яніцы...

Мікола змоўк, выцер з чырвонага, разваранага твару буйны пот, зноў заплюсчаў вачыма.

Прысунуўся бліжэй да Сашкі, як самую вялікую таямніцу, зашаптаў на вуха:

— А ты ўцякай, уцякай, калі хочаш быць чалавекам. Уцякай у горад, чуеш? Што тут табе, прападзеш. Маткі не слухай. Яна ў цябе цёмная, як піўная бутэлька. Сама век у гнаі прасядзела і цябе трымае. Не слухай.

— Ніхто мяне не трымае.— Сашка адхіліў голаў, адвярнуўся.

— Не трымае. Можа, і не трымае, але й парады ніхто не дасць. Сам сабе гаспадар. А ты малады йшчэ, не панімаеш... Гэта цяпер ты не п'еш, а потым не агледзішся — зацягне.

— Не зацягне.

— Не зацягне.— Мікола зноў перасміхнуў Сашку.— Але ж упарты, што ўдод... А Тоня мая... На чорта ты ёй такі, шмаравоз? Яна, брат, кончыць вучылішча і будзе сабе ў белым халаціку за прылаўкам стаяць. Гарадскога знойдзе. А ты хлопец, не скажу, харошы, не п'еш. Пайшоў бы ў горад, пажаніліся б, я б вам машыну купіў...

Бачачы, што Сашка аніяк не рэагуе на яго машыну, сядзіць усё гэтак жа ўнурыўшыся, маўчыць, Міко-

ла ўчапіўся ў выліналую Сашкаву кашулю, прыцягнуў хлопца да сябе, часта задыхаў у твар:

— Ну, чаго маўчыш? У цябе ж там шуры-муры з маёю дачкою. Усе ж кажуць.

Гарачыня ад вушэй шуганула Сашку ў голаў. Ён рэзка крутануў плячом, скінуў цяжкую Міколаву руку, падхапіўся на ногі:

— Ладна, хопіць...

— Ну, ну, не злуй. Дзела маладое, сам панімаю.— Мікола пацягнуўся да яго рукою, не змог падняцца, знізу стараўся зазірнуць у вочы.

— Сядзь, Заяц, чуеш? Пагаворым. Каму кажу...

Але Сашка яго болей не слухае. Паварочваецца, глыбока засоўвае рукі ў кішэні і, неяк смешна разгойдваючыся ў баках, пускаючы шырокі, надта для яго шырокі, крок, ідзе да свайго трактара.

* * *

Чаму яны белыя, брады? Белыя-белыя. Сашка рукамі расхінае густы волкі туман і ідзе, ідзе праз яго, чапляючы нагамі за высокія купіны, адчуваючы, як усяго ахутвае расянае, дрогкае сяйво летняга ранку.

Сашку трэба на той бераг, у тую цяністую калінавую лашчыну. Там ходзяць рыжыя коні: ён чуе іх ціхае, самотнае ржанне. Чаму яно такое самотнае? І як яму перайсці праз гэту глыбокую раку, як знайсці брод? Дзе яны, тыя брады, белыя-белыя?

Стройная дзяўчына ў празрыстым, як тумановы ранак, халаціку, высока падымаючы падол, пераходзіць на той бераг. Цёмная доўгая каса важка ляжыць у яе на спіне.

Вось-вось і схаваецца, знікне яна з Сашкавых вачэй. І як тады знайсці яе, як знайсці той брод, па якім прайшла яна?

— То-оня! То-оня!

Сашка не чуе свайго голасу. Але дзяўчына спыняецца, паварочвае галаву. На Сашку глядзяць чорныя, гарачыя вочы, здзіўлена прыпаднімаюцца тонкія бровы.

Люцяʼ? Сашка не верыць сваім вачам. Як зачараваны ступае крок, другі да яе. Але глыбокая-глыбокая рака падзяляе іх. І няма таго броду, па якім перайшла яна на той бераг.

Сашка кідаецца ў адзін бок, у другі, разгублена азіраецца.

Дзяўчына нечакана ўсміхаецца яму Тонінаю ўсмешкаю, развітальна махае рукою.

— То-оня!

...Абудзіліся, шчабечуць у вільчыку Сашкавай хаты ластаўкі...

Канвалії

Помню тую вясну. Першую гарадскую вясну ў сваім жыцці. Неспадзявана абрушылася яна на горад яркім і шчодрым сонцам, дружнымі капяжамі, нязнанай датуль ажыўленасцю гарадскіх вуліц, вясёлым звонам трамваяў, што раптам неяк шпарчэй і ахвотней забегалі па сваіх гладкіх, бліскучых рэйках.

Помню, як тое ажыўленне і ўзбуджанасць перадалі-ся і мне, і хацелася бясконца блукаць па вуліцах, назіраць, як хутка, на вачах, мяняецца ўсё. Здаецца, толькі-толькі цурчэлі ўзбоч тратуараў гаманлівыя раўчукі, а ўжо насох, пашарэў і курыць пылам асфальт, і як збавення чакае горад першага вясновага дожджыку. А на рагу амаль кожнага квартала вясковыя бабулі ў плюшаўках трымаюць цэлыя кошыкі павязаных у пучкі разам з яловымі лапкамі пралесак. І так пахне вакол набрынялаю драўнінаю, адталаю зямлёю, і так хмеліць галаў маладое трывожнае чаканне. І ты не знаходзіш сабе месца, апантана кружыш і кружыш па тлумных вуліцах вясновага горада.

Помню тую вясну. Помню, як пацягнула мяне тады раптам дахаты. Гэтак цягне, напэўна, з першым цяплом у родныя мясціны пералётных птушак. І не могучы больш трываць, сярэдначы, я бегла пустымі гулкімі вуліцамі на вакзал і паспела якраз на свой начны цягнік, а нараніцы выйшла з вагона на маленькай лясной станцыі.

Было яшчэ цёмна. Свяціў толькі чырвонымі агеньчыкамі, аддаляючыся, цягнік, і недзе там, куды трэба было ісці, прыветна мільгаў жывы светлячок семафора.

А мне нечакана ўспомнілася сіняя бездань начнога неба. І наш самалёт на нейкай сваёй максімальнай вышыні. І нідзе нічога за круглым пукатым ілюмінатарам. Халодная маўклівая пустыня. І вострае адчуванне свае адзіноты. Як быццам выкінулі цябе ў гэты бязмежны акіян і ты блудзіш, не ведаючы, як і куды выйсці. Холад і адзінота. І раптам недзе далёка, у недасяжнай глыбіні гэтага акіяна, нясмела праклюнулася зорка. Адна. Маленькая. На імгненне здалася яна бяссонным агеньчыкам мамінага акна. І ажыла, пацяплела вакол маўклівая пустыня, папусціла свае жалезныя абручы адзінота. І сагрэла душу надзея, што не дасць заблудзіць і прапасці ў гэтым сінім бязмежжы сусвету жывы мігатлівы агеньчык. Я падумала тады, што дайшла б да яго, дапаўзла б, каб прыйшлося, нават за тысячы міль...

А цяпер ён быў недзе зусім блізка, побач — варта было толькі прабегчы нейкага паўкіламетра. І тут жа адчуўшы гэта, я радасна рванулася яму насустрач...

А потым быў дзень. І вясновы вецер гнаў па небе цяжкія, набрынялыя першым дажджом хмары, і хваляваліся пад гэтым ветрам лясы, і недзе ў іх глыбокіх нетрах прабівалі шэрае леташняе лісце сінія вочы пралесак. А ў маленькім гародчыку над лужком выходзілі з зямлі чырванавата-зялёныя, тугія трубачкі ландышаў. Штовесну, па сваёй даўняй завядзёнцы, я хадзіла да таго гародчыка, каб упэўніцца, што ландышы не прапалі, жывуць і прыйдзе час — абавязкова распусцяцца.

У гэты свой прыезд, абуўшы высокія гумовыя боты, я таксама папраставала да былога суседскага селішча. Усе тыя сцежкі, што некалі таптаі босыя дзіцячыя ногі, былі здратаваны і ссунуты бульдозерам у вялізныя бурты яшчэ мінулаю вясною. І цяпер, раз-пораз трапляючы ў нечакана глыбокія выбоіны і апякаючыся ледзяною вадою, што набіралася ў халявы гумовікаў, я

адчувала, як холад той працінае ўсё нутро. Але ішла, бо ведала: недзе ў маленькім, пакінутым людзьмі гародчыку ўпарта прабіваюцца з зямлі ландышы.

І не памылілася. За раскіданым, напалову патрушчаным плотам, у заваленым смеццем кветніку па-ранейшаму аставаўся лапік жывой зямлі, і на ім, як і даўней, ажывалі пасля зімы ландышы. Але цяпер гэта чамусьці не кранала мяне. Такая глухата і спустошанасць панавалі навокал, што праз іх друз не мог прабіцца на свет той чаканы храсточак радасці. Замест яго ўзнікла ў душы жаданне тут жа павярнуцца і пабегчы назад. Я адчула, як раптам неадольна пацягнула мяне да людзей, да жыцця. Успомніліся шумныя гарадскія вуліцы, сябры, інстытут, і я зразумела, што мне трэба ехаць. Спяшаючы і зноў набіраючы ў халявы сцюдзёную ваду, бегла я назад, дахаты, а надвечар стала хапатліва збірацца ў дарогу.

Тады яшчэ я не здагадвалася, што цяпер так будзе кожны раз. Што душа мая, сама таго не жадаючы, як бы распалавінілася, раздвоілася, і мне суджана гэтак ірвацца заўсёды. І што менавіта г э т а будзе найболей і найгорай мяне мучыць усё жыццё. Дый ці толькі мяне...

* * *

Тою вясною неяк асабліва рана зацвілі ландышы. Яшчэ не паспела як след развінуцца клейкая маладая лістота на дрэвах, яшчэ ў гарадскіх скверах і парках не ўкрыла зямлю трава, а ўжо тыя ж бабулі, што не так даўно прадавалі пралескі, стаялі, трымаючы ў руках далікатныя букецікі ландышаў.

Якраз тою парою адкрылася ў Палацы мастацтваў выстава. Добра памятаю гэта, бо ўпершыню зайшла туды з духмяным белым букецікам. Я часта туліла яго да твару, адчуваючы незвычайна тонкі водар гэтых мілых кветак. Побач са мною быў Віктар. Ён глядзеў

на мяне радаснымі вачыма, раз-пораз нахіляўся і шэптам пытаў: «Падабаецца?»

Мне ў той дзень падабалася ўсё. І белыя, цнатліва-чыстыя кветкі, і вясновы сонечны дзень, і вясёлыя, узбуджаныя твары людзей. Я перажывала высокае, ні з чым не параўнанае ўзрушэнне. Здаецца, я ўпершыню была так моцна захоплена, зачаравана мастацтвам. То была мая першая сустрэча з сапраўдным майстрам. Так, так, першая. Не важна, што перад тым былі ўжо ў жыцці Эрмітаж і Траццякоўка, не важна, што ■ Віктарам мы штомесяц хадзілі ў наш Мастацкі музей «шукаць» натхнення. Усё гэта было не тое, усё гэта было не так. Тут найперш была роднасць, тут найперш было яднанне твае душы з тым светам, у які цябе нязмушана, але настойліва вёў мастак. Гэта быў твой свет. І было такое дзіўнае адчуванне, што ты калісьці ўжо жыў у гэтым свеце, бачыў і любіў гэтых людзей, але здарылася нейкая непапраўная бяда з тваёю душою, з тваёю памяццю, і ты надоўга забыў гэта ўсё, не думаў, не ўспамінаў яго, жыў з дня ў дзень дробным і мітуслівым жыццём, думаючы, што так і трэба, што гэта і ёсць тое тваё прызначэнне, дзеля якога ты і народжаны на белы свет.

Вялікі, нязнаны дасюль сорам падымаўся ў маёй душы і спапяляў усю істоту. Я пераходзіла ад карціны да карціны, як усё роўна ступала па распаленых камянях мінулага. Яно паўставала перад вачыма — шарачкова-беднае, гаротна-цяжкае, гераічна-мужнае. І тваё, тваё, тваё. Усё да самай кропелькі. Мастак міласціва вяртаў яго тваёй душы, як неразумна і балюча страчаны скарб, без якога і душа твая не душа, без якога і ты не чалавек.

Я памятаю, як выйшлі мы тады з Палаца, як доўга маўчалі. Быў ужо вечар. Ціхі і цёплы. Улеглася дзённая вулічная мітусня, горад адпачываў. Мы ішлі, не думаючы, куды і чаго. Проста ішлі і маўчалі.

Загаварыў першы Віктар. І словы яго ўпалі нечакана, як халодныя кроплі дажджу. Мне захацелася схавацца ад іх, як-небудзь абараніцца. Я ўмольна ўзняла вочы:

— Давай памаўчым, ладна?

Але ён не зразумеў мяне.

— Чаму памаўчым... Ведаеш, ён, канешне, майстра. Нічога не скажаш. Тэхніка, вытанчанасць, усё такое. Але... Усё гэта так патрыярхальна, несучасна, так далёка ад нас. От, каб бабулю маю сюды — ёй бы якраз. А нам, нам ад мастацтва трэба іншае. Ну што хоць бы гэтыя партрэты сялян. Ну тыпы, ну й што. Мне трэба сённяшні чалавек, я хачу яго бачыць.

«А што значыць сённяшні?» — парывалася запытаць я, але не запытала, бо заранё ведала, што ён адкажа.

Нечакана захацелася астацца адной, і я паспяшала развітацца. Ён пакрыўджана кіўнуў галавою, не азіраючыся пайшоў па вуліцы. А я стаяла, чуючы, як горка пахнуць у маіх руках, прывялыя без вады, ландышы...

З таго часу я штодня, як толькіканчаліся ў інстытуце заняткі, адна ішла ў Палац мастацтваў...

* * *

Вы, напэўна, памятаеце тую выставу. Ну, канешне ж, яе нельга не помніць. Памятаеце, там адну сцяну, цэлую доўгую сцяну, займалі партрэты беларускіх сялян. Амаль пад кожным стаяла імя або прозвішча. Як пад фотаздымкам...

Я прыходзіла і сядала насупраць. І глядзела. І заўсёды лавіла сябе на тым, што гэтак я гляджу фотаздымкі сваіх продкаў, калі прыязджаю дахаты. Пажоўклыя ад часу, тыя здымкі збераглі родныя і незнаёмыя абліччы...

Так, гэта ўжо былі не проста партрэты, напісаныя таленавітым мастаком. Я ўглядвалася ў твары сваіх продкаў. У кожную іх рысачку. Я пазнавала іх. Мудрых, стомленых жыццём і працаю, але ўчэпістых, цягавітых, з неспатольнаю прагаю жыцця ў спакойных славянскіх вачах.

Я забывала ў такія хвіліны пра ўсё на свеце. Пра свой інстытут, пра тое, што заўтра ў нас практычныя заняткі і да іх трэба яшчэ рыхтавацца, пра Віктара, які заўсёды цярпліва чакаў мяне, прысланіўшыся да падаконніка, насупроць нашага пакоя.

Я тады забывала пра ўсё. Нічога не існавала ў свеце, акрамя выставы. Я сядзела там, пакуль не падыходзіла нарэшце ветлівая хударлявая жанчынка і не папярэджвала, што да закрыцця астаецца дзесяць хвілін. Яна так спагадліва глядзела на мяне, як глядзіць здаровы чалавек на хворага. А я і праўда як захварэла. Маё ўяўленне малявала адно і тое ж. То быў вобраз пажылой кабеты, сялянкі. Ага, ага. Менавіта пажылой. Не крывіцеся, шаноўныя...

Гэта карціна, дакладней партрэт, стаў тады мараю майго жыцця. Мне трэба было браць фарбы і маляваць. Я бачыла кожную рысачку «сваей» жанчыны, кожны няўлоўны рух яе твару. Яна мне снілася, не давала спакою. Я яе ведала. Нікога і нічога я так добра не ведала і не адчувала, як яе. Яна ўвасобіла ўсё лепшае, што было ў маёй і яшчэ ў нечай бабулі, што жыло ў нашых мацярках, і што гены перадалі і нам таксама, і што мы насілі ў сабе, хаваючы ад саміх сябе, баючыся як-небудзь праявіць гэта, не разумеючы, што на гэтым і трымаецца яшчэ свет і ўсё лепшае, што ёсць у свеце. Мы, вясковыя, наіўныя дзяўчаткі, няўдалыя гараджанкі, больш за ўсё баяліся не выдаць сваю вясковасць, сваю чысціню, сваю замілаванасць усім родным, стараліся, як маглі, быць сучаснымі. Не здагадваючыся

нават, што самае сучаснае ў нас — ад нашых бабуль і мацярок, бо яно ў нас самае лепшае.

Мне тады захацелася сказаць пра гэта. Захацелася сказаць усім такім, як сама, тым, хто пачаў забываць, хто ён і адкуль.

«Мая» жанчына, «мая» бабуля жыла ўжо не толькі ў маёй душы. Яна глядзела на мяне з гэтай сцяны, займала сваё месца сярод партрэтаў. Якраз побач з партрэтам «Старога з люлькаю». Яна глядзела на мяне. Круглатварая. Прыкметна выдаваліся сківіцы. Гэта ад таго, што ўжо немаладая, хударлявая. Твар пад тонкаю вуалькаю зморшчын. Злёгку прымружаныя цёмныя вочы. Пажылыя людзі ўсе так глядзяць — з прымружам. Высокі лоб і гладка, на прамы прабор зачасаныя валасы.

Спакойныя, спрацаваныя рукі далікатна сціскаюць букецік белых маёвых кветак. Ландышаў. На маленькіх пяшчотных званочках зіхцяць кроплі буйной расы. Раніца...

Што яшчэ я магла, павінна была расказаць пра яе ў сваёй карціне. О, колькі яшчэ ўсяго. Паслухайце. Я паспрабую зрабіць некалькі эскізаў да яе партрэта.

Эскіз першы. Канваліі

Гародчык быў з ценявога боку ад хаты. Штовесну, у маі, зацвіталі там ландышы. Баба Валінка называла іх — канваліі.

Маленькі бела-зялёны астравочак яснеў у самым кутку гародчыка каля старога амшэлага плота. Ландышы пераходзілі за плот, вытыркаліся скрозь з маладой травы і нават перабіраліся на другі бок вузкай пакручастай сцежкі. Але зацвіталі гэтыя «перабежчыкі» чамусьці заўсёды пазней, красавалі нядоўга і былі нейкія дробныя і кволыя. Як быццам дзічэлі і выраджаліся, пакінуўшы ўлюбёнае месца сваіх продкаў.

Гародчык быў невялікі і, мабыць, зусім непрыдатны ні для якіх іншых раслін. Бо панаваў там вечны цень і ад блізкага лужка было надта сыра.

У процілеглым кутку яго, пад чэзлым старым бэзам, стаяў пусты вулей з адбітым лятком, пасярэдзіне расла адна-адзіная яблыня-папяроўка, і на плот апіраліся сухімі лёгкімі сукамі даўно незраджайныя слівы.

Ніхто, акрамя бабы Валінкі, не заходзіў туды. Нават мы, малыя, найчасцей заглядвалі праз шчыліны паміж ляскамі і забягалі хіба толькі, калі гулялі ў хованкі.

Дзіўны быў той гародчык. Нейкая свая, не разгаданая нікім таямніца жыла за сівымі амшэлымі ляскамі. Была яна ва ўсім: у тым халадку і паўзмроку, што заўсёды панавалі там, у апусцелым вуллі пад чэзлым кустом бэзу, у тонкім водары ландышаў. І найбольш хіба ў гэтым водары.

Я й цяпер, праз многія ўжо гады, калі пачую раптам незвычайны пах мілых, цнатліва-чыстых кветак, пачынаю міжволі хваляваціца. Як бы душа мая дакранецца незнарок да нечага таемнага і светлага. І заўсёды тады бачу я бела-зялёны астравочак у самым ражку цяністага гародчыка і бабу Валінку. Яна часта заходзіла туды і нізка схілялася да кветак. Я не помню, каб яна іх ірвала, каб ставіла ў букеты. Але я помню, як выходзіла яна з гародчыка, нейкая адразу памаладзелая, усмешлівая і гаварыла заўсёды адно і тое ж: «Канвалії зацвілі». І мы ведалі, што зараз яна пойдзе рабіць нейкую сваю работу і будзе спяваць. І песня тая, журлівая і светлая, разальецца па ўсім наваколлі, і нехта, таксама робячы нешта сваё, разагнецца раптам, распростаецца і, пасвятлеўшы душою, пазнае, скажа: «Валінка спявае».

Эскіз другі. Песня

І зноў успамінаецца май. Маладая зеляніна вакол. Усё такое жаўтава-зялёнае. Вы, пэўна, заўважалі, калі распускаецца лес, здалёк ён выдае жаўтава-зялёным. А калі яшчэ зацвітуць цёплыя ласкавыя коцікі на лазовых кустах, калі высыпле на лужку маладая кволая травіца, калі выпырсне скрозь яркая лотаць і ўстане над усім гэтым шчырае веснавое сонца, то ўсё і праўда выглядае залаціста-зялёным, па-маладому вясёлым і светлым.

А ў неглыбокім лужку вада прагрэецца да самага дна, стане цёплая, што луг. Баба Валінка такою парою першы раз выпусціць з хлява каровы. Дастане з-за абраза сухі вярбовы дубчык і будзе лёгенька так пасцёбваць ім па худых баках, нешта сабе нашэптваць, прыгаворваць, выганяць змарнелую за зіму жывёлу на волю. Каровы разыдуцца па лужку, будуць скубці мяккую лугавую травіцу, а баба Валінка адхіліцца ад іх, пойдзе па выспе, і зноў тады народзіцца песня. Светлая і трапяткая, як гэты высокі вясновы дзень, як гэта зялёная маладая зямля.

Праз гады я чую яе, тую песню, і мне кожны раз здаецца, што гэта спявае сама зямля, праз гады бачу, як нястомна нагінаецца да гэтай зямлі мая старая суседка.

Помню, я неяк не вытрывала, сустрэўшыся з бабуляю, наіўна спытала: «Што гэта вы ўсё нешта як шукаеце, усё схіляецеся, усё выглядаеце нешта...» Яна не здзівілася, узняла голаў, блізка-блізка зазірнула мне ў вочы, як бы хацела ўпэўніцца, ці сур'ёзна я гэта пытаю, а як упэўнілася, то тут жа ахвотна загаварыла: «А гэта, дзеткі, як хто. Адзін чалавек усё жыццё праходзіць па зямлі галаву ўгору задраўшы, пад ногі сабе ніколі не гляне. Спытай у такога, ён табе ніколі не скажа, па якіх сцежках ходзіць, якую траву топча. Цяпер жа чалавек мала на зямлю глядзіць, яго гэты космас цягне. А мяне

ўсё зямля не адпускае. З маладосці гэтак. Мне ўсё здаецца, што кожная травінка просіць ёй пакланіцца, прыгледзецца. Здаецца, чую, як шэпча: «Глянь на мяне, разгледзь як след, а можа, прыдамся я табе на якую патрэбу». А яно ж гэтак і ёсць: што ні травінка, што ні зялінка, то ўсё сваю карысць для чалавека мае...»

Помніцца мне летні адвячорак. Ціхі і светлы. Вялікі круг поплаву, атулены нізкім алешнікам, пляскатыя цёплыя валуны, параскіданыя скрозь па поплаве, і раскоша размаітых траў кругом. У самай сіле яны, у самай квецені. Праз колькі дзён — купалле. Цішыня і ўрачыстасць. Гармонія ў свеце. І як гімн гэтай гармоніі — песня. Я заўсёды знаходзіла бабу Валінку па гэтай песні. Ішла здалёк на яе чысты і моцны голас.

Помніцца мне той адвячорак. Каровы, адчуўшы нарэшце халадок, павылазілі з алешніку і цяпер стараюцца, скубуць, скубуць травіцу. А баба Валінка ходзіць у прыбалатку, схіляецца над зямлёю, выбірае сярод гэтага разнатраўя патрэбныя зёлкі, раз-пораз раскрывае сваю шэрую палатняную торбачку.

Цяпер яна раскрыла яе перада мною і зноў блізка-блізка зазірнула ў вочы: «А во там, на ўзлеску,— ківае на высокі груд,— чабору набрала, а тут во, на балоці — бабку. Ад пярэпалаху надта добра. А то во — сардэчнік. Бачыш, ружовы — то нам, кабетам, піць, а гэты во, фіялетавы — мужчынам».— Вымае і зноў кладзе ў торбачку далікатныя фіялетавыя і ружовыя гроначкі.

«І дзевяцяранкі ўзяла,— дастае пучок яркіх жоўтых кветачак, нанізаных на зялёныя галінастыя лапкі.— Гнёздамі ўсё, гнёздамі расце. І святаяннік вунь каля камянёў, бачыш? Купіны цэлыя. Але яго пакуль не трэба чапаць. Ён толькі што зацвітае, хай развінецца як след, пакрасуе ўволю, моцы набярэ, і, як толькі адцвітаць стане, тады ўжо збіраць яго можна. У пучкі вязаць і пад стрэху, у цянёк, каб даходзіў».

Помню белы паліваны збаночак, што заўсёды стаяў

на паліцы ў хаце ў бабы Валінкі. Уся сям'я піла з таго збанка гаркавы цёмна-зялёны ўзвар, які яна штодня гатавала...

Не ведаю, як мне падступіцца да свайго трэцяга эскіза. Як назваць яго? Назаву яго проста — жыццё.

Эскіз трэці. Жыццё

«Да школы я не хадзіла. Да школы хадзілі малодшая сястра і брат. Бацька не мог усіх нас вучыць. А мне так хацелася навучыцца чытаць, так я зайздросціла сваім малодшым.

Здаецца, усё аддала б, каб кніжкі тыя, што ў іх у торбачках ляжалі, магла прачытаць. Упрасіла сястру, паддобрылася да яе, і яна мне пачала паказваць тую грамату. А я на ляту ўсё схоплівала. І навучылася. І па-польску, і па-руску, а потым ужо, сама праз сябе і па-беларуску. Найболей вершыкі люблю. Ці ведаеш ты гэтакі во: «Здароў, марозны, звонкі вечар...»

О, тыя марозныя вечары. Мы штовечар хадзілі з мамаю да бабы Валінкі. І казалі заўсёды так: «Пойдзем да Валінкі на вечаркі».

Помняцца мне тыя вечаркі. Баба Валінка, начапіўшы акуляры, у завязанай «назад» хусцінцы, мажная, спакойная сядзіць каля стала і, аддаліўшы ад сябе кнігу, чытае. Тут сабе, у хаце, гавораць хто пра што, бо зайшоў яшчэ нехта з суседзяў, тут мы, дзеці, валтузімся, а яна чытае. І ўсміхаецца сама сабе, і хмурыцца. А потым усё ж не вытрымлівае, узнімае галаў, ссоўвае ніжэй акуляры, аглядае ўсіх нас, дзяцей, і строга так кажа: «Ну, ціха, бэйбусы. Паслухайце троха». І пачынае чытаць услых. Помню, так чытала яна нам з тонкай, пажоўклай кніжачкі вершы Багдановіча, з тоўстай, у цёмным вішнёвым пераплёце з залатым цісненнем Міцкевіча, і заўсёды па памяці шчымлівае някрасаўскае: «Поздняя осень, грачи улетели». Чытала

Някрасава неяк дзіўна, вымаўляючы ўсе гэтыя «о», выдзяляючы іх сваім моцным, усхвалёваным голасам.

А пасля, калі мы ўжо падраслі — тры яе ўнучкі і я, прасіла чытаць нас.

Помню цяпло белай, добра напаленай кафляначкі, шырокую цяжкую табурэтку каля яе і гэтакую ж цяжкую, растрэсеную, зачытаную да немагчымага кнігу «Братья Гримм. Сказки». І калі хто з нас чытаў, то яна ўжо не сядзела склаўшы рукі, даставала з печы наўлечку з пер'ем або бралася прасці кудзелю.

Ціха турчэў калаўротак, а яна слухала і ўсміхалася.

Колькі святла ў маёй душы ад вашых усмешак, баба Валінка, ад вашых вершыкаў, песень і казак...

Знаю, што расказваю не бог ведае што. Знаю, што, прачытаўшы гэту маю невялічкую навелу, убачыўшы гэтыя мае эскізы, амаль кожны зможа згадаць такую сваю бабулю. Яны вечныя на гэтай зямлі, як вечны наш народ, як вечныя яго душа і слова.



Мінулаю вясною, у маі, бабе Валінцы было дзевяноста.

Я цяпер рэдка бачу яе. Іх сям'я даўно выбралася з тае маленькай хаткі на выспе. Зяць паставіў у вёсцы новы харошы дом. А на былым селішчы цесна спляліся кронамі старыя здзічэлыя яблыні, і ў маленькім гародчыку штовесну ўсё яшчэ зацвітаюць ландышы.

Даўно перайшла жыць у новую хату баба Валінка. Яна пастарэла за гэты час. І ходзіць цяпер нізка прыгнуўшыся да зямлі не толькі таму, што ўсё яшчэ нечым на ёй цікавіцца, а таму, што ўжо не можацца інакш. Але ўсё па-ранейшаму клапоціцца, усё тупае па гаспадарцы, пагадаваўшы ўнукаў, памагае гадаваць праўнукаў. І цяпер ім чытае вершы і казкі. Але ўжо не спявае. Аслабеў, амаль зусім прапаў голас...

Мінулаю вясною ёй было дзевяноста. Сабралася ўся іх вялікая сям'я. Прыехалі з горада тры яе ўнучкі з мужамі і дзецьмі. І быў накрыты багаты стол, і сядзела за тым сталом на сваім звыклым месцы баба Валінка. Ёй налівалі яшчэ добрую чарачку, і яна не адмаўлялася, паднімала яе. Паслухаўшы тост, моўчкі выпівала гарэлку. Усе вакол здзіўлена ахалі, мітусліва падсоўвалі да яе закусь, але яна не спяшала закусваць. Сядзела нейкі час нерухома, глядзела на ўсіх прасветленымі вачыма і толькі потым ужо ўсміхалася, казала: «Нічога, нічога, дзеткі, хай папячэ...»

Мінулаю вясною бабе Валінцы было дзевяноста. У той святочны дзень, нараніцы, ёй прынеслі з роднага селішча, з цяністага гародчыка, свежы букет ландышаў. Яна ўзяла яго, пяшчотна прытуліла да твару, як калісьці ціха сказала: «Канваліі зацвілі...»

* * *

Я цяпер часта ўспамінаю тую сваю першую студэнцкую вясну, вялікую выставу ў Палацы мастацтваў, Віктара, і тая мая даўняя мара ўсё больш і больш хвалюе мяне, не дае спакою.

Я так часта думаю пра вас, канваліі... Ваша святло ў маёй душы. Чысціня ваша ў сэрцы маім. Я бачу: над вамі схіляецца баба Валінка, мая старая суседка. Я ведаю, чаму так нізка яна схілялася над вамі, ведаю, чаму такая мудрая і светлая душа ў яе.

Так часта я ўспамінаю і думаю пра вас, канваліі. Думаю пра той запаветны куточак, які нараджае і стварае нас, які запальвае ў нашых сэрцах агонь вялікай любові.

Змест

Няхай шырэе далячынь. *Ян Скрыган* . . 3
Груган 7
Касцы 18
Марцэля 25
Пах мурагу 36
За ноччу раніца 46
Лёгкі хлеб 55
Мурза 61
Бярэзнік на загонах 67
Цыба 77
Блізка вясна 94
Фэлькавы яблыкі 102
Светлая рунь 111
Белыя брады 123
Канвалії 138

Лялько Х.

Л 97 **Дарога пад гару: Апавяданні/[Прадм. Я. Скрыгана].— Мн.: Маст. літ., 1985.— 151 с.— (Першая кніга празаіка).**

45 к.

У апавяданнях, якія ўвайшлі ў зборнік, Хрысціна Лялько піша пра тое, што добра ведае. Перад чытачом паўстаюць цікавыя, паўнакроўныя вобразы нашых сучаснікаў. Апавяданні вызначаюцца псіхалагізмам, добраю, каларытнаю моваю.

Л $\frac{4702120200-131}{М 302(05)-85}$ 45—85

ББК 84Бел 7

Бел 2

Первая книга прозаика

Кристина Алексеевна Лялько

ДОРОГА В ГОРУ

Рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

Рэдактар Л. К. Лявонаў. Мастак А. І. Бяляева. Мастацкі рэдактар М. Я. Шкурпіт. Тэхнічны рэдактар Г. П. Тарасевіч. Карэктар А. Т. Глушчанка.

ІВ № 2112

Здадзена ў набор 19.02.85. Падп. да друку 23.07.85. АТ 12274. Фармат 70×100$^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 6,13. Ум. фарб.-адб. 6,45. Ул.-выд. арк. 6,55. Тыраж 4200 экз. Зак. 1206. Цана 45 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

45 к.



Хрысціна Лялько нарадзілася ў 1956 годзе ў вёсцы Хадзюкі на Лідчыне. У 1979 годзе скончыла філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. Працавала ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», цяпер — рэдактар аддзела літаратуры часопіса «Беларусь». Друкавалася ў часопісах «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», «Неман», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», а таксама ў іншых рэспубліканскіх выданнях. Удзельніца VIII Усесаюзнай нарады маладых пісьменнікаў у Маскве.